Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

2 ЖНІЎНЯ 2008 г.
СУБОТА
№ 143
(26256)

Кошт 500 рублёў

ВЫДАЕЦЦА З 9 ЖНІЎНЯ 1917 Г.

Ліст у нумар

«Прозвішчы тутэйшыя...»

...Дзяцінства маё прайшло ў вёсцы. Мова паўсюль — родная, беларуская, школа — проста выдатная.

Пасля яе быў педінстытут імя Горкага, жыццё ў сталіцы, дарэчы — на вуліцы Энгельса. Гэта — цэнтр, прыезджых шмат, таму і ў мяне ўжо нехта пытае, дзе што знаходзіцца, як прайсці? А я ж пажыла ўжо ў Мінску і ведаю. Я ветліва адказваю што гэта, напрыклад, «побач, на рагу вуліц...». У адказ — смех.

Пасля інстытута працую настаўніцай рускай мовы, але ў паўсядзённасці, ну зразумела ж, гавару на беларускай. Адкуль папрокі — кшталту, «как вы можете преподавать русский, если так разговариваете!». Баранюся, кажу, што сваячка выкладае англійскую, то ёй што — на англійскай тады размаўляць?

А наогул — мы цікавыя людзі: называем сябе беларусамі, а па-беларуску гаварыць саромеемся, баімся, каб не пасмяяўся хто. Ёсць, напэўна ж, з чаго, бо мову сваю мы толкам не ведаем.

Але мне пры гэтым вось што дзіўна — акурат таксама мы не ведаем рускай, але гаворым.

Я некалі жыла на кватэры ў сваякоў і гаспадар, карэнны расіянін, досыць часта прасіў: «Ну пагавары па-свойму... Паслухаю, усё роўна, як у Купалаўскі тэатр схаджу».

Цяпер артысты таго тэатра, не раз чула, даюць інтэрв'ю па-руску. Роднай мовы ці не адна Марыя Захарэвіч трымаецца?

Цікава па радыё, па тэлебачанні слухаць іншых дзеячаў — дэпутатаў, кіраўнікоў прадпрыемстваў. Прозвішчы, лічы, спрэс у іх нашы, тутэйшыя: калі не самі, то бацькі — дакладна з глыбінкі, з вёсак, з хат... А выйшлі адтуль — і ўсё. Як адрэзала. Здаецца, па-англійску ў іх нешта спытай — па-англійску адкажуць, а вось па-свойму, па-беларуску — не.

Чаго тады чакаць ад дзяцей, ад моладзі, калі ў нашай школцы, у вёсцы, выкладаецца ўсё не па-беларуску?

Л.П. МАРГЕЛАВА,

в. Мажа, Капыльскі раён

Эканамікст

Знешні дзярждоўг за першае паўгоддзе скараціўся на 0,8 працэнта, унутраны — на 0,2 працэнта

Унутраны дзяржаўны доўг Беларусі за студзень — чэрвень 2008 года скараціўся на 0,2 працэнта і склаў на пачатак ліпеня Br6234,9 млрд, паведамілі ў Міністэрстве фінансаў.

У тым ліку запазычанасць, гарантаваная ўрадам, зменшылася на 1,2 працэнта да Br1785,6 млрд і склала 28,6 працэнта ўсяго ўнутранага доўгу. Запазычанасць цэнтральнага ўрада склала Br4449,3 млрд., павялічыўшыся за паўгоддзе на 0,2 працэнта.

Паводле даных Мінфіна, знешні дзяржаўны доўг Рэспублікі Беларусь за паўгоддзе скараціўся на 0,8 працэнта і на 1 ліпеня 2008 года быў на ўзроўні Br4915,7 млрд (каля $2,31 млрд) пры зацверджаным ліміце $6 млрд.

Пры гэтым запазычанасць, гарантаваная ўрадам, складае Br673,2 млрд, або 13,7 працэнта ўсяго знешняга доўгу. Гэты паказчык за студзень — чэрвень зменшыўся на 3,7 працэнта. Доўг цэнтральнага ўрада роўны Br4242,4 млрд, або 86,3 працэнта (прычым уся запазычанасць сфарміравана доўгатэрміновымі пазыкамі). Як адзначылі ў Мінфіне, за справаздачны перыяд ён скараціўся на 0,3 працэнта.

Агульны ўзровень запазычанасці за студзень — чэрвень зменшыўся на 0,4 працэнта і да пачатку ліпеня быў роўны Br11,15 трлн.

БЕЛТА.

Насельніцтва Беларусі ў першым паўгоддзі прадало замежнай валюты на $445,3 млн больш, чым набыло

Як паведамілі ва ўпраўленні інфармацыі Нацыянальнага банка Беларусі, гэта і іншыя пытанні былі разгледжаны на праведзеным 30 ліпеня ў г.п. Лельчыцы пашыраным пасяджэнні праўлення Нацыянальнага банка.

Так, аб'ём продажу насельніцтвам замежнай валюты на ўнутраным валютным рынку ў студзені — чэрвені 2008 года склаў $3,1 млрд. Попыт насельніцтва на валюту склаўся ў аб'ёме $2,7 млрд.

Акрамя таго, істотна знізіўся адносна аналагічнага перыяду мінулага года чысты попыт на замежную валюту з боку нерэзідэнтаў.

Абарот унутранага валютнага рынку Беларусі за студзень — чэрвень 2008 года павялічыўся адносна аналагічнага перыяду мінулага года на $11,1 млрд і склаў $34,9 млрд.

БЕЛТА.

Стаўка экспартнай пошліны на нафту з 1 жніўня павялічваецца да $495,9 за 1 тону

Стаўка экспартнай пошліны на сырую нафту ў Беларусі з 1 жніўня павялічваецца з $398,1 да $495,9 за 1 тону.

Адпаведнае рашэнне змяшчаецца ў пастанове Савета Міністраў № 1087 ад 29 ліпеня, паведамілі ў Апараце Саўміна. Памер пошліны скарэктаваны ў сувязі з аналагічным павышэннем экспартнай пошліны на нафту з 1 жніўня ў Расійскай Федэрацыі. Да ўзроўню расійскіх з 1 жніўня павялічваюцца і экспартныя пошліны на нафтапрадукты.

БЕЛТА.

Цэны на газ для юрыдычных асобаў і індывідуальных прадпрымальнікаў з 1 жніўня павялічаны на 9,3 працэнта

Цэны на прыродны газ для юрыдычных асобаў і індывідуальных прадпрымальнікаў у Беларусі з 1 жніўня павялічаны на 9,3 працэнта — з $145,18 да $158,67 за 1 тыс.куб.м без ПДВ. Адпаведнае рашэнне змяшчаецца ў пастанове Міністэрства эканомікі № 154, паведамілі карэспандэнту БЕЛТА ў прэс-службе ведамства.

Паводле слоў спецыялістаў Мінэканомікі, неабходнасць перагляду цэнаў на прыродны газ для спажыўцоў рэспублікі ўзнікла ў сувязі з павелічэннем цаны куплі прыроднага газу ў Расійскай Федэрацыі.

Навіна

Новым галоўным трэнерам хакеістаў мінскага «Дынама» стаў Джым Х'юз

У мінулым сезоне ён працаваў асістэнтам галоўнага трэнера ў клубе АХЛ «Таронта Марліз». Да гэтага, з 2001 па 2003 год, Джым Х'юз уваходзіў у трэнерскі штаб клуба НХЛ «Бостан Бруінз», а ў 2005—2006 гадах узначальваў каманду «Манчэстар Монархс», якая выступае ў АХЛ. Як ігрок новы настаўнік мінчан выступаў у розных студэнцкіх клубах, а таксама адзін сезон правёў у Швецыі.

БЕЛТА.

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

У БЕЛАРУСІ Ў ГЭТЫМ ГОДЗЕ МОЖА БЫЦЬ АТРЫМАНЫ САМЫ ВЯЛІКІ ЗА ЎСЮ ГІСТОРЫЮ ЎРАДЖАЙ ЗБОЖЖАВЫХ І ЗЕРНЕБАБОВЫХ

У Беларусі ў гэтым годзе можа быць атрыманы самы вялікі за ўсю гісторыю ўраджай збожжавых і зернебабовых, і з улікам спрыяльных умоў надвор'я яго неабходна ўбраць у максімальна сцісłыя тэрміны. Аб гэтым заявіў 1 жніўня Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка, наведваючы СВК «Бальшавік-Агра» Салігорскага раёна Мінскай вобласці.

«Сёння мы аб'ектыўна можам атрымаць каласальны ўраджай, і яго неабходна сабраць без стратаў. Мы не можам з-за нераспарадлівасці і неарганізаванасці яго не ўбраць», — падкрэсліў Прэзідэнт.

Кіраўніку дзяржавы было далажана, што на сёння ў краіне ўбрана чвэрць плошчаў збожжавых, намалочаны 2 млн тон збожжа. У рэспубліцы самая высокая ўраджайнасць у агракамбінаце «Сноў», дзе збіраюць больш за 90 ц/га.

Аляксандр Лукашэнка азнаёміўся з ходам уборкі збожжавых на Міншчыне з борта верталёта. Ён выказаў крайнюю незадаволенасць яе нізкім тэмпам. «Мяне не задавальняе ход уборачнай кампаніі ў вобласці, — сказаў Прэзідэнт. — Я не ўбачыў тут масавай уборкі. Асабліва насцярожвае сітуацыя ў Мінскім раёне, убіраюцца толькі асобныя палі».

Як праінфармавалі кіраўніка дзяржавы, у Мінскай вобласці ўбрана толькі 20 працэнтаў збожжавых, у Салігорскім раёне — 26 працэнтаў.

Аляксандр Лукашэнка лічыць недапушчальнай сітуацыю, калі адзін з паўднёвых раёнаў вобласці дэманструе нізкія тэмпы. Прэзідэнт не ўзяў пад увагу і тлумачэнні, што зернесушыльныя комплексы перапоўнены рапсам, які ў гэтым годзе даў добры ўраджай. «Трымаць на полі няўбраным спелае збожжа — гэта злачынства», — падкрэсліў кіраўнік дзяржавы.

Для аб'ектыўнай ацэнкі сітуацыі, якая склалася ў Мінскай вобласці з уборкай збожжавых, Аляксандр Лукашэнка даручыў стварыць рабочую групу з прыцягненнем вопытных спецыялістаў. «Мне патрэбна аб'ектыўная карціна», — падкрэсліў Прэзідэнт. Пры гэтым ён сказаў, што, паводле інфармацыі Камітэта дзяржкантролю, цяпер у вобласці выкарыстоўваюцца не ўсе збожжаўборачныя камбайны. На думку кіраўніка дзяржавы, трэба выкарыстаць добрыя ўмовы надвор'я і максімальна задзейнічаць усю існуючую тэхніку.

Як адзначыў Аляксандр Лукашэнка, нягледзячы на тое, што ў некаторых месцах збожжа яшчэ сыраватае і патрабуе прасушкі, яго ў любым выпадку неабходна ўбіраць як мага хутчэй. «Усё роўна гэта будзе рэнтабельна, выгадна. Галоўнае сёння — атрымаць збожжа, — сказаў кіраўнік дзяржавы. — Будзе збажына — будуць мяса і малако».

Ён таксама падкрэсліў, што ва ўмовах сусветнага харчовага крызісу «Беларусь зможа рэалізаваць мяса і малако багатым краінам, якія нам прадаюць газ, нафту».

«Мы ж такія грошы ў вёску ўкладаем. Я хачу, каб краіна нарэшце атрымала аддачу ад сельскай гаспадаркі і каб нас ніхто не папракаў, што мы «закопваем» грошы», — дадаў Прэзідэнт.

Аляксандр Лукашэнка лічыць, што пры такім ураджаі краіна можа стварыць добры фонд насення. «Кожная тысяча тон збожжа сёння даражэйшая за золата. Страцім гэту збажыну — будзем бедныя. А таму сёння маса фактараў да таго, каб убіраць спелую збажыну неадкладна», — падкрэсліў кіраўнік дзяржавы.

Ён таксама пацікавіўся развіццём сацыяльнай інфраструктуры ў вёсцы. Як праінфармавалі Прэзідэнта, за 2005—2007 гады ў Салігорскім раёне пабудавана і ўведзена ў эксплуатацыю 6 аграгарадкоў, цяпер ствараюцца яшчэ 3.

2 жніўня кіраўнік дзяржавы прадоўжыць рабочую паездку па рэгіёнах краіны. Як чакаецца, Прэзідэнт азнаёміцца з сацыяльна-эканамічным развіццём Гомельскай вобласці.

Прэс-служба Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.

Два мільёны тон збожжа новага ўраджаю сабрана ў Беларусі

паведаміў намеснік міністра сельскай гаспадаркі і харчавання Васіль Паўлоўскі.

Толькі за мінулы дзень намалочана 323,9 тыс.тон. Сярэдняя ўраджайнасць склала 35,8 ц/га, што на 5,3 ц больш, чым у мінулым годзе.

БЕЛТА.

ЯНКА — ДЭБЮТАНТКА ЖНІВА

На полі каля вёскі Комсенічы Круглянскага раёна адзін за адным спыніліся тры камбайны. І праца на 15 хвілін спыняецца: прыехаў гарачы абед. Камбайнеры, іх памочнікі і вадзіцелі садзяцца прама на кукішкі на краі поля: талерка — у руках, хлеб — на калене.

— Смачна?

— Не скардзімся! Кормяць нас добра, — весела адказваюць мужыкі.

Дзяўчына не марнуе час на размовы, а хуценька сёрбае гарохавы суп — з вялікім апетытам маладога працаўніка.

Яніне Дугінай толькі 17 гадоў, і гэта яе першае жніво. Сёлета яна закончыла 10 класаў, падала дакументы ў педагагічнае вучылішча і пайшла працаваць да бацькі-камбайнера памочніцай. На дыскатэкі Янка цяпер не ходзіць — не стае часу!

(Заканчэнне на 2-й стар.)

ДА 2010 ГОДА — 173 НОВЫЯ ПРАДПРЫЕМСТВЫ

За апошнія чатыры гады прырост унутранага валавога прадукту Беларусі склаў 9,8 працэнта. За дзесяць гадоў гэты паказчык павялічыўся ўдвая. Сёння Беларусь дэманструе ўстойлівыя тэмпы росту па ўсіх макраэканамічных паказчыках.

Пра гэта паведаміў журналістам **першы намеснік прэм'ер-міністра Рэспублікі Беларусь Уладзімір СЯМАШКА.** Ён адзначыў, што нягледзячы на складаную сітуацыю з цэнамі на нафту і газ, па выніках 6 месяцаў гэтага года прырост УВП склаў 10,3 працэнта (пры прагнозе 8-9 працэнтаў), а ў прамысловым комплексе — 13 працэнтаў. Тым не менш, адзначыў першы намеснік прэм'ер-міністра, далейшае дынамічнае развіццё і рост УВП немагчымы без нарошчвання магутнасцяў вытворчасці, без інвестыцыйнага і інавацыйнага развіцця. Для таго, каб беларуская прадукцыя была канкурэнтаздольнай і на ўнутраным, і на знешнім рынках, нам трэба асвойваць прынцыпова новыя тэхналогіі, укараняць перадавыя навуковыя распрацоўкі, падкрэсліў Уладзімір Сямашка.

Інавацыйны шлях развіцця — адна з самых важных задач сацыяльна-эканамічнага развіцця краіны. У сувязі з гэтым на 2007—2015 гады былі вызначаны наступныя прыярытэты навукова-тэхнічнага і інавацыйнага развіцця: гэта ў першую чаргу рэсурсазберагальныя і энергаэфектыўныя тэхналогіі вытворчасці канкурэнтаздольнай прадукцыі; новыя матэрыялы і новыя крыніцы энергіі; медыцына і фармацыя; інфармацыйныя і тэлекамунікацыйныя тэхналогіі; тэхналогіі вытворчасці, перапрацоўкі і захавання сельгаспрадукцыі; прамысловыя біятэхналогіі; экалогія і рацыянальнае прыродакарыстанне. Усе азначаныя прыярытэты знайшлі сваё адлюстраванне ў Дзяржаўнай праграме інавацыйнага развіцця Рэспублікі Беларусь на 2007—2010 гады. Яе стратэгічная мэта — стварэнне інавацыйнай канкурэнтаздольнай на сусветным рынку навукаёмістай рэсурсазберагальнай сацыяльна арыентаванай эканомікі Беларусі, забеспячэнне ўстойлівага развіцця і павышэння якасці жыцця народа краіны.

Першы намеснік прэм'ер-міністра агучыў асноўныя задачы, якія неабходна вырашыць для рэалізацыі Праграмы: стварэнне Нацыянальнай інавацыйнай сістэмы, фарміраванне спрыяльнага для асваення інавацыйнага, эканамічнага, прававога, сацыяльнага і культурнага асяроддзя, мадэрнізацыя матэрыяльна-тэхнічнай базы вытворчасцяў на аснове новых навукаёмістых тэхналогій, дасягненне якасна новага тэхналагічнага ўкладу ў галінах эканомікі, павышэнне ўзроўню высокатэхналагічнага экспарту, імпартазамяшчэння, экалагічнай і энергетычнай бяспекі, развіццё інтэлектуальнага патэнцыялу і творчай актыўнасці насельніцтва.

(Заканчэнне на 2-й стар.)

Аляксандр МЕНДЗЕЛЕЎ:

«ЧАЛАВЕК — НЕ МАШЫНА. Яго не адрамантуеш і не заменіш...»

Аб прычынах дарожна-транспартных здарэнняў (далей — ДТЗ) і шляхах змяншэння іх колькасці расказаў начальнік ДАІ МУС Беларусі

«Мінус 100» — менавіта столькі чалавек, як мінімум, ДАІ плануе штогод выкрэсліваць з чорнага спісу аховараў ДТЗ. У мінулым годзе, аб'яўленым годам бяспекі руху, работнікі міліцыі дасягнулі жаданага выніку — колькасць ахвяраў зменшылася на 214 чалавек. Але, на жаль, колькасць здарэнняў, падчас якіх людзі гінуць, атрымліваюць розныя траўмы і ў выніку застаюцца інвалідамі, усё роўна застаецца вялікай.

Трэба пачынаць з сябе

— Часта знаёмыя скардзяцца на нізкую культуру людзей у агульнадаступных грамадскіх месцах. Якая сітуацыя на сёння з культурай на беларускіх дарогах?

— Зараз высокія тэмпы аўтамабілізацыі. У сярэднім па краіне ў разліку на 1000 жыхароў прыходзіцца 275 адзінак транспарту. Таму можна сказаць, што дарога з кожным годам становіцца ўсё больш і больш агульнадаступнай. І нізкая культура тут не ў навінку. Аб гэтым сведчыць, у першую чаргу, тое, што на кожным пятым ДТЗ з цяжкімі наступствамі вадзіцелі не карыстаюцца рамянямі бяспекі ці моташлемамі. Не кажучы ўжо аб п'яных кіроўцах, перавышэнні хуткасці, парушэнні правілаў праезду скрыжаванняў і пешаходных пераходаў...

Акрамя таго, самі пешаходы таксама часта ігнаруюць патрабаванні Правілаў дарожнага руху (далей — ПДР). І што самае непрыемнае: у 90 працэнтах выпадкаў, як вадзіцелі, так і пешаходы парушаюць правілы свядома.

(Заканчэнне на 2-й стар.)

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 2.08.2008 г. (для б/н разлікаў)

1 долар ЗША	2 113,00
1 еўра	3 288,46
1 латвійскі лат	4 668,07
1 літоўскі літ	951,80
1 чэшская крона	136,76
1 польскі злоты	1020,97
1 расійскі рубель	90,03
1 украінская грыўня	454,90

Курсы замежных валют для безнаяўных разлікаў

Цэнтрабанк РФ

USD	23,4697
10 UAH	50,4183
1000 BYR	11,0968
EUR	36,5353

Курс у гандлёвых кампаніях (на 1.08.2008 г.)

USD ..... 2135 / 2210

Агенцтва Уладзіміра Граўцова

Падпішыцеся на часопіс «Главный Бухгалтер. ГБ» на 2008 год у рэдакцыі па самай выгаднай цане. Тэлефон рэдакцыі: 209-69-01.

ААТ «Агенцтва Уладзіміра Граўцова» УНП 100024047 Ліцэнзія Мінсувязі № 02140/0172806 выд. 03.05.2004 да 02.05.2009

ISSN 1990 - 763X

9 771990 763008 08143

Цуд мінскага неба

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Мінчанка Алена МАКСІМЕНКА разглядае вялікую фазу сонечнага зацьмення ў 13 гадзін 16 хвілін 1 жніўня 2008 года.

КУП «Минский областной центр учета недвижимости»

ПРОВОДИТ ОТКРЫТЫЙ АУКЦИОН

по продаже производственной базы (гараж площадью 266 кв.м, склад – 309 кв.м, служебное помещение — 35 кв.м, ж/б ограждение протяженностью 234 п.м.), расположенной в п. Сосновый Осиповичского района. Площадь земельного участка 0,3537 га. Начальная цена (снижена на 50 %) – 25 591 311 бел. рублей с НДС. Подробное извещение опубликовано в газете «Звязда» от 16.05.2008 г. **Аукцион состоится 15.08.2008 г. в 12.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, д. 5, ком. 321.** Заявления на участие и необходимые документы принимаются по 14.08.2008 г. до 17.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, д. 5, ком. 326.

Контактный телефон (8 017) 224 61 34.
Наш сайт в Интернете: www.rlt.by

УНП 690324015

Гаспадаркі Беларусі атрымаюць бюджэтныя пазыкі на закупку ГЗМ для ўборачнай

Гаспадаркі Беларусі атрымаюць пазыкі з дзяржаўнага мэтавага бюджэтнага фонду нацыянальнага развіцця на агульную суму Br380 млрд на фінансаванне расходаў па набыцці гаруча-змазачных матэрыялаў на перыяд уборачнай. Такое рашэнне змешчана ва ўказе № 413 ад 29 ліпеня гэтага года.

Каментуючы па просьбе карэспандэнта БЕЛТА гэты дакумент, начальнік галоўнага ўпраўлення эканомікі Мінсельгасхарча Ганна Андрыевіч адзначыла, што гэтыя сродкі дадуць магчымасць пагасіць запазычанасць за раней набытыя гаруча-змазачныя матэрыялы і значна папоўніць запасы ГЗМ на перыяд уборачнай.

ЯНКА — ДЭБЮТАНТКА ЖНІВА

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Валасы дэбютанткі жніва засыпаныя макухай, а адзенне — пылам. Але юная прыгажуня весела ўсміхаецца, і стомы ў яе вачах няма.

— Усё нармалёва, — запэўнівае яна. — Спачатку было складана, а цяпер уцягнулася. На працу прыходзім а 7-й раніцы, а завяршаем а 22-й. Як дадому вяртаюся, то засынаю імгненна.

Янка — прадстаўніца вясковай працоўнай дынастыі. Дугіны пераехалі на Кругляншчыну з Казахстана больш за дзесятак гадоў таму.

— Там напрыканцы 1990-х гадоў зусім перасталі плаціць заробак, — патлумачыў галава сям'і Віталь Мікалаевіч. — А ў Беларусі была і ёсць праца. Будзеш добра працаваць — атрымаеш грошы.

Трое Дугіных сёння працуюць на жніве ў СВК «Калгас «Комсенічы»: Віталь Мікалаевіч, яго дзеці Янціна і Ўладзімір.

21-гадовы Валодзя шмат гадоў адпрацаваў з бацькам памочнікам камбайнера, а сёлета пайшоў працаваць самастойна — узначаліў свой экіпаж.

— Брат хоча добра зарабіць на жніве, каб потым прыбаць уласны аўтамабіль, — тут жа дзеліцца звесткамі цікаўная Янка. — А я разлічваю на камп'ютар, які спатрэбіцца і для вучобы, і для гульні.

— А ці хопіць грошай? Колькі б ты хацела зарабіць?

— Наперад загадваць нельга. Як Бог дасць, — адказавае дзяўчына пад пахвальным поглядам бацькі, які заядае свой абед зярняткамі з каласка.

Віталь Мікалаевіч працягвае амаль чорную далонь з зярняткамі: «Пачастуйцеся! Гэта малады хлеб». Для камбайнера сёлетняе жніво — ужо 26-е па ліку. Ён працуе ў сельскай гаспадарцы са школьнай лавы, і яго дзеці таксама. Янка — зусім не лайдачка, ад 10 гадоў дапамагае маці на ферме.

— Яна і на жніве спраўляецца, — ганарыцца бацька дачкой. — Усе работы выконвае, і за руль камбайна ўжо села.

— Ой, гэта зусім не складана, — усміхаецца працаўніца. — Педаляў няма, трэба проста круціць руль і не хістацца ў бакі!

— Каб стаць добрым камбайнерам, трэба працаваць па-чалавечы, сумленна, і самому сабе наладзіць дысцыпліну, — вучыць Дугін-старэйшы, які чатыры гады запар станавіўся «тысячнікам» — малаціў больш за 1000 тон збожжа на жніве.

Хоць і не любіць Віталь Мікалаевіч рабіць прагнозы, але ўсё ж на тысячу разлічвае і сёлета. Аднак на ўсякі выпадак прымхлівы Дугін вырашыў не фатаграфавацца на фоне свайго камбайна — каб не суроміць тэхніку.

Камбайнеры ў адзін голас гавораць, што скардзіцца на сёлетні ўраджай не выпадае. І смяюцца: маўляў, толькі б хмары прывязаць, каб не хадзілі над круглянскай зямлёй.

Увогуле на жніве ў Комсенічах працуе шмат моладзі. Памочнікамі камбайнераў уладкаваліся з дзесятак абітурыентаў і студэнтаў. Сярод іх, дарэчы, і сын старшыні гаспадаркі. Антон паступіў у сельскагаспадарчую ВНУ, а бацька разам з калегамі лагічна палічыў, што паспытаць працу хлебароба для юнака трэба абавязкова.

— Моладзь працуе ў нас добра, — запэўнівае кіраўнік СВК «Калгас «Комсенічы» Мікалай Рэдкі. — Мы ўжо намалацілі больш за 800 тон збожжа. Ураджайнасць — 46 цэнтнераў з гектара. І чакаем яшчэ большага. Галоўнае, каб тэхніка не ламалася, а людзі адпрацоўвалі.

Сёння Круглянскі раён займае па ўраджайнасці (42,5 ц\га) другое месца ў Магілёўскай вобласці.

— У нас віды на ўраджай добрыя — хлеб стаіць прыгожы, — пракаментаваў старшыня Круглянскага райвыканкама Дзмітрый Гобараў. — На раніцу 1 жніўня мы ўбралі 7 працэнтаў. Мы цяпер робім акцэнт на плюшчанне збожжа. Настрой у хлебаробаў добры, аплата іх працы будзе належная. Нам бы вельмі хацелася, каб сённяшняе надвор'е — у меру сухое і цёплае — пратрымалася б яшчэ тыдні тры. Гэта дазволіла б нам сабраць небывалы ўраджай.

Ілона ІВАНОВА,
Круглянскі раён.

ЛАВІЛІ РЫБКУ — ЗЛАВІЛІ АРТЫКУЛ

Двух браканьераў затрымалі супрацоўнікі Брэсцкай абласной інспекцыі аховы жывёльнага і расліннага свету на адным з вадаёмаў рыбгаса «Сакалова» Жабінкаўскага раёна. Больш за 330 карпаў агульнай вагой 117 кілаграмаў паспелі здабыць гора-рыбакі, калі іх сустрэлі людзі ў форме. Урон перавысіў 19 базавых велічынь, а гэта — нагода для ўзбуджэння крымінальнай справы. Цяпер лёс браканьераў вырашыць суд, ім пагражае як вялікі штраф, так і пазбаўленне волі да двух гадоў.

Яна СВЕТАВА.

АПОШНІ ШАНЦ СТАЦЬ СТУДЭНТАМ

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Абітурыенты, якія прайшлі на дзённую бюджэтную форму навучання ў ВНУ краіны, прымаюць віншаванні і з нецярпеннем чакаюць першай студэнцкай лекцыі. А прыёмныя камісіі ў гэты час працягваюць прымаць дакументы патэнцыяльных студэнтаў, але ўжо на платную форму навучання. Апошні тэрмін падачы дакументаў — 2 жніўня да шасці гадзін вечара.

А пакуль тыя абітурыенты, якія не набралі патрэбную колькасць балаў, вырашаюць свой лёс, карэспандэнт «Звязды» паспрабавала атрымаць інфармацыю аб папярэдніх выніках уступнай кампаніі ў прыёмных камісіях буйных сталічных ВНУ.

АКАДЭМІЯ КІРАВАННЯ ПРЫ ПРЭЗІДЭНЦЕ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

На дзённую бюджэтную форму навучання прынялі 150 чалавек (у тым ліку — 17 чалавек з сельскай мясцовасці). Двое з іх — пераможцы рэспубліканскіх алімпіяд па прадмеце «Чалавек. Грамадства. Дзяржава» — залічаны на спецыяльнасць «Дзяржаўнае кіраванне і права» без уступных іспытаў. У ліку нашых студэнтаў пераможца алімпіяды па геаграфіі. Самы высокі прахадны бал для гарадскіх абітурыентаў зафіксаваны на спецыяльнасці «Дзяржаўнае кіраванне і эканоміка» — 303. Самы ж высокі прахадны бал для выпускнікоў сельскіх школ — 291 — на спецыяльнасці «Кіраванне інфармацыйнымі рэсурсамі». Сёлета прыём дакументаў і залічэнне абітурыентаў на такія спецыяльнасці, як «Дзяржаўнае кіраванне і права» і «Дзяржаўнае кіраванне і эканоміка» вялося па выніках прафесійна-псіхалагічнага субяседавання. Папярэдні аналіз паказвае, што ў Акадэмію паступілі толькі тыя абітурыенты, якія свядома выбралі гэту навучальную ўстанову. Прыходзілі і абітурыенты, якія не прайшлі па конкурсе, напрыклад, у Акадэмію міліцыі. Але шлях на такія запатрабаваныя спецыяльнасці, як «Дзяржаўнае кіраванне і права» і «Дзяржаўнае кіраванне і эканоміка» для іх быў закрыты (паколькі яны напярэдадні не планавалі паступаць у Акадэмію кіравання, то, вядома, не праходзілі субяседаванне на прадмет прафесійнай прыдатнасці)».

БЕЛАРУСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ ПЕДАГАГІЧНЫ ЎНІВЕРСІТЭТ ІМЯ МАКСІМА ТАНКА

На бюджэтную дзённую форму залічаны 905 чалавек, сярод іх 6 чэмпіёнаў свету і Еўропы. Самы высокі конкурс на спецыяльнасць «Кампʼютарная графіка» — 9,2 чалавека на месца, на другім месцы «Псіхалогія. Сацыяльная псіхалогія» — 7 чалавек на месца.

АКАДЭМІЯ МІНІСТЭРСТВА ЎНУТРАНЫХ СПРАЎ

На стацыянар паступіла 360 чалавек, сярод іх 36 дзяўчат (летась набіралі 25 працэнтаў дзяўчат ад агульнай колькасці абітурыентаў). Самы вялікі конкурс на спецыяльнасць «Правазнаўства» — сярод дзяўчат ён склаў 21 чалавек на месца. Сярэдні конкурс па Акадэміі прыкладна 4 чалавекі на месца, пры гэтым у хлопцаў ён ніжэйшы, чым у дзяўчат.

БЕЛАРУСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ МЕДЫЦЫНСКІ ЎНІВЕРСІТЭТ

«Залічана на дзённую бюджэтную форму навучання — 764 абітурыенты (з сельскай мясцовасці — 210, з горада — 554). Сярод іх ажно 24 пераможцы рэспубліканскіх алімпіяд па хіміі і біялогіі. Самы высокі прахадны бал сярод гарадскіх абітурыентаў — 300 — на стаматалагічны факультэт, сярод сельскіх абітурыентаў — 238 — на медыка-прафілактычны факультэт.

БЕЛАРУСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ ЎНІВЕРСІТЭТ КУЛЬТУРЫ І МАСТАЦТВАЎ

Самы высокі конкурс быў на спецыяльнасць «Менеджмент сацыякультурнай сферы» (факультэт культуралогіі) — 9,4 чалавека на месца. Самы высокі прахадны бал сярод сельскіх абітурыентаў назіраўся на спецыяльнасць «Бібліятэказнаўства і бібліяграфія (замежная мова)» — 249. А, напрыклад, на спецыяльнасці «Бібліятэказнаўства» сельскі прахадны бал (199), быў большы за гарадскі (196). Шмат абітурыентаў паступіла па мэтавым накіраванні. Былі і казусныя непрыемныя сітуацыі падчас прыёму дакументаў. З-за памылак у камерцыйных зборніках для паступаючых у ВНУ (прымалі дакументы да 11 ліпеня (першы паток), а там было напісана, што апошні тэрмін прыёму дакументаў — 25 ліпеня; ці на спецыяльнасць «Бібліятэказнаўства і бібліяграфія (беларуская мова і літаратура)» прымалі сертыфікат па прадмеце «Чалавек. Грамадства. Дзяржава», а там было напісана, што трэба здаваць «Гісторыю Беларусі») многія абітурыенты страцілі шанц вучыцца ў выбранай навучальнай установе».

Надзея ДРЫЛА.

БЕЛАРУС РАСІЯНІНУ — РАЎНЯ?

Пагадненне аб аднолькавых правах для жыхароў Саюзнай дзяржавы — Беларусі і Расіі — прапанаванае для ратыфікацыі Дзярждумы.

Сам дакумент быў падпісаны ў Пецярбургу ў студзені 2006-га. Беларускі бок ратыфікаваў яго ў чэрвені таго ж года, а ў Дзяржаўную думу ён паступіў літаральна днямі: законапраект унёс на ратыфікацыю Прэзідэнт Расіі Дзмітрый Мядзведзеў.

Пагадненне паміж Рэспублікай Беларусь і Расійскай Федэрацыяй аб забеспячэнні роўных правоў грамадзян дзвюх краін на свабоду перамяшчэння, выбар месца знаходжання і жыхарства на тэрыторыі дзяржаў — удзельніц Саюзнай дзяржавы ўступіць у сілу адразу ж пасля абмену ратыфікацыйнымі граматамі.

Дакумент прадугледжвае шэраг магчымасцяў для жыхароў Беларусі і Расіі. Так, напрыклад, грамадзяне адной краіны могуць свабодна ўязджаць, выязджаць, знаходзіцца, рухацца транзітам, перамяшчацца і выбіраць месца жыхарства на тэрыторыі іншай краіны. Выключэнне складаюць толькі тыя месцы, для наведвання якіх у адпаведнасці з заканадаўствам бакоў патрабуецца спецыяльны дазвол...

Зоя ВАРАНЦОВА.

ДА 2010 ГОДА — 173 НОВЫЯ ПРАДПРЫЕМСТВЫ

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Адметнай асаблівасцю Праграмы Ўладзімір Сямашка назваў тое, што яна з'яўляецца своеасаблівай ідэалогіяй развіцця інавацыйнай галіны. Паводле яго слоў, да 2010 года запланавана стварэнне 173 новых прадпрыемстваў, 274 новых вытворчасцяў з асваеннем новых высокіх тэхналогій на існуючых прадпрыемствах, комплексная мадэрнізацыя 810 дзеючых вытворчасцяў. Плануецца, што рэалізацыя Праграмы дазволіць удвая павялічыць аб'ём выпуску прамысловых тавараў, зрабіць больш канкурэнтаздольнай прадукцыю больш за тысячы айчынных прадпрыемстваў, стварыць 50 тысяч новых працоўных месцаў. У адпаведнасці з планам рэалізацыі Праграмы прадугледжана выкананне 957 праектаў, з якіх 65 працэнтаў — на аснове ўкаранення айчынных тэхналогій. Агульны аб'ём фінансавання праектаў Праграмы складае 15,8 трлн рублёў.

Паводле слоў Уладзіміра Сямашкі, інавацыйны шлях развіцця Беларусі апроч іншага скіраваны на далейшае развіццё свабодных эканамічных зонаў і паркаў высокіх тэхналогій, на ўдасканаленне нацыянальнага заканадаўства і стварэнне спрыяльнага інвестыцыйнага клімату у нашай краіне, на стварэнне новых вытворчасцяў у населеных пунктах з колькасцю насельніцтва да 50 тыс чалавек.

Беларусь настойвае на падпісанні дадатковага пагаднення да дагавора аб цэнаўтварэнні па газе ў сувязі з істотнай зменай акалічнасцяў, заявіў Уладзімір Сямашка.

«Пры падпісанні дагавора 31 снежня 2006 года мы абапіраліся на расійскі прагноз змены кошту на нафту, які меркаваў не паніжэнне. Паколькі і ў расійскім, і ў беларускім грамадзянскіх кодэксах ёсць артыкулы аб тым, што дамова можа быць зменена або скасавана ў сувязі з істотнымі зменамі акалічнасцяў, мы прапаноўваем сесці за стол перамоў і, альбо скасаваць дагавор, што недапушчальна, альбо дапоўніць яго, каб прыйсці да цывілізаванага рашэння», — заявіў У. Сямашка.

Паводле яго слоў, «калі ў пачатку 2008 года кошт на газ для Беларусі складаў 119 долараў за тысячу кубаметраў, то цяпер мы перайшлі да кошту 127,9 долара, які захаваецца да канца года».

Інга МІНДАЛЁВА.

«ЧАЛАВЕК — НЕ МАШЫНА...»

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

— У новых ПДР рэгламентуецца абавязковая наяўнасць у пешахода пры яго з'яўленні ў зоне праезнай часткі святлоадбівальнага элемента...

— ...Гэта датычыцца таксама веласіпедыстаў і ролераў. Цяпер ДАІ займаецца перакананнем грамадзян у неабходнасці іх выкарыстання. «Флікерная кампанія» пачала набіраць абароты летась. Святлоадбівальныя элементы сталі неад'емнымі аксесуарамі гардэроба як гараджан, так і вяскоўцаў. Але, тым не менш, яшчэ вельмі шмат пешаходаў (веласіпедыстаў) грэбуюць сродкамі пасіўнай абароны на дарогах у цёмны час сутак, аб чым сведчыць чарговае ДТЗ (у ноч з 27 на 28 ліпеня на трасе М1 на тэрыторыі Мінскай вобласці быў збіты насмерць пешаход, які ішоў па дарозе без флікера). Ведаеце, кожны чалавек па-рознаму ставіцца да флікераў. Адны носяць іх, таму што баяцца штрафу. Іншыя, таму што прызвычаіліся жыць па прынцыпе «сцеражонага Бог сцеражэ». Астатнія, на жаль, пачынаюць разумець значнасць патрабаванняў міліцыянераў толькі тады, калі яго ці родных напаткае бяда.

Згадзіцеся, цяжка ўявіць сёння чалавека, які зранку не памыўся ці не пачысціў зубы. Я лічу, што наяўнасць флікера ў цёмны час сутак таксама павінна стаць нормай для кожнага. Скептыкам жа хочацца сказаць, што мэта міліцыі не караць чалавека, а гарантаваць яму бяспеку на дарозе.

Я не магу заклікаць усіх рабіць тое, у што сам не веру. Я, як і большасць супрацоўнікаў міліцыі, з'яўляюся і вадзіцелем, і пешаходам. Таму, калі саджуся за руль, першае, што раблю — прышпільваюся, флікер таксама заўсёды са мной (паказвае партфель).

ШТО ЗА ВАДЗІЦЕЛЬ БЕЗ ІМГНЕННАЙ РЭАКЦЫІ?

— Як вядома, сёлета падняўся кошт навучання ў аўташколах. Ці можна сказаць, што гэта паўплывала на змяншэнне аварыйных сітуацый на дарогах?

— Рабіць нейкія вынікі яшчэ рана. Магу сцвярджаць толькі тое, што пакуль што ўзровень прафесійнай падрыхтоўкі вадзіцеляў не такі высокі, як хацелася б. Мае словы пацвярджае статыстыка за мінулы год: большая частка ўсіх зарэгістраваных аварый здзейснена па віне вадзіцеляў са стажам да аднаго года (326 здарэнняў) і год (415 здарэнняў).

— Як вядома, змены закранулі не толькі кашалёк кожнага патэнцыяльнага вадзіцеля...

— Так, сапраўды, з 1 ліпеня пачалі дзейнічаць змяненні ў праграмах па падрыхтоўцы вадзіцеляў. Так, у тэарэтычным курсе колькасць гадзін па ўстройстве і эксплуатацыі аўтамабіля зменшылася, затое павялічылася колькасць гадзін на засваенне бяспекі руху. У тэарэтычным курсе зніклі такія элементы, як «слізкае пакрыццё» і «буксіроўка» і павялічылася за гэты кошт колькасць гадзін на тэму «Удасканаленне навыкаў кіравання аўтамабілем у гарадскіх умовах». Я лічу, што інструктары павінны звярнуць увагу на псіхалагічную падрыхтоўку сваіх вучняў, таму што на дарозе здараецца шмат непрадказальных сітуацый, якія патрабуюць імгненнай рэакцыі вадзіцеля.

«УВАГА! КАНТРОЛЬ ДАІ З ВІДЭАФІКСАЦЫЯЙ»

— Таблічкі з такім надпісам не даюць вадзіцелям расслабляцца ў час дарожнага руху...

— Так, вялікія спадзяванні міліцыянеры ўскладаюць на шырокае ўкараненне ў практыку сучасных сістэм відэаназірання і фотафіксацыі. Напрыклад, у Мінску для назірання за дарожнай абстаноўкай выкарыстоўваецца сістэма відэаназірання з вывадам вывявы на маніторы аператыўнай дзяжурнай службы. Гэта дазваляе ў кругласутачным рэжыме кантраляваць транспартныя патокі і ў час ліквідаваць заторы, асабліва ў дні масавага выезду насельніцтва з горада. Відэаназіранне дапамагае і пры разборы ДТЗ. Цяпер актыўна ўкараняюцца прыборы фотавідэафіксацыі, якія рэгіструюць парушэнні, дапушчаныя вадзіцелямі. Безумоўна, абсталяванне гэта вельмі дарагое, але жыццё чалавека не вымяраецца грашыма.

ПРЫДАРОЖНЫ СЭРВІС ПРАЗ КОЖНЫЯ 30—40 КІЛАМЕТРАЎ

— Для таго, каб быць уважлівым на дарозе, вадзіцель павінен праз кожныя 8-9 гадзін руху рабіць прыпынкі для адпачынку. Але, як у Беларусі, так і у Расіі адчуваецца недахоп пунктаў прыдарожнага сэрвісу...

— Днямі мы разам з начальнікам ДАІ Расіі выступілі з ініцыятывай аб выдзяленні дадатковых сродкаў з бюджэту Саюзнай дзяржавы на забеспячэнне бяспекі дарожнага руху на дарогах Беларусі і Расіі. Частка гэтых сродкаў якраз і пойдзе на абсталяванне і ўзвядзенне новых пунктаў адпачынку для вадзіцеляў. У ідэале трэба, каб праз кожныя 30—40 кіламетраў было месца для адпачынку, дзе б кожны мог прыняць душ, перакусіць... І тут гаворка не ідзе толькі пра грузавыя машыны. Калі прыдарожны сэрвіс будзе дастойным, то і аўтатурысты з вялікай ахвотай будуць ім карыстацца.

ШВЕЦКІЯ ТЭХНАЛОГІІ НА БЕЛАРУСКІХ АЎТАМАГІСТРАЛЯХ

— Ні для каго не сакрэт, што стан дарог у такіх краінах, як Швецыя ці Нарвегія, напрыклад, знаходзіцца на высокім узроўні. Ці пераймаеце вы што-небудзь з вопыту дарожнікаў гэтых краін?

— Былі ў камандзіроўцы ў Швецыі. Якраз адтуль і перанялі тросавую агароджу небяспечных участкаў (на аўтамабільных дарогах М 1/Е30 Брэст—Мінск—мяжа Расійскай Федэрацыі і М-6 Мінск — Гродна на раздзяляльнай паласе было ўсталявана больш за 6 кіламетраў такой агароджы), што ўжо дало станоўчыя вынікі. За мінулы год зафіксавана 17 здарэнняў, у выніку якіх тросавая агароджа выратавала аўтамабілі ад лабавых сутыкненняў (агароджа служыць механічнай перашкодай супраць з'езду аўтамабіляў з дарогі і адначасова арыенцірам для вадзіцеляў аб павышанай небяспецы. Найбольш дзейсны эфект ад бар'ерных агароджаў маецца ў выпадку іх устаноўкі на раздзяляльнай паласе: так яны папярэджваюць з'яўленне лабавых сутыкненняў, якія адносяцца да катэгорыі ДТЗ з найбольш цяжкімі наступствамі).

У Беларусі традыцыйна прымяняецца металічная бар'ерная агароджа. Яна практычна на 100 працэнтаў выключае магчымасць выезду транспартнага сродку на паласу сустрэчнага руху, аднак калі машына наяжджае на яго, часта фіксуюцца выпадкі сур'ёзных пашкоджанняў аўтамабіляў, траўмы іх вадзіцеляў і пасажыраў. Акрамя таго, даволі дарагой з'яўляецца працэдура аднаўлення металічнай бар'ернай агароджы пасля ДТЗ.

У тросавай агароджы шмат перавараг. Пасля сутыкнення з ёй аўтамабіль застаецца практычна цэлым (справа ў тым, што тросавая агароджа раўнамерна паглынае ўдар і значна змякчае яго). Менш церпіць пры гэтым і сама агароджа: пашкоджваюцца толькі стойкі, замена якіх не патрабуе шмат часу і намаганняў.

— І што, гэта тросавая агароджа можа спыніць нават грузавы аўтамабіль?

— Не, яго ніякая агароджа не спыніць. Ды і габарытныя грузы перавозяць, як правіла, прафесійныя вадзіцелі, таму агароджы разлічаны, у першую чаргу на індывідуальных уладальнікаў легкавых аўтамабіляў. І зноў-такі, каб не быць галаслоўным, прывяду статыстыку: калі 75 працэнтаў ДТЗ здзейснены па віне вадзіцеляў, то ў 80 працэнтах гэтых здарэнняў вінаватыя менавіта індывідуальныя ўладальнікі аўтамабіляў.

ЁСЦЬ КАНТАКТ

— А ад саміх вадзіцеляў ці паступаюць якія-небудзь прапановы, накіраваныя на памяншэнне ДТЗ?

— Не толькі паступаюць, але і рэалізуюцца на практыцы. Напрыклад, аўтааматар з Барысава падказаў, як знізіць аварыйнасць у цёмны час сутак на пешаходных пераходах. Па яго прапанове на пераходзе па маршруце Мінск—Паперня паставілі святлоадбівальныя экраны на абочыне дарогі. Прынцып іх дзеяння заключаецца ў тым, што як толькі святло ад фараў транспартнага сродку трапляе на экраны, то пешаход, які пачынае падыходзіць да перахода, ужо бачны для вадзіцеля здалёк.

Але, ведаеце, прапановы, як і людзі, бываюць розныя. Маюцца нават такія абсурдныя прапановы, якія поўнасцю разыходзяцца з заканадаўствам: «давайце прышпільвацца рамянямі бяспекі па жаданні. Кожны ж сам адказвае за сваё жыццё» ці «добра было скасаваць усе абмежаванні ў хуткасці. Я, напрыклад, хачу ездзіць з хуткасцю 180 км/г». Дазволіць гэта сваволства раўнацэнна таму, што параіць курыць над вядром з бензінам... Мы не можам дазволіць тое, што мае наступствам бяду.

Надзея ДРЫЛА.

Белавежская пушча рыхтуецца да святкавання 600-годдзя

У наступным годзе старэйшы Нацыянальны парк Беларусі, «Белавежская пушча», адзначыць 600-годдзе. Падрыхтоўка да святкавання ідзе ў адпаведнасці з планам мерапрыемстваў, які зацверджаны Саветам Міністраў Рэспублікі Беларусь, на яго рэалізацыю плануецца асвоіць больш як 60 мільярдаў беларускіх рублёў.

Перш за ўсё, змяненні закрануць інфраструктуру і аб'екты турызму. Так, у бліжэйшы час з'явіцца новы адміністрацыйна-экалагічны цэнтр з музеем прыроды. Як расказалі ў РУП «Галоўнае ўпраўленне капітальнага будаўніцтва» Кіраўніцтва справамі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, распрацоўка праекта практычна завершана, а будаўніцтва пачнецца ў верасні. Акрамя гэтага, стары музей пераабсталююць пад рэстаран, рэканструююць гасцініцу, добраўпарадкуюць тэрыторыю рэзідэнцыі Дзеда Мароза, дзе ўзвядуць шэраг новых аб'ектаў, для турыстаў распрацуюць і наладзяць чатыры новыя экалагічныя маршруты, узвядуць новую аглядальную вышку і адрамантуюць дэманстрацыйныя вальеры.

Прывядуць у належны выгляд і дарогі, якія вядуць да Нацыянальнага парку. Як паведаміў генеральны дырэктар РУП «БрэстАўтадор» Міхаіл Непачаловіч, практычна закончаны капітальны рамонт аўтамабільнай дарогі Р-83 «Брэст — Камянец — Нацыянальны парк «Белавежская пушча». У верасні пачнецца рэканструкцыя моста цераз раку Лясная.

У рамках святкавання 600-годдзя ў «Белавежскай пушчы» пройдзе цыкл міжнародных канферэнцый з удзелам прадстаўнікоў ЮНЕСКА, будзе зняты навукова-папулярны фільм, выдадзены маляўнічыя альбомы і буклеты, выпушчана памятная манета.

Сектар па сувязях з грамадскасцю Беларускага рэкламна-інфармацыйнага агенцтва Кіраўніцтва справамі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.

РАЗМЕРКАВАННЕ ДТЗ І ПАЦЯРПЕЛЫХ ПА ВІНЕ ВАДЗІЦЕЛЯЎ ТРАНСПАРТНЫХ СРОДКАЎ РОЗНЫХ КОЛЕРАЎ КУЗАВА (АНАЛІЗ ЗА 2007):

Колькасць здарэнняў	*Колеры кузава*
994	сіні
722	іншыя адценні сіняга
870	чырвоны
830	белы
682	адценні шэрага
607	зялёны
374	чорны
147	жоўты
37	аранжавы

Новы віток у адносінах з ААН

Цяперашні прадстаўнік гэтай міжнароднай арганізацыі поўны спадзяванняў на тое, што супрацоўніцтва з Беларуссю будзе трывалым і плённым

У Беларусі — новы прадстаўнік ААН/ПРААН (Праграмы развіцця Арганізацыі Аб'яднаных Нацый). Ім стаў галандзец Антоніус Брук. Ён, дарэчы, прызнаўся журналістам, што знайшоў на нашай радзіме шмат падабенстваў са сваёй краінай, таму ад Беларусі ў яго самыя цёплыя ўражанні. Спадар Брук у Беларусі ўжо каля месяца, а днямі ён афіцыйна заступіў на пасаду, уручыўшы даверчыя граматы прэм'ер-міністру краіны Сяргею Сідоркаму. Антоніус Брук таксама будзе прадстаўляць у нашай краіне і Фонд ААН у галіне народанасельніцтва.

— Падчас нашай сустрэчы са спадаром прэм'ер-міністрам мы прыйшлі да агульнага разумення таго, што супрацоўніцтва Беларусі і ААН мае вялікі патэнцыял, які неабходна поўнасцю выкарыстоўваць, — падкрэсліў Антоніус Брук. — І хоць у апошнія гады арганізацыі сістэмы ААН змаглі дасягнуць рэкордная па мерках Беларусі ўзроўню тэхнічнай дапамогі, якая прадастаўляецца краіне ў 2007 годзе (гэта лічба склала каля 20 млн долараў), мы прыйшлі да агульнага разумення, што гэты ўзровень варта не толькі падтрымліваць, але і павялічваць надалей.

Новы прадстаўнік ААН пры гэтым заўважыў, што прыцягваць рэсурсы ў Беларусь становіцца ўсё цяжэй. Справа ў тым, што галоўны крытэрый для аказання донарскай дапамогі — гэта паказчыкі ВУП на душу насельніцтва, узроўню адукацыі і чаканай працягласці жыцця.

— У Беларусі яны, на шчасце, досыць высокія, і працягваюць расці, — паведаміў спадар Брук.

Ён таксама выказаў спадзяванне, што агульная грантавая падтрымка Беларусі праз сістэму ААН дасягне 80—85 млн долараў за перыяд 2006 — 2010 гадоў.

У той жа час спадар Брук адзначыў, што Беларусь таксама можа дапамагаць развіццю іншых краін — дзяліцца з імі сваімі ведамі, экспертным вопытам, а магчыма, у нейкі час і рэсурсамі.

Адно з самых актуальных пытанняў — супрацоўніцтва Беларусі і ААН у сферы атамнай энергетыкі.

Намеснік міністра замежных спраў Беларусі Віктар Гайсёнак у сваю чаргу падкрэсліў:

— Калі мы будзем будаваць атамную электрастанцыю, а ў нас такі намер ужо выразна сфарміраваўся, мы павінны будзем паставіць яе пад кантроль МАГАТЭ. Гэта азначае, што будаўніцтва без супрацоўніцтва з МАГАТЭ, будзе проста немагчымым. МАГАТЭ будзе не толькі кантраляваць нашу дзейнасць у ядзернай сферы, але і аказваць — нават ужо аказвае — істотную падтрымку на падрыхтоўчых этапах будаўніцтва станцыі.

Ала МАЧАЛАВА.

Абзац

■ **Школьны інтэрнат абваліўся ў Турцыі. У выніку загінула 8 дзяцей, 26 атрымалі раненні і траўмы. Усяго ў трохпавярховым будынку знаходзілася 60 чалавек, пад абломкамі апынулася 25 з іх. Згодна з папярэднімі данымі, інцыдэнт адбыўся ноччу з-за ўзрыву газавага абсталявання.**

■ Чатыры населеныя пункты ў Шумілінскім раёне аказаліся абясточанымі па віне механізатара КФГ «Крыніца», які на камбайне збіў апору лініі электрапередач. У выніку падзення апоры адбыўся абрыў высакавольтнай электралініі. Без электразабеспячэння засталіся 36 дамоў у 4 вёсках, у якіх пражывае каля 90 чалавек. Пры гэтым ні механізатар, ні камбайн не пацярпелі. Праводзіцца правера.

■ **117 манет даваеннага перыяду папоўнілі калекцыю Музея беларускага Палесся ў Пінску. Падчас будаўніцтва будынка пракуратуры ў Пінску машыніст экскаватара расшыраў выры каталаван пад фундамент. Манеты, якія бліснулі на сонцы, заўважыў майстар СПМК, што праходзіў міма. Знойдзены скарб складаецца з польскіх манет 1923—1936 гадоў выпуску, многія з іх адчаканеныя са срэбра. Сума даволі значная. Мяркуецца, што грошы належалі аднаму з мясцовых жыхароў, так як раней тут былі жылыя дамы.**

■ У Барысаве адбыўся кур'ёзны выпадак, звязаны з магазіннымі крадзяжамі. Дзяўчына прыходзіла ў магазін без ніжняй бялізны, а выходзіла ўжо ў новым, прычым адразу ў двух бюстгальтарах. На працягу тыдня з аддзела жаночага адзення ўнівермага «Веста» знікла тавараў амаль на 5 млн рублёў. Прадаўцы прыкмецілі 19-гадовую жыхарку адной з вёсак, якая прыйшла ў магазін у той жа куртцы, якая прапала ў аддзеле некалькі дзён таму. Прадаўцы адсочвалі «пакупніцу» і на гэты раз злавілі яе з рэчыўнымі доказамі. Яна спрабавала вынесці дзве блузкі і два бюстгальтары.

■ **Супрацоўнікі Дзяржаўнай інспекцыі аховы жывёльнага і расліннага свету пры Прэзідэнце Беларусі сёлета за паўгода адабралі ў браканьераў каля 400 км сетак, 17 электравудаў, каля 7,5 тоны незаконна вылаўленай рыбы, а таксама 242 паляўнічыя стрэльбы і больш за 3,3 тоны мяса дзічыны. З парушальнікаў прыродаахоўнага заканадаўства спагнана штрафаў у памеры больш за Br1,2 млрд.**

■ Паліцыя акругі Імст (Аўстрыя) затрымала п'янага беларускага дальнабойшчыка, у якога ўтрыманне алкаголю ў крыві склала тры праміле, паведамляюць інфармагенцтвы. Паліцэйскіх насцярожыла, што адна фура выпісвала на хаду «васьмёркі». Пасля таго, як паліцэйскія спынілі грузавік, высветлілася, што ўтрыманне алкаголю ў крыві 47-гадовага грамадзяніна Беларусі складала велічыню, што супастаўная з 600 г гаролкі. Шкіраваныя паліцэйскія адабралі вадзіцельскае пасведчанне і выпісалі штраф у 1500 еўра. Згодна з аўстрыйскімі законамі, максімальная доза алкаголю, пры якой можна кіраваць аўтамабілем, складае 0,5 праміле.

■ **У Саудаўскай Аравіі арыштаваны мужчына, у якога было на дзве жонкі болей, чым дазволена. Па даных паліцыі, у мужчыны было шэсць жонак, у той час як ісламскія законы дазваляюць максімум — чатыры. Арыштаваны 56-гадовы мужчына — супрацоўнік Камісіі па заахвочванні добрых нораваў і папярэджванні намаральнасці, рэлігійнай паліцыі. Створана спецыяльная камісія па разглядзе сітуацыі.**

■ Арабскі шэйх адправіў свой аўтамабіль Lamborghini Murcielago LP640 коштам 190 тысяч фунтаў стэрлінгаў для замены масла з Катара ў Лондан. Па звестках друку, тэхабслугоўванне машыны ў лонданскай аўтамайстэрні абышлося шэйху ў 3,5 тыс. фунтаў стэрлінгаў, а транспарціроўка — у 20 тысяч. Прадстаўнікі авіякампаніі Qatar Airlines пацвердзілі, што аўтамабіль шэйха сапраўды ажыццявіў падарожжа ў 10,5 тысячы кіламетраў з Катара ў Англію і назад. Учынак шэйха выклікаў бурныя пратэсты абаронцаў навакольнага асяроддзя. Эколагі назвалі гэта прыкладам таго, як багатыя людзі забруджваюць планету сваімі грашыма. Дарэчы, назва машыны Murcielago пераводзіцца як «лятучая мыш».

■ **Да 84-гадовага жыхара вёскі Красніца Рагачоўскага раёна ўварваўся аднавясковец 1980 г.н., выламаўшы пры гэтым уваходныя дзверы. Раней судзімы за крадзеж мужчына патрабаваў у пенсіянера грошы. Стары чалавек не разгубіўся і ўзяў у рукі паляўнічую стрэльбу. Падчас барацьбы адбыўся адвольны стрэл, рабаўнік быў паранены ў нагу, пасля чаго шпіталізаваны ў бальніцу. Па факце спробы рабаўніцтва ўзбуджана крымінальная справа.**

Поўны абзац

Індыянка са штата Хімачал-Прадэш дала падставу індыйскім спецыялістам задумацца над здольнасцямі чалавечага арганізма супрацьстаяць моцнадзейным таксінам. 56-гадовая сялянка з горнай вёскі перажыла больш за 70 змяіных укусаў. Дзіўны феномен пацвярджаюць супрацоўнікі НДІ, які спецыялізуецца на вытворчасці супрацьяддзя. Упершыню жанчына звярнулася да іх паслуг у 1980 годзе, пасля гэтага кожны год яе кусалі па меншай меры дзве змяі. Такое насланнё некаторыя аднавяскоўцы жанчыны звязваюць з пракляццем, якое магло быць насланае на яе, аднак ніводзін з калдуноў, да якіх яна звярталася, не змог дапамагчы. Родныя і блізкія сялянкі стараюцца трымацца ад яе падалей, каб не быць пакусанымі гадам

Выпрабавана на сабе

НОЧЫ Ў СОЧЫ: НА РОЗНЫ ГУСТ І КАШАЛЁК

Цягнік «Мінск—Адлер» перасякае Каўказскі хрыбет праз доўгія цёмныя тунэлі і выязджае на ўзбярэжжа Чорнага мора ў раёне Туапсэ. З гэтага моманту гадзіны чатыры пасажыры не адрываючыся глядзяць у вокны: адсюль і да канчатковага прыпынку цягнік рухаецца ўздоўж берагавой лініі. І калі мора падступае так блізка, што можна разгледзець каменьчыкі на дне, то пасажыры перастаюць дыхаць. Гэта заўсёды адбываецца раніцай, калі на пляж выходзяць самыя першыя купальшчыкі, самыя разумныя, бо ў гэтыя гадзіны мора спакойнае і празрыстае, з вокнаў цягніка яно здаецца неверагодна лазурным.

Вандроўнікі назіраюць, як пляжы паступова запаўняюцца, вось ужо нацягнуты тэнты над платнымі лежакамі, адгароджаны тэхнічныя зоны для гідрацыклаў, вось група дзяцей з віскам і смехам пабегла ў ваду… Апошнія дзве гадзіны прамільгнуць непрыкметна: туалеты зачыненыя, бялізна здадзеная, чамаданы пералічаныя і выстаўленыя з рундукоў, усе пасажыры ўжо трошкі іншыя людзі, думкамі яны ў казачна-лазурных хвалях. Мужчыны падцягваюцца, жанчыны прыгажэюць, усе трошкі загадкава, быццам нешта абяцаючы, усмихаюцца, некаторыя абменьваюцца тэлефонамі і адрасамі: 30 гадзін шляху здзівілі. Нават дзеці, якіх тут, здаецца, больш, чым дарослых, забываюцца на капрызы і стому. Вось яно — мора.

Пасля Туапсэ ў вагоне з'яўляюцца першыя маклеры, якія прапануюць арэнду жылля ў Лазараўскім. Там, дарэчы, выйдзе значная частка пасажыраў. Лазараўскае — гэта ўжо Вялікі Сочы, які працягнуўся на 170 кіламетраў уздоўж мора (ад пасёлка Магры да пасёлка Адлер) і ўключае ў сябе мноства рознай велічыні населеных пунктаў. Па словах маклера, жыллё ў Лазараўскім каштуе ад 250 расійскіх рублёў за ложак-месца (прыкладна 10 у.е.). Маклер папярэджвае, каб не пагаджаліся на больш таннае, бо гэта будзе ў гарах, далёка ад мора. У сваю чаргу інтэрнэт-сайты Вялікага Сочы папярэджваюць: «Ні ў якім разе не карыстайцеся паслугамі маклераў! Яны прапануюць не тое, што трэба вам, а тое, што трэба ім, нязручнае, дарагое і вярнуць грошы будзе надзвычай цяжка, бо яны самі — не гаспадары, а пасрэднікі».

Лічыцца, што ў Лазараўскім добрыя цэны. Пры тым, што гэта буйны пасёлак з двума вакзаламі, марскім портам, канцэртнай залай, кінатэатрам, рэстаранамі, клубамі, барамі, рынкамі, магазінамі, дзіцячым паркам атракцыёнаў… Тут зручная транспартная сувязь, дробнагалечны пляж лічыцца адным з лепшых, мора дастаткова глыбокае, на беразе мноства вячэрніх кавярняў, бараў і дыскатэк.

У Лазараўскім пачынаецца кліматычная зона вільготных субтропікаў: пальмы, магноліі, кіпарысы, эўкаліпты, лаўр, гранат, ядомы каштан, інжыр тут гэтакія ж звычайныя рэчы, як яблыня, парэчка і ліпа ў беларускай вёсцы. Увогуле, Сочы — самыя паўночныя субтропікі ў свеце. Таму лета тут вельмі цёплае, і разам з тым спякотныя дні здараюцца рэдка. Дарэчы, Сочы з усімі прылеглымі раёнамі займаюць першае месца па колькасці сонечных дзён сярод зонаў з падобным кліматам. Натуральны бясплатны салярый тут працуе 2253 гадзіны ў год. Для параўнання: у Мінску за год налічваецца ў сярэднім 28 ясных дзён.

Невялікія пасёлкі Вялікага Сочы: Галавінка, Хобза, Горнае Паветра, Уч-Дэрэ, Лоа, Хоста, Кудэпста і іншыя, па водгуках, ідэальна падыходзяць для сямейнага адпачынку: спакойныя, ціхія, без чэргаў і таўкатні, без лішніх спакус для кашалька. Тут чыстыя і нешматлюдныя пляжы, недарагія кавярынкі і жыллё.

Адлер і Дагамыс лічацца сярэднімі пасёлкамі. Гэта самыя блізкія ад Сочы пасёлкі, і таму тут можна атрымаць усе задавальненні, якія прапануе будучая сталіца Алімпійскіх гульняў і значна эканоміць грошы. Чатыры гады запар я адпачываю з дзецьмі ў Дагамысе. Дарэчы, большасць адпачываючых ва ўсіх населеных пунктах Вялікага Сочы тут якраз такога тыпу: пабываўшы аднойчы, людзі едуць сюды наступны раз, і потым з году ў год — у адно месца.

Галоўная перавага Дагамыса, на мой погляд, — пляж. Па першае, ён прасторны, месца хапае ўсім, і пракатчыкам інвентару, і тым, хто аддае перавагу непасрэдна цёплым каменьчыкам. Мясцовыя жыхары расказваюць, што гадоў 20 таму ў Дагамысе пляж быў невялікі і з валуноў, але паступова мора адступіла і само прынесла пляскатыя гладкія каменьчыкі, дзякуючы якім у цікае надвор'е мора застаецца празрыстым да вечара. Можа быць, хадзіць па такім пляжы не так зручна, як па пяску альбо гальцы, але затое чысціня забяспечана. На гэтых каменьчыках прыемна ляжаць нават без дыванка, калі яны яшчэ не надта нагрэліся альбо ўжо трошкі астылі.

Тыя, хто ніколі не быў у гэтых мясцінах, пытаюцца, наколькі там бяспечна, і я заўсёды здзіўляюся. Так, там сапраўды бліска мяжа, за якой Абхазія, але нагоды хвалявацца канторт бяспекі ў мяне ніколі не было. Пры тым, што я езджу з дзецьмі і без мужа, які вечна працуе. Ніхто не чапляецца, не надакучвае нясцісламі позіркамі, не адпускае двухсэнсоўных заўваг. Шпацыраваць можна ў любую гадзіну сутак і ў любым месцы. Мясцовае насельніцтва вельмі добразычлівае і спагадлівае. Для ілюстрацыі раскажу выпадак, які адбыўся з намі сёлета.

Мы адпачывалі на пачатку ліпеня. Некалькі дзён запар мора штарміла. Гэта зусім не выключала купання, хоць на дагамыскім пляжы выратавальнікі вывешвалі забаронны чорны сцяг. Дзеці, тым не менш, верашчалі на хвалях і не звярталі ніякай увагі на пабітыя каленкі і локці. Нарэшце настала раніца, калі мора супакоілася і вада, неверагодна празрыстая і ціхая, нагадвала павелічальнае шкло. Мы прыйшлі на пляж каля дзевяці гадзін. Дзеці адразу за маскі і водныя акуляры і ў ваду пятай кропкай дагары. Захапіўшыся ўбачаным падводным хараством, Дар'я мая не разлічыла адлегласці да дна і ўдарылася пераносам. Яна не адразу адрэагавала на боль, але потым не магла ўтрымаць слёз, хоць і вельмі старалася. Я вырашыла паказаць яе ўрачу, але медпункт на пляжы адкрываецца а 10-й гадзіне раніцы, пра што мне паведаміў супрацоўнік пракату дайвінг-абсталявання. Ён пацікавіўся, што здарылася, прапанаваў спытаць у бліжэйшым кафэ лёд. У кафэ мне адразу далі фарфоравы кубак з лёдам. Потым дайвінгіст агледзеў Дар'ю, запэўніў, што ніякага пералому няма, падбадзёрыў дзіця і супакоіў мяне. Можа і нічога асаблівага ў гэтым няма, але тым не менш засталося адчуванне, што я знаходжуся не сярод чужых людзей, што любая праблема, якая тут можа ўзнікнуць, можа быць вырашана.

Яшчэ адна характэрная для гэтых мясцін карцінка. Заходзім у цырульню, утраіх сядзім у фае і чакаем. Прыбіральшчыца працягвае нам тазік са слівамі, прапануе частавацца, прычым не па адной штучцы ўзяць, а: «З'ядайце ўсё!»

Цэлер пра цэны. Прыватныя міні-гасцініцы ў Дагамысе: ад 250 расійскіх рублёў з чалавека, двухмесныя нумары з санвузлом — ад 1200 рублёў (1000 у верасні), за такую ж цану можна знайсці аднапакаёвую кватэру «пад ключ», 2-пакаёвыя кватэры — ад 2000 у разгар сезона, 1000 — у верасні. У Дагамысе на пляжы акрамя шматлікіх кавярняў ёсць дзве сталовыя з даволі якаснай ежай, у іх можна паабедаць за 200 расійскіх рублёў, платныя прыбіральні (5 рублёў) і душ з гарачай вадой (70 рублёў), а таксама кран, пад якім можна памыць садавіну — бясплатна!

Мясцовыя жыхары (акрамя самых прадаўцоў) не раяць купляць віно на разліў, якое прапануецца на кожным кроку на вуліцах, што спускаюцца да мора. Лепш у магазіне «Магніт», які знаходзіцца ў 15 хвілінах хады ад пляжа, узяць бутэльку «Лазы Чарнамор'я» за 50 расійскіх рублёў і быць спакойным за свае галаву і страўнік. Садавіну, арэхі і гародніну вопытныя турысты не купляюць на вуліцы Армавірскай, якая злучае Батумскую шашу і бераг, усё гэта ў тры разы таннейшае прадаецца ў фруктовых крамах альбо на рынку ў цэнтры пасёлка.

Што датычыцца забаў, то нават пры неабходнасці эканоміць тут ёсць магчымасць адпачыць ад сонца і вады, набрацца ўражанняў і нарабіць цікавых фатаграфій. Не абавязкова купляць экскурсіі. Можна на рэйсавым аўтобусе (рублі за чатыры) даехаць да «Азёраў кахання» (Карыта), гэта кіламетраў 9 ад Дагамыса ў горы. Уваход на Азёры каштуе 50 рублёў, тут можна правесці цэлы дзень, альбо яго сярэдзіну, бо паўдзённае сонца рассейваецца лістотай дрэў. Адразу будуць прапанаваныя шашлыкі, калі дазволяць грошы, можна скарыстацца саўнай. Карыта, альбо Азёры кахання — вельмі прыгожае месца: горная рака ўтварыла ў скале вадаёмы рознай велічыні і вышыні. Вада крышталёвымі каскадамі пераліваецца з аднаго возера, альбо карыта, у іншае, а ў самых маленькіх закінае вірам, казыча бурбалкамі, зносіць у бок наступнага вадаспаду і знімае ў азарце тую нешматлікую вопратку, у якой ты асмеліўся ўвайсці ў раку.

Адна з самых папулярных славутасцяў Сочы — гара Ахун, 663 метры над узроўнем мора, на яе вяршыні знаходзіцца 30-метровая вежа з белага вапняку. Гэта лепшая назіральная пляцоўка на ўзбярэжжы, з якой адкрываецца панарама Сочы, Хосты і Адлера, цудоўны від на мора і вяршыні Вялікага Каўказа. Кажуць, што ў яснае надвор'е можна нават убачыць Турцыю па другі бок мора. Уваход на вежу каштуе 50 рублёў, яшчэ столькі ж — карыстанне біноклем, што на наш вопыт, зусім неабавязкова.

Ну і нарэшце, самі Сочы-Цэнтр, адмыслова падсвечаны, напоўнены смехам, музыкай і водарам прыгод ноччу, адпачываючы, зялёны, не меней прыгожы ўдзень. Дэндрарый, Рыўера, марскі порт, акварыум — гэта тое, што трэба ўбачыць, каб мець уяўленне пра горад, якім ганарацца расіяне.

Найбольш дарагое задавальненне, а калі ёсць дзеці-падлеткі, то без яго не абыдзешся, — аквапарк. Тры гады запар мы ездзілі ў «Аквалао» — гэта крыты круглагадовы парк водных горак, у кошт білета якога ўваходзіць наведванне сауны, шведскі стол і «разынка» — хвалевы басейн. Але сёлета мы даехалі на электрычцы да Туапсэ, а адтуль аўтобусам да пасёлка Небуг, дзе знаходзіцца аквапарк «Дэльфін». Дзецям, асабліва хлопцам, ён спадабаўся больш, бо тут большая колькасць горак, у тым ліку экстрэмальных. Уваход у аквапарк каштуе ад 40 да 50 доларай, у залежнасці ад працягласці і часу, дзецям — скідкі.

…Дні пралятаюць непрыкметна, і вось ужо цягнік вязе цябе, загарэлага і расслабленага, у зваротным накірунку. Яшчэ на чатыры гадзіны табе падорана магчымасць бачыць мора, якое падступае да чыгункі так блізка, што ты не вытрымліваеш і кідаеш у акно манету — каб вярнуцца.

Вольга МЯДЗВЕДЗЕВА.

Ну як, спадабалася?

РЫБАКОТ, ЦУДА-КАРАБЕЛЬ І ДРЭВА ЖАДАННЯЎ

На «Караблі» Ўладзіміра ЦЮПКІ — у творчае плаванне.

У Бабруйску адкрылася выстава работ мастакоў-керамістаў, зробленых падчас пленэра «ART-Жыжаль».

Міжнародны пленэр па керамікі штогод праходзіць у Бабруйскім раёне. На 20 летніх дзён мастакі-керамісты з розных краін традыцыйна прыязджаюць на базу адпачынку «Вербкі», каб не адпачываць, а, наадварот, напружана і творча працаваць.

На ўзбярэжжы Бярэзіны сярод зеляніны раскіданы аднапавярховыя драўляныя дамкі: агульны стыль — савецкая архаіка, бытавыя выгоды — адсутнічаюць. Але не па камфорт прыехалі сюды керамісты.

— Мяне цікавіць жывы агонь і зносіны з калегамі, — адказвае мастачка з Гомеля Яна Канавалава. — Тут атмасфера незвычайная. Ты збягаеш ад мітусні жыцця і клопатаў: больш няма куды бегчы і ніхто не перашкаджае думаць і рабіць.

Тры печы складзеныя на беразе ракі, і вакол іх бесперапынна мітусяцца людзі. Навокал — неабпаленыя вырабы, кераміка самых розных формаў і памераў. На завяршэнне пленэра мастакі, якім, як і студэнтам, заўсёды не хапае адной ночы, імкнуцца дарабіць і ўдасканаліць выставачныя працы.

Уверсе вецер палошчаць салярныя сімвалы: са старажытнасці майстры выкарыстоўвалі выяву сонца як сімвал дабра. Жыжаль, імем якога названы творчы пленэр керамістаў, — паганскі бог агню.

— У нашых гарадскіх майстэрнях зусім іншыя магчымасці, — працягвае за працай размову Яна, якая размалёўвае вялізныя бутоны для кампазіцыі з кветкамі. — Там падыміць нельга, бо выклікаюць пажарных. А тут ствараюцца непаўторныя работы. Нельга прадказаць, як будзе паводзіць сябе агонь, якая будзе тэмпература абпалу, як адновіцца глазура. Таму так і цэніцца гэта кераміка.

Мастачка дэманструе свае работы: сімпатычныя пары — козачка ды козлік з кароўкай і бычком. «Цуда-юда-рыба-кот» таксама не застаўся ў адзіноце — яму зрабілі кампаньёна, каб не было сумна.

Крок у бок — і на высокім беразе ракі нібыта ляжаць жанчына-анёл.

— Не, гэта не жанчына і не анёл, — тлумачыць сваю задумку мінская мастачка Валянціна Іванькова. — Гэта ёсць «Сон» — вобраз асацыяцыі. Ёсць такі стан, калі чалавек агортваецца сном і нібыта ўзлятае. Гэта я і імкнулася адлюстраваць.

Малады кераміст са Львова Ўладзімір Цюпка прызнаецца, што ў Вербках тварыў з задавальненнем. Яго работы — фантастычныя формы альбо нават істоты: нібыта слімак з калючкамі дыскасуд з ножкамі. Растлумачыць немагчыма, але неверагодна прыгожа. А вянчае пленэрную калекцыю Цюпкі вялікі карабель, праўда — без мачты і ветразяў. Можа, гэта для творчага плавання?

— Кераміка прыемная, і яна блізкая да жыцця, — расказвае каля печкі Ўладзімір. — Ты бярэш матэрыял і дорыш яму жыццё. Вось цяпер ён мёртвы, сыры. А калі абпаліцца, то ён нібыта ажывае, звініць. Вось свістулька: была гліна, а потым будзе ствараць мелодыю…

Бабруйская мастачка Ала Кірылава накладае каля печы нешта накшталт медальёнаў: круглякі з дзіркамі, у якія ўціснуты кавалкі каляровага шкла. Пры абпале шкло расплавіцца, і атрымаюцца незвычайныя і прыгожыя рэчы.

— Гэта для дрэва жаданняў, — тлумачыць Ала. — На ім будуць вісець талісманы. Я папрасіла кожнага ўдзельніка пленэра зрабіць свой творчы талісман на дрэва. І наша агульнае жаданне: зноў сустрэцца на наступны год у Вербках, на бабруйскай зямлі.

Ілона ІВАНОВА,
Бабруйскі раён.

БАНКІРЫ СТАНОВЯЦЦА ТУРЫСТАМІ

Хто з нас не патанаў у водары лясных траў і кветак, грыбоў і ягад, не захапляўся ранішнімі спевамі птушак, не любаваўся палаючым захадам сонца! Напэўна, усе мы не раз у жыцці гэта адчувалі. Але хто, як не сапраўдны турыст, можа атрымаць асалоду ад гэтых хвілін у поўнай меры? Бо менавіта турысты большую частку свайго жыцця праводзяць у божым «храме» прыроды, царстве гармоніі і адзінства.

10 гадоў таму «Беларусбанк» адрадзіў традыцыю правядзення летніх турыстычных злётаў. І варта адзначыць, што з кожным годам аўдыторыя прыхільнікаў адпачынку на лоне прыроды імкліва расце.

У апошнія выхадныя ліпеня возера Гаць у Баранавіцкім раёне прымала работнікаў «Беларусбанка». Каля тысячы аматараў актыўнага ладу жыцця з усёй Беларусі сабраліся на чарговы 10-ы рэспубліканскі летні турзлёт.

Пляжны валейбол, мнагабор'е, аэробіка і проста адпачынак на свежым паветры. Сёння сур'ёзныя офісныя работнікі азартна гуляюць і не менш азартна «хварэюць». Цікавасць да гэтых спаборніцтваў пастаянна расце, аб чым сведчыць рост прафесіяналізму іх удзельнікаў.

Турыстычныя палаткі, сонечныя ванны, песні ля вогнішча і каша з кацялка для многіх гараджан сёння раскоша. Таму і рады мы хоць ненадоўга змяніць урбаністычны пейзаж на сасновы лес. Тым больш што гэта — для сябе, для свайго здароўя. А здароўе нацыі — гэта сёння дзяржаўная палітыка.

У першы дзень каманды размясцілі свае палаткавыя гарадкі і паўдзельнічалі ў спартыўных спаборніцтвах па валейболе, дартсе, бадмінтоне. Напрыклад, у дартсе пераможцу вызначыць аказалася вельмі складана: на трэніроўцы ўсе ўдары трапляюць дакладна ў «яблычак», а выходзіць удзельнік выступаць — і маўжа! Хваляванне адбіваецца. Але лепшымі за ўсіх аказаліся прадстаўнікі цэнтральнага апарату банка.

Нягледзячы на некаторую стомленасць, удзельнікі турзлёту завяршылі першы дзень дыскатэкай. І правільна зрабілі. Пасля напружанай спартыўнай праграмы танцы — лепшы сродак ад стомленасці.

Другі дзень пачаўся са спаборніцтва па рыбнай лоўлі. Тут таксама свайго роду спартыўны інтарэс плюс майстэрства. Як каму пашанцуе. А шанцуе, як правіла, рыбакам-знаўцам — прафесіяналам. На світанні, пакуль большасць турыстаў яшчэ спалі, у некаторых на воднай гладзі возера ўжо «нырялі» паплаўкі. Самымі ўдачлівымі рыбаловамі аказаліся прадстаўнікі зборнай каманды цэнтральнага апарату і філіялаў г. Мінска — Аляксей Губараў і Валерый Давыдоўскі.

Пасля снедання ўсе ўдзельнікі сабраліся на адкрыцці турзлёту. Каманды прадстаўлялі сваю «візітную картку», і ўсе былі поўныя жадання пазмагацца за прызавыя месцы. Варта зазначыць, што з кожным годам барацьба за прызавыя месцы становіцца ўсё больш напружанай, бо ўсе ўдзельнікі добра падрыхтаваныя ў кожным відзе спартыўных спаборніцтваў.

Але лепшыя — гэта, вядома ж, заўсёды наймацнейшыя. І судзейская каманда такіх вызначала. І ў мнагабор'і кіраўнікоў, і ў аэробіцы, і ў конкурсе «Спяваючы офіс», і ў кулінарным паядынку.

Кажучы пра апошняе спаборніцтва, заўважым, што ўсім удзельнікам выдаваўся аднолькавы набор прадуктаў, з якога трэба было прыгатаваць страву, здольную ўсіх уразіць. У кожнай камандзе шэф-кухарам выступалі мужчыны. І яны такое там, на прыродзе, гатавалі! Лепшым быў прызнаны «пірацкі абед», прыгатаваны Цімурам Пятровічам і Юрыем Зайко, супрацоўнікамі філіяла № 527 «Белчыгунка».

Нядзеля — апошні дзень злёту, быў хоць і сонечным, але хвалюючым. Прычым не толькі для ўдзельнікаў, але і для членаў журы. Бо ім трэба было падвесці вынікі і ўзнагародзіць пераможцаў. І як бы складана ні было, пераможцы ўсё ж вызначаны.

Першае месца ў агульнакамандным заліку заняла каманда г. Мінска (зборная цэнтральнага апарату і мінскіх філіялаў «Беларусбанка»), другое — філіял № 500 — Мінскае ўпраўленне, трэцяе — філіял № 400 — Гродзенскае абласное ўпраўленне.

Усе пераможцы атрымалі ўзнагароды, прызы і падарункі — спартыўны і турыстычны рыштунак. Каб свае ўменні да наступнага турзлёту яшчэ больш развіць.

10-ы рэспубліканскі летні турыстычны злёт застаўся ў гісторыі «Беларусбанка». Ён закончыўся, каб даць старт у наступным годзе ўжо 11-у турзлёту, які запаліць свае спартыўныя зоркі, падорыць нам новыя адкрыцці і станоўчыя эмоцыі, узбагаціць радасцю новых сустрэч.

Віталь ГРЫНКЕВІЧ.

Інфарм-укол

ЭКСТРАКТАМ ЧАСНАКУ — ПА ВЫСОКАМУ ЦІСКУ

Аўстралійскія вучоныя правялі агляд даследаванняў, прысвечаных дзеянню экстракту часнаку, і высветлілі, што біядабаўкі, якія ўтрымліваюць апошні, зніжаюць артэрыяльны ціск. Аўтары агляду адзначаюць, што дзеянне экстракту часнаку мала адрозніваецца ад дзеяння традыцыйных лекаў для лячэння гіпертаніі, напрыклад, бэта-блакатараў, якія зніжаюць сісталічны ціск на 55 мм рт. сл. або інгібітараў АПФ, якія зніжаюць артэрыяльны ціск на 8 мм рт. сл. Дозы, якія прымяняліся ў даследаваннях, утрымлівалі 3,6—5,4 мг аліцыну, актыўнага рэчыва часнаку. У зубчыку свежага часнака ўтрымліваецца ад 5 да 9 мг аліцыну. Падлічана, што калі б папуляцыі ўдалося знізіць сісталічны ціск на 4-5 пунктаў, а дыясталічны — на 2-3, смяротнасць ад сардэчна-сасудзістых хвароб скарацілася б амаль на 20 працэнтаў. Вучоныя кажуць, што для высвятлення аддаленых эфектаў экстракту часнаку неабходна правесці дадатковыя даследаванні.

ВЕНАМ ДАПАМОЖА КАМПРЭСІЙНАЯ СКЛЕРАТЭРАПІЯ

Большасць расшыраных венаў магчыма выдаліць з дапамогай склератэрапіі — эстэтычнага лячэння без разрэзаў і рубцоў.

Паказанні. Наяўнасць зменены венаў малога і сярэдняга дыяметра, сасудзістыя «зорачкі» і «змейкі».

Тэхніка. Аднаразовым шпрыцам у «змейкі» і «зорачкі» ўводзяцца прэпараты, якія выклікаюць «склейванне» венаў, што прыводзіць да іх поўнага знікнення, застаецца чыстая скура, без рубцоў. Працэдура не хваравітая, займае ад 30 хвілін да 1 гадзіны і спецыяльнай падрыхтоўкі не патрабуе. Такое ўмяшанне не прыводзіць да прагрэсавання варыкознай хваробы, хоць яна, вядома ж, і не знікне, паколькі з'яўляецца хранічнай.

Вядучая рубрыкі Святлана БАРЫСЕНКА.

«УСЕ ТАМ БУДЗЕМ…»

Замор'е

Турыстычны партал VirtualTourist.com прапануе пазнаць культуру іншых народаў не зусім звычайным спосабам — параўнаць, як розныя супольнасці практыкуюць рытуалы і традыцыі, уласцівыя ўсяму чалавецтву. Ярчэй за ўсё гэтыя адрозненні выяўляюцца ў тым, якім чынам людзі паважаюць сваіх продкаў. VirtualTourist.com апублікаваў спіс васьмі самых незвычайных пахавальных рытуалаў свету.

1. «Пахаванне Сардзіны», Іспанія

Гісторыя папулярнай традыцыі налічвае некалькі стагоддзяў. Нягледзячы на сваю змрочную назву, яна здзіўляе весялосцю, скокамі, карнавальным шэсцем, яркасцю фарбаў.

Свята Пахавання Сардзіны завяршае ўсеіспанскі карнавал. Гіганцкую кардонную сардзіну некалькі чалавек у карнавальных касцюмах пад гукі жалобнай музыкі нясуць на выцягнутых руках. Іх суправаджае жалобная працэсія ў масках. Сярод іх вылучаюцца «ўдовы», якія няўцешна плачуць (часта іх ролю выконваюць мужчыны). На вуліцах таксама стаіць «стогн» і «плач». У выніку сардзіну спальваюць, а яе попел закопваюць у зямлю.

Выяву гэтага народнага гуляння можна ўбачыць на анімэннай карціне вялікага Гоі. Лічыцца, што пачаткам фестывалю паслужыла свята ўраджаю, распаўсюджанае ў шматлікіх еўрапейскіх краінах.

2. «Касцяная хата», Хальштадт, Аўстрыя

У невялікай гатычнай царкве ў цяжкадаступнай альпійскай вёсачцы захоўваюцца больш за 600 размаляваных чалавечых чэрапаў, кожны з якіх забяспечаны таблічкай з інфармацыяй аб «гаспадару».

Жыхары прыдумалі такі арыгінальны спосаб пахавання, паколькі мясцовыя царкоўныя могілкі занадта малыя, а закон прадугледжвае продаж участка, калі сваякі нябожчыка не падоўжылі арэнду праз 25 гадоў пасля пахавання.

3. «Вісячыя дамавіны», Сагада, востраў Лусон, Філіпіны

Унікальны пахавальны звычай ужо дзве тысячы гадоў існуе ў глыбіні вострава Лусон на Філіпінах. Нябожчыкаў хаваюць у выдзеўбаных імі ж бярвёнах, а потым адносяць у пячоры высока ў гарах.

У некаторых пячорах налічваецца да сотняў своеасаблівых дамавін. Падобны рытуал сустракаецца таксама ў шэрагу рэгіёнаў Кітая і Інданезіі. На жаль, некаторыя турысты, якім удаецца дабрацца да пахаванняў, часам забіраюць косткі ў якасці сувеніраў.

4. Пячорныя магілы Лемо, Тана Тарая, Інданезія

Паміж смерцю чалавека і прызнаннем яго мёртвым у інданезійскага народа Тарая праходзіць вельмі шмат часу.

Нябожчыка там завуць «спячым», муміфікуюць і гадамі трымаюць у магільным склепе, пакуль ідзе падрыхтоўка да завяршальнага рытуальнага абраду.

Лічыцца, што душа «спячага» ў гэты час збіраецца ў шлях у краіну духаў, і сам ён яшчэ не памёр, а толькі хворы. У выніку труп некалькі разоў падкідваюць уверх, а потым кладуць нагамі на поўдзень, пасля гэтага ён «афіцыйна» лічыцца мёртвым. У выразаных у расколінах скал пячорных магілах можна ўбачыць тузіны падобных на лялек фігур. Гэтыя фігуры, якія завуцца таў-таў, ахоўваюць пакой мёртвых, пахаваных прама за імі.

5. Нябеснае пахаванне, Тыбет

«Нябеснае пахаванне» для жыхароў Тыбета было звычайным спосабам развітацца з целавай абалонкай пасля таго, як гэтая «пустая пасудзіна» пакінула бессмяротную душу.

Пасля смерці чалавека яго цела раздзялялі на часткі і выносілі ў горы на з'ядзенне грыфам. Лічыцца, што гэтыя драпежныя птушкі з'яўляюцца Дакіні, жаночымі аспектамі Буды, аналагамі анёлаў. Дакіні ўзнімаюць душы памерлых на неба, дзе тыя чакаюць сваёй наступнай рэінкарнацыі. Па аналогіі з дабрадзейнасцю Шак'ямуні, які накарміў сваім целам ястраба, каб выратаваць голуба, чалавечае цела ахвяруецца птушкам у выратаванне іх звычайных ахвяраў.

6. Затоплены могільнік, Камігуін, Філіпіны

Падчас вандравання па Філіпінах (асабліва калі вы захапляецеся дайвінгам) трэба абавязкова наведаць гэтыя старадаўнія гарадскія могілкі, якія пайшлі пад ваду разам са старой сталіцай пасля вывяржэння вулкана ў 1871 годзе.

Цяпер на гэтым месцы велізарны крыж, усталяваны ў 1982 годзе.

7. Мумі Наска, Перу

Нягледзячы на апусташэнні, зробленыя рабаўнікамі, невялікая колькасць мумій Наска ўсё яшчэ захавалася ў пустыні Атакама.

У некаторых прадстаўнікоў гэтай загадкавай культуры, якая знікла шмат стагоддзяў таму, засталіся доўгія «косы», якія раздзімаюцца на ветры, што сведчыць аб высокім статусе пры жыцці.

8. Скальныя грабніцы, Міры, Турцыя



Комплекс высечаных у скалах грабніц выглядае, хутчэй, як велічны замак, чым як старажытныя могілкі.

Унікальнасць і своеасаблівасць іх можна растлумачыць тым, што ў народаў Лікіі існаваў звычай хаваць мёртвых на высокіх месцах, бо меркавалася, што гэта дапаможа ім патрапіць на неба. Узрост першых пахаванняў не меншы за дзве тысячы гадоў.

Падрыхтаваў Іван КУПАРВАС.

Шчаслівая маці, або Імя для зубраня

І зноў з Мінскага звярынца сенсацыйная вестка — нараджэнне зубраняці. Ужо другога ў няволі. І зноў зубрыха Барышня стала гераіняй падзеі. Год таму напрыканцы жніўня яна прывяла свайго першага патомка. А цяпер у яе «дзяўчынка», якая імя яшчэ не мае — па традыцыі яно будзе выбірацца наведвальнікамі ў дзень заснавання сталічнага звярынца — 9 жніўня. Так што, паважаныя чытачы, вы таксама маеце магчымасць узяць удзел у пошуку цікавага імя новаму белавежскаму прадстаўніку.

Фота Вольгі ЛАСКІ.

Заўтра — Дзень чыгуначніка

У адзінай у краіне Мінскай дзіцячай чыгункі будучых чыгуначнікаў рыхтуюць з дзяцінства. Машыніст, дыспетчар, праваднік, начальнік станцыі — усе гэтыя спецыяльнасці дзеці могуць асвоіць ужо з маленства. Працаваць на Мінскую дзіцячую чыгунку бяруць усіх ахвотнікаў — цяпер тут займаюцца 524 хлопчыкі і дзяўчынкі ва ўзросце ад 11 да 17 гадоў. Поўнае навучанне працягваецца тры гады, пасля чаго самыя лепшыя вучні паступаюць у Мінскі прафесійна-тэхнічны каледж чыгуначнага транспарту без уступных экзаменаў па мэтавым накіраванні. Такая практыка існуе толькі трэці год, але за гэты час у каледж паступіла каля 30 чалавек, сёлета — 13 хлопцаў і дзяўчат.

З 1 мая маладыя чыгуначнікі перавезлі 35 тысяч пасажыраў.

Марына БЕГУНКОВА. Фота аўтара.

З юбілеем, з 50-годдзем, шчыра віншуем начальніка Будаканашалёўскага раённага вузла паштовай сувязі **А.А. ДРАЛАВУ**! Добрага здароўя вам, шаноўная Ала Аляксандраўна, спору ды ладу ў працы, шчасця ў асабістым жыцці.

Звяздоўцы.

Закон Рэспублікі Беларусь

АБ ВЫКАРЫСТАННІ АТМАНАЙ ЭНЕРГІІ

Прыняты Палатай прадстаўнікоў 24 чэрвеня 2008 года
Адобраны Саветам Рэспублікі 28 чэрвеня 2008 года

ГЛАВА 1
АГУЛЬНЫЯ ПАЛАЖЭННІ

Артыкул 1. Асноўныя тэрміны і іх азначэнні

Для мэтаў гэтага Закона прымяняюцца наступныя асноўныя тэрміны і іх азначэнні:

аварыйная гатоўнасць — здольнасць аператыўна прымаць меры, якія эфектыўна, надзейна і своечасова перашкаджаюць або зніжаюць верагоднасць узнікнення радыяцыйнай аварыі пры эксплуатацыі ядзернай установкі і (або) пункта захоўвання радыеактыўных адходаў;

аварыйнае рэагаванне — выкананне мераў, накіраваных на ліквідацыю, абмежаванне або зніжэнне наступстваў радыяцыйнай аварыі, якая ўзнікла пры эксплуатацыі ядзернай установкі і (або) пункта захоўвання;

атамная электрастанцыя — ядзерная ўстаноўка для вытворчасці электрычнай і цеплавой энергіі ў зададзеных рэжымах і ўмовах прымянення, якая размяшчаецца ў межах пэўнай тэрыторыі, на якой для эксплуатацыі гэтай мэты выкарыстоўваюцца ядзерны рэактар (рэактары) і комплекс неабходных для яго функцыянавання сістэм, устройстваў, абсталявання і зэдбаванняў;

атамная энергія — энергія, якая вызваляецца ў ядзерных рэакцыях і пры радыеактыўным распадзе, а таксама энергія генерыруемых іанізуючых выпраменьванняў;

блок атамнай электрастанцыі — частка атамнай электрастанцыі, якая з'яўляецца ядзерным рэактарам з генерыруючым і іншым абсталяваннем і забяспечвае функцыі атамнай электрастанцыі ў вызначаным яе праектам аб'ёме;

вывад з эксплуатацыі ядзернай установкі і (або) пункту захоўвання — працэс, у час якога сістэмы і кампаненты пабудаваных ядзернай установкі і (або) пункту захоўвання прыводзяцца ў працаздольны стан і ацэньваецца іх адпаведнасць праекту ўказаных аб'ектаў;

увод у эксплуатацыю ядзернай установкі і (або) пункту захоўвання — працэс, накіраваны на спыненне далейшага выкарыстання па назначэнні ядзернай установкі і (або) пункту захоўвання, пры якім забяспечваецца бяспека работнікаў (персаналу) эксплуатуючай арганізацыі, грамадзян і навакольнага асяроддзя;

дзейнасць па выкарыстанні атамнай энергіі — абгрунтаваная дзейнасць асобаў, звязаная з размяшчэннем, праектаваннем, будаваннем, уводам у эксплуатацыю, эксплуатацыяй, абмежаваннем эксплуатацыйных характарыстык, прадаўжэннем тэрміну эксплуатацыі, выводам з эксплуатацыі ядзернай установкі і (або) пункту захоўвання, а таксама дзейнасць па абыходжанні з ядзернымі матэрыяламі, адпрацаванымі ядзернымі матэрыяламі і (або) эксплуатацыйнымі радыеактыўнымі адходамі;

ядзерная бяспека — стан абароненасці грамадзян і навакольнага асяроддзя ад шкоднага ўздзеяння іанізуючага выпраменьвання ядзернай установкі і (або) пункту захоўвання, забяспечанае дасягненнем належных умоў іх эксплуатацыі, а таксама належным абыходжаннем з ядзернымі матэрыяламі, адпрацаванымі ядзернымі матэрыяламі і (або) эксплуатацыйнымі радыеактыўнымі адходамі;

ядзерная ўстаноўка — збудаванні і комплексы з ядзерным рэактарам (рэактарамі), у тым ліку збудаванні і комплексы на прамысловымі, эксперыментальнымі і даследчымі ядзернымі рэактарамі, крытычнымі і падкрытычнымі ядзернымі стэндамі (зборкамі);

ядзерны матэрыял — матэрыял, які ўтрымлівае і здольны ўзнавіць матэрыялы (рэчывы), якія дзеляцца;

ядзерны рэактар — устройства для ажыццяўлення кіруемай ланцуговай ядзернай рэакцыі.

Артыкул 2. Прававое рэгуляванне дзейнасці па выкарыстанні атамнай энергіі

Гэты Закон рэгулюе адносіны, звязаныя з размяшчэннем, праектаваннем, будаўніцтвам, уводам у эксплуатацыю, эксплуатацыяй, абмежаваннем эксплуатацыйных характарыстык, прадаўжэннем тэрміну эксплуатацыі і выводам з эксплуатацыі ядзернай установкі і (або) пункту захоўвання, а таксама адносіны, звязаныя з абыходжаннем з ядзернымі матэрыяламі пры эксплуатацыі ядзернай установкі і (або) пункту захоўвання, адпрацаванымі ядзернымі матэрыяламі і (або) эксплуатацыйнымі радыеактыўнымі адходамі, і іншыя адносіны ў галіне выкарыстання ядзернай энергіі.

Адносіны, звязаныя з абыходжаннем з ядзернымі матэрыяламі, адпрацаваўшымі ядзернымі матэрыяламі і (або) эксплуатацыйнымі радыеактыўнымі адходамі, не ўрэгуляваныя гэтым Законам, рэгулююцца заканадаўствам аб радыяцыйнай бяспецы і іншым заканадаўствам.

Заканадаўства ў галіне выкарыстання атамнай энергіі грунтуецца на Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь і складаецца з гэтага Закона, іншых актаў заканадаўства і міжнародных дагавораў Рэспублікі Беларусь.

Артыкул 3. Прынцыпы ажыццяўлення дзейнасці па выкарыстанні атамнай энергіі

Дзейнасць па выкарыстанні атамнай энергіі грунтуецца на прынцыпах:

прыярытэту абароны жыцця і здароўя сучаснага і будучых пакаленняў грамадзян, аховы навакольнага асяроддзя перад усімі іншымі аспектамі дзейнасці па выкарыстанні атамнай энергіі;

забеспячэння перавышэння выгод для грамадзян і грамадства ад выкарыстання атамнай энергіі над шкодай, якая можа быць прычынена дзейнасцю па выкарыстанні атамнай энергіі;

забеспячэння ядзернай і радыяцыйнай бяспекі;

кампенсацыі шкоды, нанесенай шкодным уздзеяннем іанізуючага выпраменьвання або дзейнасцю па выкарыстанні атамнай энергіі;

прадастаўлення поўнай, дакладнай і своечасовай інфармацыі, звязанай з дзейнасцю па выкарыстанні атамнай энергіі, калі гэта інфармацыя не ўтрымлівае звестак, якія складаюць дзяржаўныя сакрэты, або не адносіцца да інфармацыі, распаўсюджванне і (або) прадастаўленне якой абмежавана;

забароны на вытворчасць ядзернай зброі і іншых ядзерных выбуховых устройстваў.

(Працяг будзе.)

Закон Рэспублікі Беларусь

АБ САВЕЦЕ МІНІСТРАЎ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

Прыняты Палатай прадстаўнікоў 24 чэрвеня 2008 года
Адобраны Саветам Рэспублікі 28 чэрвеня 2008 года

ГЛАВА 1
АГУЛЬНЫЯ ПАЛАЖЭННІ

Артыкул 1. Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь — Урад Рэспублікі Беларусь — цэнтральны орган дзяржаўнага кіравання Рэспублікі Беларусь

Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь — Урад Рэспублікі Беларусь з'яўляецца калегіяльным цэнтральным органам дзяржаўнага кіравання Рэспублікі Беларусь, які ажыццяўляе ў адпаведнасці з Канстытуцыяй Рэспублікі Беларусь выканаўчую ўладу ў Рэспубліцы Беларусь і кіраўніцтва сістэмай падпарадкаваных яму рэспубліканскіх органаў дзяржаўнага кіравання і іншых дзяржаўных арганізацый, а таксама мясцовых выканаўчых і распарадчых органаў.

Артыкул 2. Падсправаздачнасць Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь

Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь у сваёй дзейнасці падсправаздачны Прэзідэнту Рэспублікі Беларусь і адказны перад Нацыянальным сходам Рэспублікі Беларусь.

Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь па меры неабходнасці, але не радзей чым адзін раз у квартал прадстаўляе Прэзідэнту Рэспублікі Беларусь справаздачу аб сваёй дзейнасці.

Артыкул 3. Дзейнасць Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь па забеспячэнні выканання Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь, законаў Рэспублікі Беларусь, актаў Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь

Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь у межах сваёй кампетэнцыі забяспечвае выкананне Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь, законаў Рэспублікі Беларусь, актаў Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, ажыццяўляе кантроль за іх выкананнем падпарадкаванымі яму рэспубліканскімі органамі дзяржаўнага кіравання і іншымі дзяржаўнымі арганізацыямі, а таксама мясцовымі выканаўчымі і распарадчымі органамі, фізічнымі асобамі і арганізацыямі.

ГЛАВА 2
СКЛАД І ПАРАДАК ФАРМІРАВАННЯ САВЕТА МІНІСТРАЎ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

Артыкул 4. Склад Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь

У склад Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь уваходзяць Прэм'ер-міністр Рэспублікі Беларусь, Кіраўнік Адміністрацыі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, Старшыня Камітэта дзяржаўнага кантролю Рэспублікі Беларусь, Старшыня Праўлення Нацыянальнага банка Рэспублікі Беларусь, намеснікі Прэм'ер-міністра Рэспублікі Беларусь, міністры, старшыні дзяржаўных камітэтаў, Кіраўнік Апарата Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь, Старшыня Прэзідыума Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі, Старшыня Праўлення Беларускага саюза спажывецкіх таварыстваў і іншыя службовыя асобы па рашэнні Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.

Артыкул 5. Парадак фарміравання Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь

Прэм'ер-міністр Рэспублікі Беларусь назначаецца Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь са згоды Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь.

Намеснікі Прэм'ер-міністра Рэспублікі Беларусь, міністры, старшыні дзяржаўных камітэтаў назначаюцца Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь.

Артыкул 6. Прэм'ер-міністр Рэспублікі Беларусь

Прэм'ер-міністр Рэспублікі Беларусь у адпаведнасці з Канстытуцыяй Рэспублікі Беларусь, законамі Рэспублікі Беларусь, актамі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь:

ажыццяўляе непасрэднае кіраванне дзейнасцю Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь і нясе персанальную адказнасць за яго работу;

арганізуе работу Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь, кіруе яго пасяджэннямі;

падпісвае пастановы Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь;

выдае распараджэнні;

у двухмесячны тэрмін пасля свайго назначэння прадстаўляе Палаце прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь праграму дзейнасці Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь, а ў выпадку яе адхілення прадстаўляе паўторную праграму дзейнасці Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь на працягу двух месяцаў;

інфармуе Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь аб асноўных накірунках дзейнасці Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь і аб усіх важнейшых яго рашэннях;

размяркоўвае абавязкі паміж намеснікамі Прэм'ер-міністра Рэспублікі Беларусь, каардынуе іх дзейнасць;

прадстаўляе без дадатковых паўнамоцтваў Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь у міжнародных адносінах, ва ўстаноўленым парадку праводзіць перагаворы і падпісвае міжнародныя дагаворы;

ажыццяўляе паўнамоцтвы Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь у выпадку вакансіі пасады Прэзідэнта або немагчымасці выканання ім сваіх абавязкаў па прычынах, прадугледжаных Канстытуцыяй Рэспублікі Беларусь, да прынясення Прысягі зноў выбраным Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь;

выконвае іншыя функцыі, звязаныя з арганізацыяй і дзейнасцю Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь.

Гаранты прававой і сацыяльнай абароны Прэм'ер-міністра Рэспублікі Беларусь вызначаюцца заканадаўствам Рэспублікі Беларусь.

Артыкул 7. Намеснікі Прэм'ер-міністра Рэспублікі Беларусь

Намеснікі Прэм'ер-міністра Рэспублікі Беларусь у адпаведнасці з размеркаваннем абавязкаў:

ажыццяўляюць каардынацыю дзейнасці рэспубліканскіх органаў дзяржаўнага кіравання і іншых дзяржаўных арганізацый, падпарадкаваных Савету Міністраў Рэспублікі Беларусь, кантроль за іх работай і даюць ім указанні па забеспячэнні выканання Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь, законаў Рэспублікі Беларусь, актаў Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, пастаноў Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь, распараджэнняў Прэм'ер-міністра Рэспублікі Беларусь і па іншых пытаннях іх дзейнасці;

папярэдне разглядаюць прапановы і праекты дакументаў, унесеныя ў Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь;

нясуць адказнасць за стан спраў у галінах эканомікі і сферах дзейнасці;

выконваюць іншыя абавязкі ў адпаведнасці з гэтым Законам і іншымі актамі заканадаўства Рэспублікі Беларусь.

Выкананне абавязкаў Прэм'ер-міністра Рэспублікі Беларусь у выпадку яго адсутнасці ажыццяўляецца Першым намеснікам Прэм'ер-міністра Рэспублікі Беларусь, а ў выпадку адсутнасці Прэм'ер-міністра Рэспублікі Беларусь і Першага намесніка Прэм'ер-міністра Рэспублікі Беларусь — Намеснікам Прэм'ер-міністра Рэспублікі Беларусь, у распараджэнні якога знаходзяцца пытанні эканомікі.

Гаранты прававой і сацыяльнай абароны намесніка Прэм'ер-міністра Рэспублікі Беларусь вызначаюцца заканадаўствам Рэспублікі Беларусь.

Артыкул 8. Іншыя члены Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь

Іншыя члены Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь:

нясуць адказнасць за стан спраў у даручанай ім сферы дзейнасці;

прымаюць удзел у разглядзе пытанняў на пасяджэннях Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь;

маюць права ўносіць у Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь прапановы аб разглядзе пытанняў, якія ўваходзяць у яго кампетэнцыю;

ініцыююць распрацоўку праектаў законаў Рэспублікі Беларусь, актаў Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, пастаноў Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь, распараджэнняў Прэм'ер-міністра Рэспублікі Беларусь.

Гаранты прававой і сацыяльнай абароны іншых членаў Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь вызначаюцца заканадаўствам Рэспублікі Беларусь.

Прававы статус міністраў і старшыняў дзяржаўных камітэтаў вызначаецца Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь.

(Працяг будзе.)

Рассакрэчаны архіў

НА ДВА ФРОНТЫ

Канфіскавана на працягу следства.

Цімафея Баршчэўскага ў пэўнай ступені можна назваць закладнікам глабальнага процістаяння двух палітычных сістэм. Але ж не толькі яго аднаго… Іншая справа, у тагачасных умовах вайны і пасляваеннага ліхалецця кожны ўсё ж такі сам рабіў свой выбар… Хоць быў у жыцці Баршчэўскага і сапраўды трагічны момант, калі асабіста ад яго нічога не залежала. Хто ведае, як склалася б жыццё гэтага чалавека, калі б не падзеі пачатку вайны…

...Восенню 1941 года стралковы полк, у якім служыў Цімафей Баршчэўскі, трапіў у акружэнне. Цімафей апынуўся ў палоне. У 1942-м акупацыйныя ўлады вывезлі яго ў Германію, дзе ён пагадзіўся працаваць на нямецкі бок і адкуль у хуткім часе вярнуўся — у складзе аднаго з паліцэйскіх фарміраванняў, створаных на тэрыторыі Беларусі. Пасля наступлення Чырвонай Арміі і вызвалення краіны ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў Баршчэўскі разам з нямецкім адступленнем збег у Нямеччыну, адкуль ужо пабаяўся вяртацца на пераможную радзіму. Ён спрабаваў знайсці сябе на чужой зямлі — шмат працаваў на розных работах, але ўсё ж такі яго цягнула дадому, і адно «ракавое» знаёмства ў замежжы паспрыяла вяртанню, прадвызначыла не проста яго асноўны занятак, але ўвогуле далейшы лёс.

Паводле слоў супрацоўніка Цэнтральнага архіва Камітэта дзяржаўнай бяспекі Рэспублікі Беларусь Артура ЗЕЛЬСКАГА, на чужыне ў пасляваенны час сабраліся своеасаблівая калонія беларускіх мігрантаў, куды ўваходзілі такія вядомыя асобы, як Запруднік, Цвірка, Урбан... Пэўны «касцяк» гэтых мігрантаў — так званая «дванаццатка» — у 1947 годзе пераязджае ў Вялікабрытанію, дзе далучаецца да тамтэйшага аб'яднання беларусаў, якім кіруе Барыс Рагуля. Дарэчы, напрыканцы 30-х гадоў гэты чалавек быў арыштаваны органамі ўнутраных спраў. У першыя дні вайны збег з турмы, вярнуўся ў родны Навагрудак. Праўда, пасля вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў вымушаны быў па зразумелых прычынах пакінуць радзіму...

...Летам 1944 года ў мястэчку Дальвітц, што непадалёк ад г. Істэнбурга (Усходняя Прусія), па ініцыятыве кіраўніцтва Беларускай цэнтральнай рады і са згоды абвера была створана разведвальна-дыверсійная школа, якую дзеля канспірацыі назвалі «Спецыяльным батальёнам «Дальвітц». У школе навучаліся колішнія паліцэйскія, члены Беларускай незалежнай партыі, Беларускай краявой абароны, Саюза беларускай моладзі і іншых калабарацыянісцкіх арганізацый. Усяго дзесьці каля 200 чалавек.

Курс навучання ў гэтай дыверсійнай школе ўключаў у сябе валоданне тайнапісам, замежнымі мовамі, агнявую падрыхтоўку, арыентаванне на мясцовасці, вывучэнне выбуховых рэчываў, асновы канспірацыі, агентурнай работы... Інакш кажучы, той, хто праходзіў падобнае навучанне, мог ажыццяўляць любыя тэракты і дыверсіі ў тыле Чырвонай Арміі. Начальнікам вучэбнай часці гэтага спецыяльнага батальёна быў вышэйпамянёны Барыс Рагуля.

Чацвёрка дыверсантаў.

Рагуля і Баршчэўскі пазнаёміліся ў Вялікабрытаніі. Баршчэўскі не страціў надзеі любым шляхам вярнуцца ў Беларусь, з-за чаго ён адразу згадзіўся супрацоўнічаць з амерыканскай разведкай.

...Варта нагадаць, што ў пачатку 50-х гадоў «работа» разведвальных службаў ЗША ўзмацнілася: яны актыўна закідвалі на тэрыторыю СССР сваіх агентаў. У гэтым патоку знайшлося месца і колішніх дапамагатым фашыстаў. Дарэчы, жыццё кожнага такога агента страхавалася на небывалыя для савецкага чалавека сумы — 10 тысяч долараў. Плюс штомесячныя адлічэнні на асабістыя рахункі ў памеры 213 долараў...

У верасні 1951 года з амерыканскага самалёта на тэрыторыю Ільянскага раёна Маладзечанскай вобласці быў закінуты адзін такі «памочнік» — камісар Рады Беларускай народнай рэспублікі Янка Фелістовіч, які паспеў «адзначыцца» і ў гітлераўскіх падраздзяленнях СД, і ў ліку канваіраў лагера смерці ў Трасцянцы. Прызямліўся парашутыст удала, паколькі аказаўся адзіным з «калег», каго не падстрэлілі і не схапілі адразу, аднак у хуткім часе яго ўсё роўна адшукалі на адным хутары. Фелістовіч, як высветлілася, закідваўся дзеля збору шпіёнскіх звестак, вывучэння і падбору кадраў для будучай акупацыйнай адміністрацыі.

У 1952 годзе надышла чарга для закіду групы, у якую ўваходзіў Цімафей Баршчэўскі. Чацвёрка дыверсантаў — Касцюк («Бэн»), Баршчэўскі («Карл»), Кальніцкі («Джо») і Арцюшэўскі («Фін») — апусцілася з борта амерыканскага ваеннага самалёта на парашутах на тэрыторыю ўсё той жа тагачаснай Маладзечанскай вобласці. У заданне групы ўваходзіў збор разведданых аб палітычным становішчы БССР і стаўленні насельніцтва да савецкай улады. Неабходна было прыцягнуць для работы на амерыканскую разведку служачых дзяржаўных устаноў. Разглядалася і магчымасць іх закіду ў Заходнюю Германію для выкарыстання ў якасці інструктараў разведшкол. Але выканаць гэтыя задачы чацвёркі не давялося. Адзін са знаёмых, на якога выйшлі дыверсанты, аказаўся агентам органаў дзяржбяспекі. Так «Карл», «Бэн», і «Фін» былі затрыманы, а «Джо», які аказаў узброенае супраціўленне, забіты. Падчас вобыску і на працягу следства амерыканскія разведчыкі «здалі» чатыры парашуты, дзве радыёстанцыі, радыёпрыёмнік, два партатыўныя фотаапараты, сем пісталетаў, тры аўтаматы з патронамі, дзве страляючыя аўтаручкі, тапаграфічныя карты, компасы, сродкі тайнапісу, медыкаменты, яды, 206 тысяч савецкіх рублёў, 4 тысячы злотых, 500 нямецкіх марак... Частка гэтых рэчаў з'яўляецца цяпер экспанатамі Гісторыка-дэманстрацыйнага цэнтра КДБ.

Беларускія контрразведчыкі затрымалі «чацвёрку» яшчэ да пачатку выканання імі свайго задання, а таму «Бэн» і «Фін» былі далучаны да паспяхова праведзенай радыёгульні «Ракета», падчас якой амерыканскім «гаспадарам» было накіравана звыш сарака дэзінфармацыйных радыёграм і атрымана каштоўная інфармацыя аб складзе і структуры амерыканскай разведсеткі на тэрыторыі рэспублікі.

Што датычыцца Баршчэўскага, то спачатку разглядалася магчымасць выкарыстання і гэтага персанажа ў аператыўных мэтах. Але дзесьці праз два гады амерыканскі агент быў асуджаны на 25 гадоў пазбаўлення волі. Цімафея накіравалі на лесапавал у Мардовію. Турэмнае выпрабаванне доўжылася 22 гады. Тры гады Баршчэўскаму «дараваліў» па ўзросце.

...Пасля «адсідкі» Цімафей Баршчэўскі прыехаў у Гомель, знайшоў работу, ажаніўся, адзінага сына назваў у гонар брата, які загінуў на вайне. Увесь наступны час ён, безумоўна, знаходзіўся пад пільным наглядам савецкай спецслужбы. Аднойчы ён атрымаў пісьмо: «Дарагі сябар! Давай сустрэнемся. Мы добра памятаем цябе як дарагога нам Карла...»...

Пасля дасканалых разважанняў Камітэт дзяржбяспекі прыцягнуў Цімафея Баршчэўскага да аператыўнай справы, звязанай з дыпламатамі, якія працавалі ў Маскве. Баршчэўскі ў патрэбны час прыбыў у Маскву, і аднойчы вечарам накіраваўся на сустрэчу з «незнаёмцам» — амерыканскім аташэ Луісам Томасам. Той наблізіўся да Цімафея, спытаў «Вы Карл?», атрымаў станоўчы адказ і са словамі «Унутры знойдзеце неабходныя інструкцыі» перадаў «Карлу» пачак цукерак «Халадок». У гэты момант амерыканскі разведчык і быў затрыманы.

Ва ўпакоўцы «Халадку» сапраўды была схаваная інструкцыя з падрабязнымі ўказаннямі па пошуку тайніка са шпіёнскімі матэрыяламі. Супрацоўнікі пасольства ЗША пацвердзілі імя-прозвішча затрыманай фігуры, а выяўлены пасля шпіёнскі кантэйнер ЦРУ закрыў апэрацыю... на нашу карысць. Як вядома, падзеі затрымання супрацоўніка амерыканскага пасольства, каардавага разведчыка ЦРУ знайшлі адлюстраванне ў кінастужцы «ТАСС упаўнаважаны заявіць»...

Святлана БАРЫСЕНКА.
Фота з архіва КДБ.

На конкурс апавяданняў

Адметнасць гэтага апавядання — ненадакучлівы і арганічны гумар. Гумар, якім поўніцца ўсё наша жыццё. Толькі зрэдку каму ўдаецца зірнуць на сябе збоку. Зірнуць і ўсміхнуцца, як гэта робіць Віктар Варанец з Гродна.

Віктар КАЗЬКО.

Віктар ВАРАНЕЦ

НА БУЛЬБЕ

На кафедры мне з парога аб вясцілі, што выклікае дэкан. Што зробіш, пасля лекцыі я і пайшоў у дэканат. У кабінеце сядзеў сам дэкан, які вельмі падазрона ўзрадаваўся майму візіту.

— Мадэст Пятровіч! Радасць якая, што вы завіталі да нас. Сядайце, калі ласка. Ну як жыццё, даражэнькі?

Я сціпла падзякаваў за клопат.

— Мадэст Пятровіч, у панядзелак вы з групай студэнтаў едзеце ў калгас на бульбу. Два тыдні на свежым паветры, вясковая ежа, лёгкі амурчык... Як я вам зайздрошчу! Рыхтуйцеся.

І ён, хуценька паціснуўшы руку, выціснуў мяне з кабінета.

...Раніцай мы, апошні ратунак калгасаў, стаялі ў фае ўніверсітэта, хвалячыся адзін перад адным гумавымі ботамі і харчовымі прыпасамі. Дарослых было сямёра: тры выкладчыкі і чатыры лабаранткі. Усе з розных кафедраў. Старэйшым з нас па ўзросце лічыўся Фядот Міхалыч — прадстаўнік кафедры фізічнага выхавання. Ён заклапочана падыходзіў да кожнага і строга пытаўся:

— З сабой узялі?.. Там можа не быць.

Усе моўчкі ківалі галавой. Лабаранткі былі нічога сабе. Маладзенькія і даволі прывабныя. Але канчаткова добра разгледзець іх я не паспеў, бо пратрубіў сігнал ад'езду і я пагнаў свой атрад у аўтобус.

Калгас сустрэў нас у асобе няголенага дзядзькі са смярдзючай цыгаркай у роце. Адрэкамендаваўшыся загадчыкам участка, на якім нам давядзецца працаваць, Сымонік (так ён назваў сябе, але было гэта прозвішча ці імя, ніхто так і не зразумеў) правёў кароткую тлумачальную гутарку:

— Студэнты жыць будуць у старой школе, настаўнікі — па хатах. Харчавацца — у клубе, там і кухня ёсць. Што запрацуеце, на тое і з'ясце. Як усё выкапаеце, дык і паедзеце дахаты. Зразумелі?

Мы зразумелі і пачалі размяшчацца. Будынак старой школы служыў прытулкам для многіх, відаць, пакаленняў капачоў. На дашчэнтаваўшыся сценах змяшчалася разнастайная інфармацыя пра каханне, сэнс жыцця і некаторыя элементы інтымна-пачуццёвага самавыяўлення... Апошнім мазком невядомых мастакоў стала выява аголенай жанчыны з надпісам ля ног: «Мне б такую!».

Раптам праз акно ўбачыў нашых лабарантак. Яны весела нешта (або некага?) абмяркоўвалі, кіруючыся да рэчкі за школай. Я вырашыў крыху бліжэй пазнаёміцца з імі. Але тут на маім шляху з'явіўся Фядот Міхалыч, які з ходу прапанаваў правесці агульны сход кіраўніцтва атрадамі. Дзяўчатам давялося вярнуцца назад. Сабраліся ў хаце, дзе кватараваў наш аксакал. Адразу было бачна, што з гаспадыняй ён поўнасцю паразумеўся. Яшчэ маладжавая кабета ўвішна круцілася каля пліты, не-не ды і кідаючы нейкія падазрона масляністыя позіркі на Фядота Міхалыча. Ды той і сам адчуваў сябе па-свойску. Падышоў да гаспадыні, прыабняў яе за магутны стан і небывала пяшчотным голасам запытаў:

— Кацярынка, а ці будзе ў нас што на зуб пакласці?

Нашы лабаранткі чамусьці адразу пачыравенелі. Кацярынка ж, наадварот, кінулася ў камору і хуценька вярнулася з кавалачкам сала і парай салёных агуркоў. Праз хвіліну ўсе ўжо сядзелі за накрытым сталом, запрасілі сесці і Кацярынку. Кожны выцягнуў свае прыпасы. Неўзабаве перад намі ўзвышаліся дзве бутэлькі гарэлкі, адна каньяку, адна самагону і тры віна. Мне зрабілася страшна. Тамадой, зразумела, стаў Міхалыч.

— Піць трэба па нарастаючай, — важна зазначыў ён і адкаркаваў каньяк. Дзяўчаты тут жа запішчалі:

— Нам віна! Мы не п'ём!..

— І правільна, што не п'яце, — пагадзіўся Міхалыч. — Але каб не зняважыць гаспадара каньяку, трэба крышачку пакаштаваць. — І ён разліў бутэльку на ўсіх. Астатнія маўчалі, канчаткова заблытаныя пяняццем «па нарастаючай».

— Стары дзед! — канстатавала Марта і выскачыла з пакойчыка. Я хацеў правесці яе, але ложак быў такі мяккі, а час такі позні, што, перадумаўшы, заваліўся спаць.

Раніцай мяне падняў Міхалыч.

— Ну што? — з нейкай надзеяй запытаў ён.

— Што — што? — перапытаў я.

— З Мартай што? — стары ажно аблізнуўся ад нецярпення.

— Не ведаю. — Я спаць лёг, а яна ж да вас пайшла.

— Дурань! — упэўнена заявіў Міхалыч і, канчаткова страціўшы да мяне інтарэс, выйшаў з хаты.

Калі пасля снедання мы пайшлі са студэнтамі ў поле, трактара з бульбакапалкай яшчэ не было. Значыць, трэба чакаць. Студэнты расцягнуліся па барознах і пачалі кідацца бульбінамі. Я залёг у густую мураву і вырашыў падумаць пра ўчарашняе. Але падумаць не ўдалося: недзе зароў трактар. Пачаўся бульбакоп...

Да абеду мы лёгка выканалі дзённую норму. Дзівіцельны здзіўленнем, трактарыст падышоў да мяне, працягнуў руку і вымавіў:

— Паважаю. З мяне ўвечары літр. А да вечара я як бы з вамі...

І, ускочыўшы ў кабіну, некуды хуценька з'ехаў. За ўдарную працу я абвясціў, што ўвечары будзе ў клубе-сталоўцы дыскатэка. Усе тройчы крыкнулі «ўра», і мы пайшлі на абед. Хутка падцягнуліся і астатнія атрады. Навіна пра вячэрнюю дыскатэку не вельмі ўсцешыла Фядота Міхалыча, бо існазала, на яго думку, пагроза мясцовай інтэрвенцыі. А вось дзяўчатам гэта спадабалася. Яны адразу падляцелі да мяне і запыталіся:

— Мадэст Пятровіч, а для нас будзе асобная дыскатэка, ці мы разам са студэнтамі?

Я важна нахмурыў лоб, адчуваючы, як набываю сярод калег аўтарытэт і непазбежнае з гэтым лідарства.

— Гэта пытанне прапрацоўваецца. Але, мяркую, не будзем адрывацца ад моладзі!

Другі раз за дзень я пачуў радаснае «ўра».

Студэнты зрабілі амаль неверагоднае: з дабітай апаратуры гучала музыка досыць прыстойна, сакаватовыя лямпачкі, пафарбаваныя ў розныя колеры гуашшу, мільгацелі на сценах, а над галавой круціўся нейкі шар, аблеплены кулінарнай фольгай. Палову танцораў складалі госці навакольных вёсак. Усім было весела, у гарачым паветры выразна адчуваўся пах мясцовай самагонкі. Убачыўшы мяне, дыджэй Серж радасна завераш чаў у мікрафон:

— А вось і зачынальнік вясковага дыскатэчнага руху, суровы і вечна малады Мадэст Пятровіч. Вітаем! — уся зала шчасліва зараўла і запляскала ў далоні. — А зараз гучыць павольная эратычная кампазіцыя для нашага дарагога выкладчыка.

Хлопцы і дзяўчаты тут жа прыліпі адно да аднаго і пачалі хістацца на месцы з боку ў бок. А да мяне нечакана падскочыла нейкае маладзенькае дзяўчо і з мілай усмешкай прамовіла:

— А можна вас запрасіць на танец?

Я нават разгубіўся і не паспеў нічога адказаць, але мой адказ і не быў патрэбны. Дзяўчына шчыльненька прылілпа да мяне і стала расхістваць з усё большай амплітудай. Я зразумеў, што ўжо танцую.

— А што вы маўчыце і не забаўляеце даму? — запытала мая партнёрка.

— А я саромеюся дзяўчат...

Дзяўчына весела засмяялася.

— Па вас не скажаш. А мяне, між іншым, Алёнай завуць. А вас Мадэстам Пятровічам. Вы ў нас заняткі вялі ў тым годзе. Але, пэўна, мяне і не памятаеце.

— Памятаю, — не задумваючыся, схлусіў я.

— Не, вы памятаеце Кацьку Бовіну, бо яна з твару на мяне крыху падобная, але ў яе чацвёрты памер бюста, і ўсе выкладчыкі толькі туды і глядзяць, а на твар зрэдку для прыстойнасці.

«Божухна! — падумалася мне. — Няўжо і я толькі туды і глядзеў? Бо той бюст я добра памятаю. Які жах!»

Траскатня Алёны не спынялася ні на хвіліну, і ад гэтага думкі неяк рассейваліся па ўсёй галаве. Дзякуй Богу, скончылася музыка.

З палёгкай уздыхнуўшы, я накіраваўся да дзвярэй.

— А бульбу збіраць нам надакучыла, мы маладзенькага захацелі, мы дзяўчаткам вершыкі чыталі, — загучаў той жа знаёмы з'едлівы голас. Ля акна стаялі Марта з Юляй і іранічна пазіралі на мяне. Я абурыўся.

— А што вы тут робіце? А вячэра? А культурная праграма?

— Усё гатова. Нам толькі захацелася паглядзець, як забаўляюцца дарослыя дзядзечкі!..

...У дзяўчат было спакойна і ўтульна. Ціхенька іграла прыемная музыка, на стале ляжала нейкая смаката, народ выпіваў, закусваў і гаманіў. Маё з'яўленне выклікала вір эмоцый.

— Віват вялікаму арганізатару дыскатэк! — зароў Міхалыч.

— Віват сэксуальнаму маньяку! — падтрымала яго Марта. Усе зарагаталі і дружна выпілі за мяне. Я з ахвотай далучыўся да слоў Міхалыча, абсалютна ігнаруючы злоснае дзяўчо па імені Марта. Больш за тое, я пакрысе пачаў заляцацца да Юлі, клапатліва падкладаючы ёй у талерку розныя закускі і забаўляючы крыху фрывольнымі анекдотамі. Гэтая справа, відаць, мне спадабалася, бо ў хуткім часе я дазволіў сабе нават абняць Юлю за плечы і прашапацець ёй у вуха парачку кампліментаў (прынамсі, мне падалося, што гэта былі менавіта кампліменты). І тут нешта гучна бразнула. Я павярнуў галаву і ўбачыў, што Марты за сталом ужо няма. У пакоі павісла цішыня. Усе чамусьці глядзелі на мяне. Куды мне трэба было глядзець, я не ведаў.

— Даганяй, — нарэшце вымавіў Міхалыч, гледзячы проста ў вочы.

— А чаму я? — нічога яшчэ не разумеючы, запытаўся я. — І што здарылася?

— Некаторыя, здавалася б, разумныя мужыкі ў жыцці дурні дурнямі, — зазначыла Юляна.

Я цяжка ўздыхнуў і выйшаў з хаты. Зорнае неба здавалася халодным і чужым. Навокал панавала прыгнятаючая цішыня, і мне тужліва захацелася ў горад. Вочы паступова прызвычаіліся да цемры, і я разгледзеў каля дрывотні чыюсьці постаць.

«Круглы стол «Звязды»

ТВАРАМ ДА ЦЭНТРА

Рушыць краіна пры вяртанні сталіцы гістарычнага аблічча

Заўсёды, калі падарожнічаю і прыязджаю ў новы горад, іду знаёміцца з ім — гуляю па вулках сярод старых нізенькіх домкоў, якія бачылі шмат таго, пра што потым напісалі ў кнігах. Стары горад заўсёды больш цікавы і ўтульны за сучасныя кварталы — гэта адчуваюць гараджане ў любой краіне. Менавіта па іх, а не па сучасных забудовах, мяркуюць госці пра прыгажосць горада, народа, які іх стварыў, і пра саму краіну.

У старых будынках — напалову разбураных ці яшчэ жывых — ёсць тое, што дазваляе чалавеку спасцігнуць таямніцы часу. І гледзячы на рэшткі замкаў, сядзібаў і домкоў я з задавальненнем думаю пра тое, якое багацце маю. Помнікі гісторыі і культуры нейкім чынам належаць мне і маёй сям'і: магчыма, праца маіх продкаў спрыяла таму, каб квітнелі сядзібы, будаваліся саборы, узнікалі прыгожыя палацы. А іх рэшткі, — помнікі многім пакаленням маіх продкаў таксама.

Так думаю не толькі я — у Беларусі шмат людзей, якія цікавяцца гісторыяй і якія актыўна ўспрымаюць усё, што адбываецца вакол нашых помнікаў, напрыклад, пры рэканструкцыі Верхняга горада ў сталіцы. Іх можна зразумець: усё, што належыць дзяржаве, належыць і кожнаму канкрэтнаму грамадзяніну гэтай дзяржавы. Немагчыма быць вольным ад мінулага сваёй краіны — незалежна ад таго, ці ты краязнаўца, ці настаўнік, ці школьнік, ці чыноўнік, які на дзяржаўнай службе павінен клапаціцца пра захаванне таго, што яму даверылі людзі. Менавіта таму ў рэдакцыі «Звязды» сабраліся асобы, зацікаўленыя ў аднаўленні гістарычнага цэнтра Мінска. Старшыня Добраахвотнага таварыства аховы помнікаў Астаповіч не змог прыйсці і прысутнічаў на «круглым стале» віртуальна. Гэта была яшчэ адна спроба суаднесці пазіцыі ўладных структур і прадстаўнікоў грамадскасці, і хоць гаворка часам перарастала ў дыскусію, менавіта балючыя пытанні дазволілі зразумець, што ў гэтай справе не можа быць супрацьлеглых бакоў ужо хоць бы таму, што ў нас ва ўсіх агульная спадчына.

1. Планы аднаўлення

— Чым кіраваліся, калі выбіралі праект рэканструкцыі цэнтра Мінска?

Аляксандр АНДРОНЧЫК, начальнік упраўлення добраўпарадкавання і гарадскога дызайну Камітэта архітэктуры і горадабудаўніцтва Мінскага гарвыканкама:

У 2004 годзе прыняты Ўказ Прэзідэнта, у якім зацверджаны межы гістарычнага цэнтра, на падставе чаго прынятая комплексная праграма аб яго рэстаўрацыі, рэканструкцыі і развіцці. Гэтая праграма зацверджана пастановай Савета Міністраў. Быў праведзены конкурс на лепшы праект развіцця і рэстаўрацыі гістарычнага цэнтра, пасля распрацаваны дэтальны план, на аснове якога вядуцца ўсе работы. Ён прайшоў грамадскае абмеркаванне ў Мінску, усе маглі даведацца пра гэты праект. Прэзідэнт яго ўхваліў і зацвердзіў. Заказчыкам ўсіх работ у гістарычным цэнтры вызначана «Мінская спадчына» — адказная праца павінна быць у адных руках, інакш вельмі цяжка зрабіць гэта комплексна. Важна, каб атрымалася цэльная карціна, і цэнтр аднаўляўся ў адпаведнасці з заканадаўствам аб ахове гісторыка-культурнай спадчыны.

Дзмітрый БУБНОЎСКІ, намеснік начальніка Архітэктурна-канструктарскай майстэрні № 4 УП «Мінскпраект», галоўны архітэктар праекта дэтальнага плана гістарычнага цэнтра г. Мінска:

У конкурсе на распрацоўку праекта дэтальнага плана ўдзельнічалі некалькі вядучых праектных арганізацый нашай краіны. УП «Мінскпраект», якое выйграла конкурс, атрымала заказ на распрацоўку праекта дэтальнага плана гістарычнага цэнтра г. Мінска. Зважаючы на тое, што вырашэнне праблем комплекснага захавання архітэктурнай спадчыны нашага горада звязана з вырашэннем шэрагу задач вельмі спецыфічнага характару (транспартная праблема, баланс тэрыторыі і г.д.), большасць раздзелаў праекта генеральнага плана распрацаваў інстытут «Мінскграда» на субпадрадзе ў «Мінскпраекта». Ці зняў праект дэтальнага плана ўсе праблемы? На жаль, не. Наступствы рэалізацыі больш ранніх горадабудаўнічых рашэнняў аказаліся вельмі цяжкімі. Гістарычны цэнтр горада Мінска зараз рассечаны асноўнымі магістралямі: вуліца Няміга і Багдановіча з аднаго боку, а з другога — праспект Пераможцаў і вуліца Леніна. Гэты падзел перашкаджае пешаходным сувязям, успрыняццю ансамбля. Значная частка забудовы страчана, што паўплывала на характар асяроддзя. Пэўныя прапановы па пераадоленні становішча, якое склалася ў праекце дэтальнага плана, дадзены. Лічу, што іх рэалізацыя будзе не апошнім, але значным крокам у захаванні і адраджэнні цэнтра нашай сталіцы.

Міхаіл ЖЫХ, галоўны інжынер КУП «Мінская спадчына»:

Гэтая спроба пераўтварыць гістарычны цэнтр — ужо трэцяя для горада Мінска. Першую спробу распрацаваць генеральны план рэканструкцыі горада зрабілі архітэктары адразу пасля вайны, яна аказалася няўдалай: будынкі асноўную ўвагу надавалі магістралям і праспектам. У канцы 70-х гадоў пачатку 80-х была другая спроба, яна часткова закранула забудовы, якія засталіся ў спадчыну. Зраблі Траецкае прадмесце. Прыйшла чарга «Верхняга горада». І нарэшце сучасны крок — гэта першы комплексны падыход у аднаўленні і рэгенерацыі гістарычнага цэнтра горада. Ён вызначыў межы, рэгламенты забудовы, падыходы да аднаўлення старога горада. Спачатку была праведзена лакалізацыя аб'ектаў, якія ўвайшлі ў спіс гісторыка-культурнай спадчыны. Вырашалася, як іх аднаўляць — ці рэстаўраваць, ці рэканструяваць, ці прымяняць і першае, і другое ў комплексе. Далей пайшло такое паняцце, як аднаўленне забудоў. Таму што цэлыя будынкі і кварталы гістарычнага цэнтра ў розныя эпохі былі страчаныя. Мы маем вопыт, як гэта можна аднавіць у адзіным ансамблі. Комплексны падыход прыменены ўпершыню пры аднаўленні цэнтра горада не толькі ў нашай рэспубліцы, але і ў Еўропе ў цэлым. У Варшаве некалі спрабавалі зрабіць рэканструкцыю гістарычнага цэнтра, а зрабілі адно Старое места. У Вільнюсе зрабілі некалькі вуліц і пляцовак. А мы замахнуліся на ўвесь гістарычны цэнтр, пры гэтым маючы каласальныя праблемы з-за транспартных патокаў і другіх накладаў часу.

Антон АСТАПОВІЧ, старшыня Добраахвотнага таварыства па ахове помнікаў:

Калі гаварыць пра планы дзяржавы, то трэба гаварыць пра тыя горадабудаўнічыя і нарматыўныя дакументы, на падставе якіх і павінна праводзіцца праца ў гістарычным цэнтры. Менавіта яны накіраваныя на наданне Мінску еўрапейскага іміджавага ўзроўню. Справа ў тым, як яны выконваюцца.

Уладзімір ПАПРУГА, архітэктар, аўтар альтэрнатыўнага праекта:

Указ Прэзідэнта № 330 у юрыдычным сэнсе з'яўляецца карэктным дакументам. Але пазней прымаліся рашэнні, якія перакрэсліваюць пастаўленыя ў ім задачы. Галоўныя праблемы цэнтра Мінска не ў транспартным патоку, а, мяркую, у спосабе вырашэння праблем. Калі памятаеце, усё пачалося з будаўніцтва «Паркінга» на Нямізе, які дэкларавауся як аб'ект паркоўкі, але насамрэч з'яўляецца гандлёвым комплексам, які не дае гістарычнаму цэнтру ніводнага парковачнага месца, больш за тое, сцягвае сюды дадатковыя транспартныя патокі, якія па ўсіх горадабудаўнічых рэгламентах трэба вывозіць.

Асноўныя палажэнні Канцэпцыі Дэтальнага плана дакладна канстатуюць, што праектныя прапановы скіраваныя на вырашэнне задач скарачэння інтэнсіўнасці транзітнага транспарту і вывад з гэтай тэрыторыі аб'ектаў, якія стваралюць праблемныя сітуацыі. Што ж мы маем у выніку практычнай рэалізацыі? Намеснік дырэктара інстытута «Мінскграда» Я.Л. Ліневіч, з ліста са спробай экспертызы комплекснага праекта рэгенерацыі гістарычнага цэнтра Мінска Таварыства аховы помнікаў, сведчыць, што сёння «працягваецца працэс павелічэння мэтавых транспартных патокаў у гістарычны цэнтр, таму што тут інтэнсіўна размяшчаюцца буйныя грамадскія комплексы». Дзе логіка? Як выконваюцца зацверджаныя дзяржаўныя праграмы?

Калі да 2005 г. 98 працэнтаў усяго транспарту праз гістарычны цэнтр складаў транзіт, то сёння насуперак прынятым рашэнням мы атрымліваем тут мэтавыя транспартныя патокі. Вывесці неўласцівы транзіт з гістарычнага цэнтра не ўяўляе ніякай цяжкасці. «Мінскград» пачаў праектаваць схему транспартнага кальца. Калі б мы сістэмна пайшлі далей гэтым шляхам, то выйшлі б у фармат асваення гістарычнага цэнтра ў нармальным рабочым рэжыме, не парушаючы ні метадалогію, ні Закон. І Мінск мог бы зрабіцца культурнай Меккай.

Бубноўскі: Праектам Дэтальнага плана прыняты цэлы шэраг смелых крокаў у частковым вырашэнні гэтай праблемы. Але ад з'ездаў з праспекта Пераможцаў на Нямігу і на Багдановіча горад пакуль што пазбавіцца не можа. Магчыма, давядзецца прымаць больш радыкальныя рашэнні, і яны будуць звязаныя з намнога больш затратнай часткай. У свой час існавала ідэя зрабіць транспартны пракол пад праспектам Незалежнасці і нават пры будаўніцтве метро была закладзена аснова для таго, каб гэта можна было калі-небудзь ажыццявіць. На жаль, рэалізацыя гэтай задумы звязаная з вялікімі затратамі.

Андрончык: Вядома ж, усе разумеюць, што цэнтр павінен стаць адзіным цэлым, каб яго не рассякалі дарогі, гэта задача на перспектыву. Цяпер мы робім пакуль тое, што можна зрабіць, таму што горад жыве. Прыйдзе час — праколы зробім, ёсць такія прапановы. Але для гэтага патрэбны час. Цяпер, калі закрыць цэнтр, у горадзе будзе калапс.

— Цэнтр Мінска — гэта найперш помнікі, якія захаваліся. Менавіта старое места з'яўляецца гонарам любой еўрапейскай сталіцы, бо па ім бачна, якую гісторыю мае народ. Як тут не думаць пра каштоўнасць кожнага будынка?

Жых: Сапраўды, нам даводзіцца весці працы па рэканструкцыі гістарычнага цэнтра, маючы каласальныя праблемы з-за транспартных патокаў, метро, якія перасякаюць гэтае асяроддзе. І ў гэтых умовах трэба аднаўляць усю інжынерную інфраструктуру, якую неабходна ўлічыць на перспектыву, ўсе аб'екты і забудовы патрабуюць рашэнняў, як забяспечыць іх цеплынёй, электраэнергіяй, і так далей. Узнікае цэлы комплекс пытанняў пры працы з кожным канкрэтным будынкам. Але мы ўжо маем цэлыя плямы ў горадзе, па якіх бачна, што ён аднаўляецца. 13 аб'ектаў гісторыка-культурнай спадчыны ўжо адноўлены пасля зацвярджэння праекта Дэтальнага плана. 47 аб'ектаў знаходзяцца на розных стадыях інвестыцыйнага цыкла.

Папруга: Галоўная задача аховы спадчыны — дбаць пра тое, каб яна была перададзена наступным пакаленням ва ўсім багацці яе аўтэнтычнасці. Назавіце хоць адзін аб'ект з сённяшніх 47, які падпадае пад выкананне гэтай задачы? Стары Мінск часткова быў знішчаны ў асноўным у 70-я гады са зносам Нямігі, але і да 2005 года гэтая тэрыторыя ўтрымлівала сведчанні гісторыі — у падмурках, у гістарычнай планіровачнай структуры вуліц, аўтэнтычнай забудове і археалогіі. Гэта і ёсць апірышча для правядзення аднаўленчых работ. Але менавіта ўсё пералічанае без ніякага вывучэння і навуковай фіксацыі вось ужо трэці год вывозіцца на сметнік, «вызваленая» ж прастора запаўняецца аб'ектамі, якія не маюць нічога агульнага з дзеяннямі, дазволенымі законам у дачыненні да гісторыка-культурных аб'ектаў. Нашая сённяшняя сталіца старэйшая за Варшаву, за Маскву, за Вільнюс, за Берлін. Калі не ўвесці працэс сённяшняга аднаўлення ў прававое поле, у нас не будзе надалей ніякіх аргументаў, каб пераканаць у гэтым нават саміх сябе. Дагэтуль няма ні гісторыка-архітэктурнага апорнага плана, ні зацвярджаных ахоўных зонаў, не робіцца навуковая фіксацыя таго, што сотнямі самазвалаў штодзённа адсюль вывозіцца, ні стратаграфіі падмуркаў былой тут колісь высокашчыльнай гарадской забудовы, ні іх геадэзічнай прывязкі. Знішчаецца нават тэарэтычная мажлівасць далейшага вывучэння гістарычна-планіровачнай структуры Мінска ва ўсе часы ягонага існавання. У выніку, мы атрымаем на гэтым месцы чыстае поле ў гістарычным сэнсе.

Бубноўскі: У склад горадабудаўнічага праекта была ўключана даволі падрабязная гістарычная даведка, якая ахоплівала практычна ўсю тэрыторыю гістарычнага цэнтра: быў зроблены гістарычны зрэз, выяўлена, дзе была якая пляцоўка, чыя на ёй была маёмасць, якія пабудовы існавалі, што з іх захавалася. Праведзена інвентарызацыя забудовы: прызнана, што пэўныя аб'екты з'яўляюцца цікавымі, а ад пэўных навабудаў, якія скажаюць асяроддзе, давядзецца пазбаўляцца з цягам часу. На гэтым кампетэнцыя дэтальнага плана канчаецца і далей наступае праектаванне па кожным з аб'ектаў рэстаўрацыі, альбо па аднаўленні страт. Калі называць рэчы сваімі імёнамі, названае аднаўленне усё ж адносіцца да новага будаўніцтва. Тым не менш, без яго абсалютна не магчыма аднавіць характар забудовы, які сам па сабе — бясспрэчная каштоўнасць. Правядзіць гэтую работу на сто працэнтаў артадаксальна ў горадзе Мінску складана. Узяць хоць бы да ўвагі прыклад разбуранай Нямігі. Сённяшняя праезная частка вуліцы пракладзена па фронце былой забудовы. Аднавіць яе літаральна на сваім месцы немагчыма. Даводзіцца шукаць іншыя варыянты. Паўсюдна прынятая працэдура выканання работ (комплексныя навуковыя даследаванні — навукова абгрунтаваны праект — рэстаўрацыя, рэканструкцыя, з адаптацыяй для далейшага выкарыстання) праводзіцца ў дачыненні да кожнага канкрэтнага аб'екта. Калі працуеш з канкрэтным аб'ектам, то ў працэсе работы выяўляюцца пэўныя дадатковыя звесткі, больш дэталёва вывучаецца тэхнічны стан. З-за нездавальняючага тэхнічнага стану архітэктарам часта даводзіцца прымаць непапулярныя рашэнні.

«Круглы стол» правяла Ларыса ЦІМОШЫК. Фота Валерыя КУДРАКОВА.

(Працяг будзе).

У песнях застанёмся мы

ПЕСНЯ ПРА МІНСК

Гэты горад арганічна ўвайшоў у жыццё Ігара Лучанка. Тут ён нарадзіўся (тады бацькі жылі на Чэрвеньскім тракце — цяпер вуліца Маякоўскага; дзяцінства правёў у Мар'інай Горцы). Потым тут вучыўся, працаваў, ажаніўся. У Мінску шырока разгарнулася яго творчая дзейнасць.

Плошча Свабоды — знакавая мясціна для Ігара Міхайлавіча. Усё на ёй авеяна музыкай. І яго асабістай. Ён паспяхова закончыў гімназію-каледж пры Акадэміі музыкі. У Белдзяржкансерваторыі (цяпер Акадэмія музыкі) авалодваў майстэрствам кампазіцыі (дыпломная работа — кантата «Курган»), выкладаў, узначальваў педагагічны калектыў. На плошчы месціцца Саюз кампазітараў, якім даводзіцца мудра кіраваць з 1980 года. Чароўна ажыўляе гістарычную прастору цэнтра сталіцы мелодыя з «Песні пра Мінск», якая гучыць перад боем курантаў мінскай ратушы. Яна ўспрымаецца як шчырая ўдзячнасць мінчан кампазітару за яго нястомную працу, за яднанне народаў...

Песня стваралася ў 1975 годзе, калі рыхтавалася музычнае афармленне радыёспектакля «Мінскі напрамак» па аднайменным рамане Івана Мележа. Тады малады кампазітар пазнаёміўся з народным паэтам Піменам Панчанкам. Іх сумесная глыбокапатрыятычная «Песня пра Мінск» атрымала шырокае прызнанне. Дружба таленавітых творцаў выявілася ў новых песнях — «Рабінавы гай», «Жытнёвы звон».

...Горад, як і людзі, жыве, захапляецца, любіць. І ў яго жыцці, любові прыкметна адчуваецца стваральная дзейнасць Ігара Лучанка.

Міхась ШАВЫРКІН.

Музыка Ігара ЛУЧАНКА
Верш Пімена ПАНЧАНКІ

У дні бяды і ў ранак Перамогі,
У дні, калі ты харашэў і рос,
Усе твае надзеі і трывогі
Я ў сэрцы нёс, я ў сэрцы нёс.

Прыпеў:

Мой родны Мінск,
Пад небам жураўліным
Жыві, квітней
пад зоркай залатой,
Ты для мяне на ўсёй зямлі
адзіны,
Цябе люблю я ўсёй душой.

Я да цябе з усіх дарог вярнуся,
Мая тут партызанская сям'я.
Ты мне прабач, калі я зажуруся
Ля Вечнага, ля Вечнага агня.

Прыпеў.

Спакойнае дзяцей
тваіх дыханне.
Шумі над іх калыскаю ліствой.
Маё ты ранне і маё каханне
І вечар сіні-сіні мой.

Прыпеў.

Анатоль Бутэвіч узнагароджаны ордэнам Кірылы Тураўскага

Вядомы літаратар, перакладчык, краязнаўца, аўтар гістарычных кніг і кніг для дзяцей Анатоль Бутэвіч за працу і заслугі перад Праваслаўем і ў сувязі з 60-годдзем узнагароджаны ордэнам святіцеля Кірылы Тураўскага II ступені, адной з высокіх узнагарод Беларускай праваслаўнай царквы.

У няпростыя 90-я гады Анатоль Бутэвіч, займаючы высокія дзяржаўныя пасады старшыні дзяржкамітэта па друку, міністра інфармацыі, міністра культуры і друку, аказваў дапамогу Беларускай праваслаўнай царкве ў набыцці кніг богаслужэбнага прызначэння, садзейнічаў адраджэнню духоўнага жыцця краіны, аднаўленню храмаў. Родам з вёскі Вялікая Ліпа ў Нясвіжскім раёне, ён у 2004—2005 гадах арганізаваў збор ахвяраванняў на аднаўленне званоў для Свята-Пакроўскай царквы XVIII стагоддзя, у якой калісьці маленькім дзіцем быў ахрышчаны, і ў якой на пачатку XX стагоддзя быў ахрышчаны будучы архіепіскап Буэнос-Айраскі Афанасій (Мартас). Сродкі на адзін са званоў Анатоль Бутэвіч ахвяраваў асабіста. Дзякуючы яго намаганням у Вялікай Ліпе была адрамантавана і сама званіца, вельмі рэдкага раннехрысціянскага тыпу. Анатоль Бутэвіч актыўна ўдзельнічае ў асветніцкай дзейнасці Праваслаўнай царквы, ахвотна адгукаецца на любыя звароты аб дапамозе ў справе духоўнага адраджэння.

Вольга МЯДЗВЕДЗЕВА.

Старэць не трэба!

...Гэта не байка, гэта насамрэч было. Сустрэліся неяк былыя калегі. Як водзіцца, высветлілі, хто дзе цяпер, успомнілі, як працавалі раней, за лепшым часам, пакрытыкавалі гэты... Неўпрыкмет размова перайшла на так званыя свецкія тэмы. Сярод іх, як вядома, бездакорныя тры — надвор'е, хатнія жывёлы і, зразумела ж, дзеці. Вось адзін з калег і расказаў, як ён дачку пацешыў. А потым — яна яго.

Купіў ён, значыць, малой набор дзіцячай касметыкі. Даўно прасіла. І вельмі ж рада была!..

Але ж радавацца адной — зусім нецікава, таму падарунак, назаўтра ж, трэба было занесці ў садок.

Усю дарогу туды бацька вёў, так бы мовіць, растлумачальную работу. Казаў, што духамі можна «падзяліцца» з сяброўкамі — папырскацца ўсім, а вось памада — гэта вельмі індывідуальна. Інакш...

Пра вірусы малой расказаў, пра магчымасць заразіцца герпесам ці іншай хваробай. Спытаў нарэшце:

— Усё зразумела?

— Усё, — адказала дачка.

Вечарам ён забіраў яе з садка. Па дарозе быў час пагаварыць — высветліць, як прайшла «прэзентацыя» яго падарунка, ці спадабаліся дзяўчаткам духі, ці прасілі яны пакарыстацца памадай?

— Прасілі, — прызналася малая.

— І ты ж ім растлумачыла, чаму нельга?

— Не, я сказала, што... ты не дазволіў.

У бацькі аж дух заняло.

— Але ж я табе столькі тлумачыў, хацеў, каб ты разумніцай была, каб ты ўсё ведала, каб іншых вучыла...

— А наша выхавацелька нам сказала: «Хто шмат будзе ведаць, — хутка састарэе... Татачка, мне гэта трэба?!»

«Не», — падумаў бацька...

А вось ці згадзіўся, не ведаю.

Наталля Шведава, *г. Мінск*

Бландзінка па выкліку

Так здаўна павялося — нехта працуе, нехта — гэту працу правярае. Што, магчыма, і не шкодзіць, калі, зразумела, у меру...

Я адзін час рэвізорам быў — разам з калегамі, лічы, усю краіну аб'ездзілі. Прыязджалі, як правіла, на тыдзень-другі, спыняліся то ў гарадскіх, то ў ведамасных гасцініцах, днём працавалі, вечарам — зрэдку хадзілі кудысь (у тэатры, кіно, на канцэрты...), а найчасцей — сыходзіліся ў некага з нашых, вячэралі, разам глядзелі тэлевізар, чыталі газеты, гулялі ў шахматы ці карты...

Як цяпер помню вечар, калі ў нумар нам пазванілі і ў першы раз запыталі, ці не патрэбны дзяўчаты? «Не!», — сказаў тады самы старэйшы (яму за 60 было, яры партыец) і кінуў слухаўку, ну як апёкшыся.

А мы ж маладзейшыя, Казімір — гаспадар таго нумара — нават не жанаты яшчэ, нам цікава...

Карацей, калі тэлефон яшчэ раз зазваніў, трубку зняў халасцяк — стаў як бы жартам распытваць, а якія там дзяўчаты, а колькі ім гадоў, а ці ёсць сярод іх бландзінка, стаў (мы ж чуем усё) на «паслугі» цэны збіваць.

Тут ужо начальнік наш не вытрымаў, спалохана залапатаў:

— Ты што, зусім звар'яцеў?! Табе гэта трэба?!.

— Не, — адказаў Казімір (яму). А ў трубку (смехам — не смехам?) — Ну-у, разумееце, я тут не адзін...

Мы з сябрамі зараз параімся, падумаем... Пазваніце пазней.

Думаць, зразумела ж, ніхто не збіраўся, але пагаварылі. Нехта паўздыхаў на тэму «да чаго дайшло!», нехта проста зубы паскаліў. Але доўжылася гэта зусім нядоўга. Бо гаспадар раптам сказаў, што ўзяў з сабой новыя нарматыўныя акты, што трэба яшчэ раз іх прагледзець, бо заўтра могуць спатрэбіцца.

Тут жа ён выцягнуў папку з папярамі, ручку, заклапочаны сеў за стол. Мы, як людзі выхаваныя, не маглі яму перашкаджаць — развіталіся, выйшлі з яго пакоя.

Але ісці па сваіх зусім не хацелася, — спусціліся ў кафэ, заказалі піва. За ім не помню ўжо, хто канкрэтна, падаў ідэю пажартаваць, разыграць «адшчапенца».

Для гэтага нам амаль нічога не трэба было: за суседнім столікам убачылі дзвюх дзяўчат, пазнаёміліся і адну з іх угаварылі пазваніць Казіміру ў нумар, сказаць: «Вы хотели юную блондинку?.. Через пять минут она будет! Открывайте дверь!.. Раздевайтесь...».

Хвілін праз пяць пасля гэтага званка ў... прыадчынены нумар калегі пацяху зайшоў... наш начальнік.

А потым ужо і мы — трэба ж было пасмяяцца.

І. Кулік, *г. Мінск*

Жабы квакалі...

Не вам казаць: ёсць на свеце людзі, якіх хлебам не кармі, дай нешта выведаць-пачуць, дай тую навіну ды па свеце панесці. Сяброўка ў мяне такая... У маленстве была. Любіла пасакатаць. Пакуль адвучылі...

Было гэта даўно і акурат такою ж парою. Стыхія ў нас разгулялася — гром, маланкі, вецер. Ды такі... Маладыя дрэвы ламаліся, як запалкі, старыя — вырывала з карэннямі, з дахаў зносіла стрэхі, з вокнаў ляцелі шыбы. На нашым падворку (потым убачылі) дашчэнту разбурыла пуню, палажыла сад. Але найстрашней было, як зрывала страху з хаты... Усё, здавалася, канец свету!

Але ж ён, як вядома, тады не наступіў — жыццё працягвалася. У вёску для ліквідацыі наступстваў прыслалі вялікую брыгаду маладых лесарубаў. Днём яны працавалі, вечарам — прыходзілі ў клуб.

Нам, падлеткам, ну зразумела ж, цікава было, хто там каго запрашаў на танцы, хто з кім шаптаўся-«ціскаўся», хто каго праводзіў дадому. Але ж каб пайсці сачыць бы падслухоўваць... Я да гэтага ніколі не дадумалася б, — сакатуха тая падбіла. Сказала: «Давай паглядзім, як нашу Соню дамоў павядуць?».

Каб каго іншага, мне, відаць, нецікава было б. А Соня — гэта ж наша аднакласніца (хоць і пераросток), а ўжо двоечніца... «Пра што з ёй можна гаварыць? Хто яе можа праводзіць?» — думала я.

Танцы між тым адшумелі, і пражаны знайшоўся — паплёўся ля Соні поруч...

Мы — назіркам, подбегам — следам. Адно — далекавата, размоў не чутно... Але ж вось нарэшце пара спынілася. Мы таксама: сядзім за кустом бузіны, ад напружання аж вушы трашчаць — так баімся што прапусціць.

Але праважаты маўчыць — і пяць хвілін, і дзесяць. Соня таксама.

А ноч — вам не перадаць — цёплая-цёплая, зорная-зорная, ціхая...

— Жабы квакаюць, — выдаў нарэшце хлопец.

— Ну-у, — згадзілася Соня.

Зноў наступіла маўчанне. «І гэта ўсё?!» — расчаравана зашаптала сяброўка.

Смех распіраў нам грудзі, але мы маўчалі, мы — чакалі, бо бачылі, што кавалер той стаў неяк нервавацца, заклапочана таптацца на месцы, пазіраць вакол.

— Ну ўсё, разыходзімся, — нарэшце выдаў ён.

— Ы-гы, — згадзілася Соня.

А далей?..

Далей — матлянулася ў бок яе светлая сукенка, побач з намі пачуліся цяжкія мужчынскія крокі.

Сэрцы зайшліся ад жаху — прыб'е ж абаіх... Мы прыгнуліся, мы, здаецца, «ураслі» ў крапіву, але марна?!. Хлопец... заўважыў нас?!. Стаў (лічы, побач!), шумна ўздыхнуў і... На куст бузіны зусім побач з намі... паліўся струмень вадкасці.

Як мы ўсхапіліся, як ляцелі-пішчалі, пісаць не буду, а вось пра тое, што не трэба сунуць нос туды, куды не просяць — гэта калі ласачка. А тым больш у любімай рубрыцы любімай газеты.

М.Л. *Бярэзінскі раён*

А чаго міргала?

Моладзь гэтую песню, напэўна, не чула, а вось людзі старэйшыя — нават спявалі. Больш за тое — дагэтуль, мо, помняць яе пяшчотнае, яе шматзначнае «И кто его знает, чего он моргает?».

Хоць там, ну згадзіцеся, яно зразумела (і чаго міргае, і чаго ўздыхае)! Какецтва адно, песня... А вось тут — жыццё.

У нашай вёсцы бяседа неяк была. За сталом адзін насупраць другога баба і мужык сядзелі. Абое ў гадах ужо. Яна — адзінокая, мажная, ён — сямейны, глухаваты, картавы і ростам мо, з метр (на канькох і ў зімовай шапцы).

Такі вось «прынц». Не дацкі. Але ж на сябе, ды збоку ён, мусіць, ніколі не глядзеў?

Глядзеў — прынамсі ў той вечар — перад сабой. А там — жанчына... Адзінокая. Прывабная — як на яго думку. Як на яе — стомленая да стану ніякасці, а ўжо спрацаваная!.. Ды і час не ранні... Карацей — стала яна носам кляваць, а вочы пры гэтым не-не ды і лыпнуць — самі па сабе.

«Метр», між тым, паглядае...

«Вой, няёмка як перад людзьмі, — падумала жанчына, позірк яго злавіўшы. — Пайду я лепей дамоў ды лягу ўжо. Чаго тут сядзець?».

Устала яна, пайшла. А «прынц» і тое, як яна глянула, і тое, што ўстала, па-свойму зразумеў: цішком ад жонкі вырабіўся з той гулянкі і за ёю, следам (разам жа нельга — канспірацыя)... Не на многа адстаў: кабета толькі ў хату зайшла, толькі павярнулася, каб дзверы зачыніць ды распранацца, — на табе — «прынц» на парозе. Хуценька (нельга ж часу губляць) свой маленькі картузік кідэц на цвік, туды ж, пад вешалку, свой пінжачок. І за дзяжку ўжо...

Жанчыне, знячэўку, мову адняло. Пытае потым:

— Чаго ты?

— Чахо? Чахо? — бадзёра перапытвае ён, — а чахо мархала... Тахо!

— Ах жа ж ты...

Не будзем паўтараць, што яму сказала кабета, бо не так гэта і важна. Важна, што «прынц» той вылецеў з хаты, як корак з шампанскага.

А следам, як ні сумна гэта гучыць, яго маленькі пінжачок і такі ж маленькі картузік.

А. Барысевіч, *г. Масты*

Рубрыку вядзе Валянціна ДОЎНАР.
Ад яе ж заўсёднае — пішыце!

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА
на право заключения договора аренды земельного участка для размещения объекта строительства

Наименование предмета аукциона	Право заключения договора аренды земельного участка для создания туристско-этнографического центра
Арендодатель земельного участка	Пинский районный исполнительный комитет, Брестская область, г. Пинск, ул. Днепровской флотилии, д. 21 тел. 35 38 81
Адрес земельного участка/ Кадастровый номер земельного участка	Брестская область, Пинский район, Городищенский с/с, 1,1 км юго-западнее дер. Кривичи/125482500001000043
Размер (площадь) земельного участка, га	0,9993
Срок аренды земельного участка, лет	50
Целевое назначение земельного участка	для создания туристско-этнографического центра юго-западнее дер. Кривичи, (паркинг, сувенирный киоск)
Характеристика расположенных на участке инженерных коммуникаций и сооружений	Участок свободен от строений и сооружений и мелиоративных каналов. Подъезд к участку предусматривается по существующей дорожной сети. Установлены ограничения в использовании земельного участка на всей площади в водоохранной зоне и прибрежной полосе реки Припять.
Начальная цена предмета аукциона, руб.	89 172 980
Размер задатка, руб.	8 917 300
Условия, предусмотренные в решении об изъятии земельного участка для проведения аукциона:	1. право вырубки древесно-кустарниковой растительности и реализации древесины, получаемой от вырубки, в установленном порядке; 2. внесение победителем аукциона платы за право заключения договора аренды земельного участка; 3. возмещение победителем аукциона расходов, связанных с проведением аукциона и формированием земельного участка, в том числе с государственной регистрацией в отношении создания земельного участка. 4. заключение победителем аукциона с арендодателем договора аренды земельного участка и осуществления в 2-месячный срок после принятия решения арендодателем о предоставлении ему земельного участка государственной регистрации на земельный участок; 5. получение победителем аукциона в установленном порядке разрешения на проведение проектно-изыскательских работ и разработки строительного проекта на строительство объекта в срок, не превышающий 2-х лет; 6. осуществление строительства объекта в сроки, определенные проектно-сметной документацией.
Организатор аукциона	***Фонд «Брестоблимущество», г. Брест, ул. Ленина, д. 11, тел.: (0162) 23 44 06, 23 12 63, 20 87 85 www.brest-region.by, e-mail: fond@brest-region.by***

Повторный аукцион состоится **29 августа 2008 года** в 11.00 по адресу: г. Брест, ул. Ленина, 11, каб. 524 (здание облисполкома).

Для участия в повторном аукционе приглашаются юридические лица всех форм собственности и индивидуальные предприниматели. Участнику необходимо подать заявление на участие в аукционе по установленной форме и подписанное соглашение с фондом «Брестоблимущество». **Лица, желающие принять участие в аукционе, к заявлению прилагают:** заверенные банком копии платежных поручений:

- о внесении суммы задатка на р/с 3642202530011 Головной филиал по Брестской области ОАО «Белинвестбанк», код банка 823, получатель платежа – фонд «Брестоблимущество», УНН 200020538;

- о внесении специального сбора за подачу заявления на участие в аукционе в размере 4 базовых величин и платы за регистрацию участников аукциона в размере 0,5 базовой величины на р/с 3600201000015 филиал № 100 ОУ ОАО «АСБ «Беларусбанк», код 246, назначение платежа 03107, УНН 200300543, получатель платежа – финансовое управление Брестского облисполкома;

индивидуальным предпринимателем – копия свидетельства о государственной регистрации индивидуального предпринимателя без нотариального засвидетельствования;

представителем индивидуального предпринимателя – нотариально удостоверенная доверенность;

представителем или уполномоченным должностным лицом юридического лица Республики Беларусь – доверенность, выданная юридическим лицом, или документ, подтверждающий полномочия должностного лица, копии устава и свидетельства о государственной регистрации юридического лица без нотариального засвидетельствования, документ с указанием банковских реквизитов юридического лица;

представителем или уполномоченным должностным лицом иностранного юридического лица – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть произведена в течение года до подачи заявления на участие в аукционе) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский или русский язык, легализованные в установленном порядке доверенность или документ, подтверждающий полномочия должностного лица, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский или русский язык;

представителем иностранного гражданина – легализованная в установленном порядке доверенность, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский или русский язык.

При подаче документов на участие в аукционе индивидуальные предприниматели, представители индивидуальных предпринимателей и юридических лиц, уполномоченные должностные лица юридических ли

Адкрытае акцыянернае таварыства «Лесахімік»

«У НАШЫМ ГОРАДЗЕ ПРОЙДЗЕ ДЗЕНЬ ПІСЬМЕНСТВА. І МЫ ТАКСАМА МАЕМ ДА ГЭТАГА ДАЧЫНЕННЕ»

Так зазначаюць у барысаўскім ААТ «Лесахімік»

Каб даведацца пра тое, чым займаюцца (што выпускаюць, што прапануюць спажыўцам) у адкрытым акцыянерным таварыстве «Лесахімік», якое знаходзіцца ў Барысаве, дастаткова зазірнуць у візітную картку каго-небудзь з яго кіраўнікоў. У ёй, акрамя традыцыйнага нумара тэлефона яе ўладальніка ды адраса прадпрыемства, таксама шырокі пералік яго прадукцыі. Чытаем: каніфоль хваёвая, шкіпінар жывічны, клей каніфольны, сальвент, нефрас, вадкасць аўтамабільная ахаладжальная «Тасол А-40», антыфрыз, вадкасць шклоабмыўная, пакост (олифа), антысептык біяахоўны, пераўтваральнік іржы, лакі і фарбы і г.д. Такім вось чынам прымусілі на прадпрыемстве служыць агульнай справе нават звычайную візітную картку.

Прадпрыемству «Лесахімік» у наступным годзе споўніцца 80 гадоў. А калі браць за кропку адліку час пачатку яго ўзвядзення, то юбілей можна святкаваць ужо сёння. У 1928 годзе пачалі ўзводзіць яго. І менавіта як завод цяперашняга накірунку — каніфольна-шкіпінарны, прычым з вельмі характэрнай для таго часу назвай «Беларускі батрак». Як колішні «батрак» адчувае сябе цяпер? «Мяркуйце самі», — адказаў на гэта намеснік дырэктара прадпрыемства па ідэалагічнай рабоце Уладзімір Касцюкевіч, паказваючы дыяграму развіцця прадпрыемства па гадах, у якой быў асобна выдзелены 2002 год. Гэта год, які папярэднічае прыходу сюды новага кіраўніка; яго лічбы і паказваюць, што было тады і што цяпер. Пасля гэтага года, які заваршае сабой адносна нялёгкую паласу жыцця калектыву (гэта быў перыяд спаду ў рабоце прадпрыемства), — высокія паказчыкі бесперапыннага росту.

За кошт чаго пераламалі тут указаную сітуацыю, якая склалася, і, увогуле, чаму яна склалася?

Добра вядома, рынак патрабуе хутка рэагаваць на тыя або іншыя абставіны, аператыўна знаходзіць найбольш запатрабаваныя на дадзены момант і найбольш рэнтабельныя віды прадукцыі... На самым пачатку 2000-х гадоў на прадпрыемстве склаліся не зусім добрыя справы з вытворчасцю пакосту, аднаго з асноўных відаў прадукцыі. Але ўжо адразу пасля прыходу сюды новага кіраўніка была праведзена рэарганізацыя вытворчасці, на патоку прадпрыемства з'явіліся зусім новыя віды прадукцыі, не ўласцівыя для яго. І асноўнымі з гэтых відаў сталі смолы, якія мелі вельмі добры попыт у вытворцаў фанеры, а таксама самыя розныя патрэбы народнай гаспадаркі: каніфоль для шыннай і каўчуковай прамысловасці, папяровай, гумавай, лакафарбавай і іншых вытворчасцяў, шкіпінар — для медыцыны і фармацэўтыкі, для прымянення яго ў якасці сыравіны ў арганічным сінтэзе) быў вызначаны як асноўны; асноўным застаецца гэты накірунак і цяпер. А барысаўскі «Лесахімік» з'яўляецца ў гэтым плане адзіным прадпрыемствам у рэспубліцы і самым буйным у СНД. У прыватнасці, на ім цяпер выпускаюць за год каля 5 тысяч тон каніфолі, а прадпрыемствы СНД (у Расіі і ва Украіне) усе разам атрымліваюць яе ў колькасці да 3 тысяч тон. Барысаўскае

вытворцаў драўнянастружкавых і драўняна-валакністых пліт, у ліцейнай вытворчасці, машынабудаванні. На «Лесахіміку», як расказваюць тут цяпер, сумесна з работнікамі заводскай навукова-даследчай лабараторыі вельмі хутка распрацавалі тэхналогію вырабу гэтых смол, прапанавалі іх дрэваапрацоўшчыкам рэспублікі. Тыя добра прынялі іх, і цяпер на прадпрыемстве вырабляюць гэтага прадукту да 2 тысяч тон за месяц; з ім барысаўчане выходзяць нават на рынкі суседніх краін.

* * *

А ўвогуле, нягледзячы на прысутнасць на прадпрыемстве «хіміі», тут стаіць вельмі прыемны водар хваёвага лесу... Як зазначана ўжо, на прадпрыемстве вырабляюць каніфоль і шкіпінар, а іх атрымліваюць пры перапрацоўцы добра вядомай хваёвай жывіцы. Адсюль, зразумела, і гэты здаровы хваёвы водар, які напаўняе тэрыторыю прадпрыемства. Словам, каб атрымаць добры зарад бадзёрасці, не трэба і ў лес ехаць. А ўжо само слова якое прыгожае — «жывіца»...

* * *

На прадпрыемстве ўжо з самага пачатку накірунак на перапрацоўку жывіцы і атрымманне з яе каніфолі і шкіпінару (а яны ідуць на прадпрыемства ўстойліва трымаецца і працуе, нягледзячы на жорсткую канкурэнцыю з боку вытворцаў з Кітая і Інданезіі, нягледзячы на ўсе размовы аб стварэнні штучных жывіцы і каніфолі, прычым каля паловы каніфолі і каля 80 працэнтаў шкіпінару экспартуе.

Начальнік каніфольна-серпентыннага цэха Міхаіл Ісаевіч падрабязна расказаў пра пэўныя асаблівасці тэхналагічнага працэсу, падчас якога тут і атрымліваюць зазначаныя прадукты, але, напэўна, самым важным месцам ва ўсёй гэтай справе з'яўляецца работа ў лесе, або падсочка дрэў і збор жывіцы. Да 1,5 кілаграма можа даць яе адно дрэва за сезон, які доўжыцца з чэрвеня да снежня; штодзённа 78 кілаграмаў яе павінен сабраць нарыхтоўшчык (7 тон за год). Каб «Лесахімік» атрымаў за год (дакладней — за сезон) для перапрацоўкі свае 6—7 тысяч тон жывіцы, каля 5 мільёнаў дрэў трэба падсочыць, за сезон неаднаразова абысці іх, зліць з жывіцапрыёмнікаў буртышнавы водар... Жывіцу для прадпрыемства нарыхтоўваюць у асноўным леспрамгасы, разам з тым каля 30 працэнтаў яе збірае яно само, мае пры гэтым тры свае вытворчыя ўчасткі (Барысаўскі, Слабадскі — каля Жытковічаў і Ганцавіцкі), на якіх жывіцу нарыхтоўваюць каля 300 чалавек. Гэта, як правіла, жыхары вёсак. Яны пры гэтым уваходзяць у штат прадпрыемства. Такім чынам, тут мы маем і свайго кшталту ўклад яго ў рэспубліканскую праграму развіцця малых гарадоў і населеных пунктаў.

— Вельмі нялёгкая ў гэтых людзей праца. Трэба падысці да кожнага дрэва, нарэзаць на ім падсочку, устанавіць жывіцапрыёмнікі, потым рэгулярна абыходзіць іх. А самі дзялянкі, на якіх ідзе здабыча жывіцы, звычайна знаходзяцца далёка ад вёсак. У цэлым увесь гэты працэс вельмі працаёмкі, — зазначае кіраўнік прадпрыемства Валянцін Шкаруба.

— Але ці можна адмовіцца ад гэтага цікавага старажытнага рамяства, якое да таго ж прыносіць пэўны даход?.. Нягледзячы на тую ж вельмі жорсткую канкурэнцыю ў гэтай справе з боку вытворцаў Кітая і Інданезіі, мы, тым не менш, займаем свой сегмент рынку і няблага адстойваем яго. Нашы асноўныя канкурэнты яўна дэмпінгуюць на гэтым рынку, мы ж імкнёмся забяспечыць канкурэнтаздольнасць нашых прадуктаў за кошт іх высокай якасці. І гэта добра бачаць нашы спажыўцы, якія, здараецца, выкарыстоўваюць нашу каніфоль для таго, каб разбавіць ёю каніфоль, узятую ў іншых вытворцаў — нашых канкурэнтаў і такім чынам палепшыць якасць апошняй. Увогуле, мы цвёрда прытрымліваемся наступнага прынцыпу: добрае танным не бывае. Мы не ідзём па шляху патаннення прадукцыі, а дабіваемся таго, каб перш за ўсё яна поўнасцю адпавядала ранейшым жорсткім ДАСТам. Пры гэтым добра разумеем: рынак ёсць рынак, таму ўсяляк імкнёмся зменшыць нашы выдаткі, знізіць сабекошт сваёй прадукцыі. Перад калектывам пастаўлена задача: за гэты год мець гэтых выдаткаў на 10 працэнтаў менней.

* * *

Аднак час па-сапраўднаму прадставіць нашага суразмоўцу. Валянцін Уладзіміравіч Шкаруба ўзначаліў прадпрыемства «Лесахімік» у красавіку 2003 года. Да гэтага, пасля заканчэння тэхналагічнага ўніверсітэта, 18 гадоў працаваў на прадпрыемстве «Барысаўдрэў», быў тут майстрам, начальнікам цэха; атрымаў адначасова яшчэ адну вышэйшую адукацыю — ва ўніверсітэце народнай гаспадаркі. Валянцін Уладзіміравіч паважае ініцыятыўных, адказных людзей, на якіх, зразумела, і абапіраецца ў сваёй рабоце. А яшчэ ён — актыўны прыхільнік здаровага ладу жыцця; мае чорны пояс каратэ, з'яўляецца майстрам спорту па рукапашным баі. Словам, аргументаў у яго болей чым дастаткова, каб навучыць розуму якога-небудзь буяна або выпівоху. Але на ўзбраенні ў кіраўніка, як і належыць, — чыста моўныя аргументы, аргументы пераканання...

— 7 верасня наш горад сустракае гасцей, якія прыедуць да нас на Дзень пісьменства, як вядома, сёлета месцам правядзення гэтага дня выбраны менавіта Барысаў, — на самым пачатку гутаркі зазначыў Валянцін Уладзіміравіч. — Гэта — вялікі гонар для нашага горада і ўвогуле для яго кожнага жыхара, для яго працоўных калектываў. Зразумела, трэба прывесці яго ў належны выгляд, трэба годна сустрэць нашых гасцей. Разам з гарадскімі службамі вялікую работу па добраўпарадкаванні горада праводзяць і непасрэдна самі прадпрыемствы, у тым ліку і наша. Як бы складана ні было, выдзяляем сродкі. Вы звярнулі ўвагу на тэрыторыю перад уваходам на наш завод?..

Мы — звярнулі. Не ведаем, што было раней, але цяпер уезд на завод выглядае вельмі прыгожа. Гэткае ж добраўпарадкаванне праводзіцца на туристычнай базе прадпрыемства, каля яго сямейнага інтэрната, падшэфнай школы...

— Валянцін Уладзіміравіч, гэта на сёння ваш асноўны клопат?

— Ну чаму ж асноўны — адзін з асноўных. Сезон нарыхтоўкі жывіцы і яе перапрацоўкі ў разгары — трэба націскаць. Да таго ж сёлета вельмі моцна абвастрылася канкурэнцыя... Маючы на ўвазе як яе, так і сезоннасць нарыхтоўкі

плануецца атрымаць за кошт банкаўскіх пазык, інавацыйнага фонду канцэрна «Беллеспаперапрам».

На сёння праводзіцца работа і па падрыхтоўцы вытворчасці да выпуску шклоабмыўнай вадкасці для аўтамабіляў на аснове свайго, айчыннага этылавага спірту. Да гэтага такой асновай служыў ізапрапілавы спірт, які купляўся ў Расіі. Да рэалізацыі адпаведнага праекта на «Лесахіміку» прыступаюць ужо ў жніўні; цяпер тут, па сутнасці, ідуць апошнія падрыхтоўчыя работы. Мы пабывалі ў навукова-даследчай лабараторыі прадпрыемства, у якой узгаднялася канчатковая рэцэптура шклоабмыўнай вадкасці. «Аўтамабілістам павінна спадабацца, пахне прыемна», — гаварыла начальнік лабараторыі Людміла Тарасава, хоць разам з тым паскардзілася, што за дзень нанюхалася гэтай прыемнай вадкасці амаль да млоснасці.

Яшчэ адзін новы для прадпрыемства прадукт: тут наладзілі вытворчасць антысептыка для прамочвання чыгуначных шпал. Асноўны спажывец — побач: Барысаўскі завод па вырабе шпал, выходная сыравіна — з «Нафтана» і «Паліміра». Антысептык прайшоў экалагічную атэстацыю; наладжванне яго выпуску таксама працуе на праграму імпартазамяшчэння.

Не так даўно Валянцін Шкаруба вярнуўся з Краснаярска, у якім беларускія прадпрыемствы выстаўляліся сваю прадукцыю. Асноўнай мэтай яго візіту было знаёмства з мясцовым каніфольна-экстракцыйным заводам і яго кіраўніцтвам і заключэнне пагаднення аб сумеснай дзейнасці. У прыватнасці, на «Лесахіміку» разам з Ноўгарадскім лесатэхнічным інстытутам распрацаваны такі від прадукцыі, як кабельная каніфоль. Гэта каніфоль у выніку краснаярскіх сустрэч можа надзейна прапісацца на кабельных прадпрыемствах сібірскага рэгіёна. І не толькі тут, але і на іншых кабельных прадпрыемствах Расійскай Федэрацыі. На чацвёрты квартал на «Лесахіміку» запланавана таксама распрацоўка другаснага прадукту на аснове каніфолі — эмульгатара каніфолі (каніфольнае мыла), які выкарыстоўваецца ў каўчукавай прамысловасці.

На прадпрыемстве намечана таксама развіццё вытворчасці па выпуску клею рознага прызначэння, у прыватнасці для склейвання бруса, для вырабу кардону і г.д. Цяпер тут вырабляюць клей, які пастаўляецца на кардонна-папяровыя фабрыкі краіны.

Добраму прасоўванню прадукцыі «Лесахіміка» на новыя рынкі дапамагае яго пастаянная прысутнасць на розных выстаўках. Вышэй ужо сказана пра яго сёлетні ўдзел у краснаярскай выстаўцы; сёлета ж, у канцы красавіка, барысаўчане выстаўлялі ўзоры сваёй прадукцыі на міжнародным кірмашы ў Гановеры. І тут прадукцыя барысаўчан таксама не засталася не заўважанай, а ў выніку яны заключылі кантракты на яе пастаўкі (у прыватнасці — шкіпінару) у Чэхію і Швецыю. Першая партыя ў Швецыю ўжо адпраўлена.

У 2005 годзе на прадпрыемстве ўкаранёна сістэма менеджменту якасці ISO-2001; у мінулым годзе тут атрымалі сертыфікат па ISO-1400 у галіне аховы навакольнага асяроддзя; сёлета, акурат да Дня пісьменства, плануецца атрымаць сертыфікат па сістэме ISO-18000 у галіне аховы працы.

Дарэчы, скажам тут пра свайго кшталту дапаўненне да сістэмы кіравання якасцю, якое можна абазначыць, як метад кіраўніка. Валянцін Уладзіміравіч заліў выраблены на заводзе тасол у свой аўтамабіль, пры гэтым папярэдзіў і сваю навуку, і работнікаў цэха: няхай толькі раз'есць... Увогуле ж, што датычыцца якасці менавіта тасолу (а гэта, няйначай, будзе цікава для аўтааматараў), ён на заводзе праходзіць скрупулёзныя даследаванні на адсутнасць у яго здольнасці ўтвараць у сістэме ахаладжання карозію. Спецыяльныя пласцінкі з металічнага сплаву, адшліфаваныя па вышэйшым класе дакладнасці, змяшчаюцца ў толькі што выраблены тасол і вытрымліваюцца ў ім пэўны час. Потым гэтыя пласцінкі даследуюцца пад мікраскопам, ці ўтварыліся ў іх ракавіны і колькі іх... Як зазначаюць на прадпрыемстве, пытанняў наконт якасці тасолу няма.

Вырашаючы пытанні ў рамках праграмы энергазбярожэння, на прадпрыемстве ў мінулым годзе рэканструявалі сваю кацельню, што дазволіла яму істотна знізіць энергаспажыванне — на 30 працэнтаў. Пры гэтым пры даведзеным заданні па энергазбярожэнні мінус 15 працэнтаў тут дасягнулі паказчыка мінус 76. «Затое выбралі практычна ўвесь рэзерв на гэты год», — паскардзіліся тут. Праўда, ужо хутка немалую эканомію энергарэсурсаў павінна прынесці іншае мерапрыемства — намечаная рэканструкцыя цэха нафтапалімерных смол, замена ў ім існуючага абсталявання. Адпаведны праект ужо распрацаваны.

— Усе гэтыя праекты і мерапрыемствы, вядома ж, выконваюцца не дзеля пэўнай адзнакі ў нейкай справаздачы. Яны істотна паўплываюць на эфектыўнасць нашай работы, а значыць — і на павышэнне дабрабыту працаўнікоў калектыву; мы яшчэ лепей умацуем нашу сацыяльную базу, якая ў нас ёсць. Наша немаладое ўжо прадпрыемства, якое мае амаль 80-гадовую гісторыю, яшчэ няблага паслужыць нашаму калектыву, нашай эканоміцы ўвогуле. Галоўнае, прадпрыемства працуе, і працуе паспяхова, — сказаў падчас гутаркі Валянцін Шкаруба.

Іван БАРАНОЎСКІ.

ПРАБЛЕМЫ, ЯКІЯ ХВАЛЮЮЦЬ ЛЕСАНАРЫХТОЎШЧЫКАЎ КАНЦЭРНА «БЕЛЛЕСПАПЕРАПРАМ»

Як зазначаюць у канцэрне «Беллеспаперапрам», асноўнай задачай яго спецыялізаваных арганізацый — леспрамгасаў — з'яўляецца забеспячэнне дрэваапрацоўчых і цэлюлозна-папяровых прадпрыемстваў канцэрна драўнінай. Аднак нармальнаму наладжванню гэтай справы перашкаджаюць пэўныя недахопы, якія склаліся ў практыцы лесанарыхтовак, а пераважна — у практыцы фарміравання цэнаў на драўніну. Перш за ўсё, лесасечны фонд не выдзяляецца канцэрну на доўгатэрміновай аснове, што не дазваляе яго прадпрыемствам працаваць з дакладнай перспектывай, уплывае на іх эканамічную грунтоўнасць.

Як адбываецца фарміраванне цаны? Сёння толькі частка драўніны, або з 13,7 мільёна кубаметраў, што нарыхтоўваюцца за год (у прыватнасці, столькі нарыхтавалі яе ў мінулым годзе), толькі 2,5 мільёна кубаметраў праходзяць праз біржавыя таргі, на якіх, зразумела, і вызначаецца яе цана. А пры гэтым тая цана, якая склалася на адзначаную частку драўніны, распаўсюджваецца (была распаўсюджана ў мінулым годзе) і на ўсю астатнюю драўніну, што рэалізуецца. Гэта прыводзіць да штучнага завышэння цаны на драўніну, ажыятажнага попыту на яе. Як лічаць у канцэрне (і вельмі абгрунтавана), уся драўніна без выключэння павінна прадавацца менавіта праз біржу, што прыводзіла б да ўстанаўлення на яе больш рэальнай цаны.

Практыка фарміравання цаны на драўніну, якая склалася, не ўплывае на павышэнне або паніжэнне яе кошту ў залежнасці ад умоў яе нарыхтоўкі. Вынікам такой практыкі можна лічыць той факт, што сёння не прадаецца каля 3 мільёнаў кубаметраў драўніны, якая знаходзіцца на цяжкадаступных участках або ўдалечыні ад пад'язных шляхоў.

Пры біржавых таргах нярэдка арыентуюцца на таксавы кошт драўніны, чаго не павінна быць. Таксавы кошт можа служыць толькі ў якасці асновы для фарміравання стартавай цаны.

Ва ўмовах пастаяннага змянення біржавых цэнаў на лес на корані канцэрн «Беллеспаперапрам» не бачыць неабходнасці ў дырэктыўным устанаўленні цэнаў на прадукцыю лесанарыхтовак, акрамя цэнаў на сацыяльна значную прадукцыю — дровы для насельніцтва, дзелавую драўніну для грамадзян, якія маюць патрэбу ў паляпшэнні жыллёвых умоў і будуюцца, а таксама драўніну для іншых фізічных асобаў на рамонт жылых і гаспадарчых пабудоў.

НА ЗДЫМКАХ:

1. Выдатна ўпарадкавалі завадчане тэрыторыю перад прахадной.
2. Дырэктар ААТ «Лесахімік» Валянцін ШКАРУБА.
3. На тэрыторыі прадпрыемства.
4. «Пра многія аспекты дзейнасці прадпрыемства, а таксама пра культурна-масавае і спартыўнае жыццё калектыву можна даведацца ў нашай інфармацыйна-метадычнай зале», — зазначае намеснік дырэктара па ідэалагічнай рабоце Уладзімір КАСЦЮКЕВІЧ.
5. Майстар цэха нафтапалімерных смол Ілона ЎМАРАВА.
6. Начальнік заводскай навукова-даследчай лабараторыі Людміла ТАРАСАВА.
7. Апаратчыца каніфольна-серпентыннага цэха Святлана ГАЛЬКЕВІЧ.
8. На ўчастку фасоўкі прадукцыі.
9. Барабаны, у якія затарваецца каніфоль, выраблае Раіса БУЛАТ.
10. На цэнтральным пульце кіравання прадпрыемства. На здымку: начальнік каніфольна-серпентыннага цэха Міхаіл ІСАЕВІЧ і апаратчыца Вольга ЯБЛОНСКАЯ.
11. На складзе каніфолі.
12. Падчас падсочкі дрэў.

Фота Марыі ЖЫЛІНСКАЙ.

УНП 600012243

Да пачатку XXIX летніх Алімпійскіх гульняў у Пекіне застаецца 6 дзён

Спецвыпуск № 5 газеты «Звязда» і Нацыянальнага алімпійскага камітэта Рэспублікі Беларусь

Менш чым праз тыдзень, 8 жніўня 2008 года ў 8 гадзін 8 хвілін і 8 секунд у кітайскай сталіцы будзе запалены агонь XXIX летніх Алімпійскіх гульняў.

Даволі прадстаўнічай на галоўным спартыўным свяце чатырохгоддзя будзе беларуская дэлегацыя, у складзе якой 182 атлеты. Яны выступяць у 26 відах спорту. Гэта алімпійская чэмпіёнкі Юля Несцярэнка (бег на 100 м), Кацярына Карстэн (веславанне акадэмічнае), Эліна Зверава (кіданне дыска), Яніна Карольчык-Правалінская (кіданне ядра), а таксама шматлікія прызёры алімпіяд, чэмпіёны свету. Капітан каманды — трохразовы чэмпіён свету ў кіданні молата Іван Ціхан. Мяркуецца, што беларускі сцяг на ўрачыстай цырымоніі адкрыцця панясе трохразовы алімпійскі чэмпіён па вольнай барацьбе Аляксандр Мядзведзь.

Галоўная задача беларускіх спартсменаў — выступіць дастойна і прывезці з Пекіна 15—17 алімпійскіх узнагарод. Дзяржава традыцыйна заахвочвае беларускіх алімпійцаў у заваяванні медалёў. Зараз залаты медаль ацэньваецца ў прадастаўленні кватэры і 100 тысяч долараў, сярэбраны ў 50 тысяч долараў, а бронзавы — у 30 тысяч. Акрамя таго, лаўрэаты Алімпіяды-2008 атрымаюць прызы ад спонсараў.

Прапануем поўны расклад выступлення ў Пекіне беларускіх алімпійцаў (з магчымымі зменамі), а таксама абагульненую Праграму спаборніцтваў на XXIX летніх Алімпійскіх гульнях.

Расклад спаборніцтваў Гульняў XXIX Алімпіяды з удзелам беларускіх спартсменаў

(чорным шрыфтам выдзелены спаборніцтвы, у якіх разыгрываюцца медалі)

Розніца паміж Мінскам і Пекінам — 5 гадзін (у праграме магчымыя зменненні).

Від спорту	Спартсмен, спаборніцтвы	Час мясцовы (беларускі)
8 жніўня, пятніца		
Цырымонія	Адкрыццё Алімпіяды	20.00 (15.00)
9 жніўня, субота		
Конны спорт	Вячаслаў Пойта, Алена Целяпушкіна (траябор'е, 1-ы дзень — выездка)	06.30—10.30 (01.30—05.30)
Баскетбол	Беларусь — Аўстралія (жанчыны)	09.00 (04.00)
Бадмінтон	Вольга Конан (адзіночны разрад, 1/32 фіналу)	09.00—22.30 (04.00—17.30)
Веласпорт-шаша	Аляксандр Кучынскі, Канстанцін Сіўцоў, Аляксандр Усаў (групавая гонка)	11.00—17.30 (06.00—12.30)
Стральба з лука	Кацярына Мулюк (кваліфікацыя)	12.00—14.00 (07.00—09.00)
Гімнастыка спартыўная	Мужчыны — Аляксандр Царэвіч, Дзмітрый Савіцкі, Дзяніс Савіцкі, Дзяніс Савянкоў, Ігар Казлоў, Дзмітрый Каспяровіч, Аляксей Ігнатовіч (камандная і асабістае першынство)	12.00—22.12 (07.00—17.12)
Веславанне акадэмічнае	Кацярына Карстэн (адзіночка, заезды)	13.50—14.50 (08.50—09.50)
Стральба кулявая	**Канстанцін Лукашык, Юрый Далгалоаў (пнеўматычны пісталет 10 м, фінал)**	15.00—15.20 (10.00—10.20)
Бокс	Рамазан Магамедаў (81 кг, 1/16 фіналу)	15.00—16.30 (10.00—11.30)
Стральба з лука	Максім Кунда (кваліфікацыя)	15.00—17.00 (10.00—12.00)
Веславанне акадэмічнае	Юлія Бічык, Наталля Гелах (двойка распашная, заезды)	15.50—16.10 (10.50—11.10)
Веславанне акадэмічнае	Дзяніс Мігаль, Станіслаў Шчарбчэня (двойка парная, заезды)	17.00—17.30 (12.00—12.30)
Веславанне акадэмічнае	Мужчыны — Вадзім Лялін, Аляксандр Казубоўскі, Андрэй Дзям'яненка, Яўген Носаў (чацвёрка распашная, заезды)	17.30—18.00 (12.30—13.00)
Конны спорт	Вячаслаў Пойта, Алена Целяпушкіна (трохбор'е, выездка) 1-ы дзень	19.15—23.15 (14.15—18.15)
Бокс	Рамазан Магамедаў (81 кг, 1/16 фіналу)	20.30—22.00 (15.30—17.00)
Плаванне	Віктар Вабішчэвіч (100 м брас, заплывы)	20.45—21.08 (15.45—16.08)
Плаванне	Аляксандра Герасіменя, Святлана Хахлова, Марыя Прасвірына, Юлія Хітрая (4х100м вольны стыль заплывы)	21.22—21.30 (16.22—16.30)
10 жніўня, нядзеля		
Конны спорт	Трохбор'е, 2-і дзень, выездка	06.30—10.30 (01.30—05.30)
Стальба кулявая	Вікторыя Чайка, Жанна Шапялевіч (пнеўматычны пісталет, кваліфікацыя)	09.00—10.15) (04.00—05.15)
Гімнастыка спартыўная	Анастасія Марачкоўская (асабістае першынство кваліфікацыя,	10.00—21.28) (05.00—06.28)
Бадмінтон	Вольга Конан (адзіночны разрад, 1/16 фіналу)	10.00—22.00 (05.00—17.00)
Тэніс	Максім Мірны (адзіночны разрад), Вікторыя Азаранка, Вольга Гаварцова, Таццяна Пучак, Дар'я Кустава(адзіночны разрад 1/32 фіналу, парны разрад 1/16 фіналу)	10.30—14.30 (05.30—09.30)
Плаванне	Мужчыны (100 м брас, паўфінал)	10.58—11.06 (05.58—06.06)
Плаванне	**Жанчыны (4х100 м вольны стыль, фінал)**	11.18—11.24 (06.18—6.24)
Стральба кулявая	**Жанчыны (пнеўматычны пісталет 10 м, фінал)**	12.00—12.20 (07.00—07.20)
Бокс	Магамед Нурудзінаў (69 кг, 1/16 фіналу)	15.00—16.30 (10.00—11.30)
Цяжкая атлетыка	Анастасія Новікава (53 кг)	15.30—17.10 (10.30—12.10)
Веславанне акадэмічнае	Кірыл Лемяшкевіч, Аляксандр Новікаў, Павел Шурмей, Валерый Радзевіч (чацвёрка парная, заезды)	16.50—17.20 (11.50—12.20)
Тэніс	(адзіночны разрад 1/32 фіналу, парны разрад 1/16 фіналу)	17.00—23.00 (12.00—18.00)
Плаванне	Святлана Хахлова (100 м на спіне, заплывы)	18.30—18.49 (13.30—13.49)
Цяжкая атлетыка	Віталь Дзербянёў (56 кг)	19.00—20.40 (14.00—15.40)
Плаванне	Іна Капішына (100 м брас, заплывы)	19.43—20.03 (14.43—15.03)
Плаванне	Павел Санковіч (100 м на спіне, заплывы)	20.08—20.35 (15.08—15.35)
Бокс	69 кг, 1/16 фіналу	20.30—22.00 (15.30—17.00)
11 жніўня, панядзелак		
Конны спорт	Трохбор'е, крос	08.00—11.30 (03.00—06.30)
Стральба кулявая	Віталь Бубновіч (пнеўматычная вінтоўка 10 м, кваліфікацыя)	09.00—10.45 (04.00—04.45)
Бадмінтон	Вольга Конан (адзіночны разрад, 1/8 фіналу)	10.00—22.00 (04.00—16.00)
Плаванне	Жанчыны (100 м на спіне, паўфінал)	10.00—10.08 (05.00—05.08)
Плаванне	**Мужчыны (100 м брас, фінал)**	10.27—10.31 (05.27—05.31)
Тэніс	(адзіночны разрад 1/32 фіналу, парны разрад 1/16 фіналу)	10.30—14.30 (05.30—09.30)
Плаванне	Жанчыны (100 м брас, паўфінал)	10.33—10.41 (05.33—5.41)
Стральба кулявая	**Мужчыны (пнеўматыная вінтоўка 10 м, фінал)**	12.00—12.20 (07.00—07.20)
Дзюдо	Канстанцін Сямёнаў (73 кг, папярэднія раўнды)	12.00—16.30 (07.00—11.30)
Парусны спорт	Мікалай Жукавец («RS:X», гонкі 1—2), Сяргей Дзесюкевіч, Павел Лагуноў, («470», гонкі 1—2)	13.00—19.00 (08.00—14.00)
Баскетбол	Беларусь — Латвія	16.45 (11.45)
Тэніс	Адзіночны разрад 1/32 фіналу, парны разрад 1/16 фіналу	17.00—23.00 (12.00—18.00)
Дзюдо	**Мужчыны (73 кг, фіналы)**	18.00—19.30 (13.00—14.30)
Цяжкая атлетыка	Генадзь Махвееня (62 кг)	19.00—20.40 (14.00—14.40)
12 жніўня, аўторак		
Стральба кулявая	Канстанцін Лукашык, Юрый Далгалоаў (малакаліберны пісталет 50 м, кваліфікацыя)	09.00—11.00 (04.00—06.00)
Барацьба грэка-рымская	Юрый Дубінін (60 кг, папярэднія раўнды, паўфіналы)	09.30—13.00 (30—08.00)
Гімнастыка спартыўная	**Мужчыны, каманднае першынство, фінал)**	10.00—12.36 (05.00—06.36)
Стральба з лука	Кацярына Мулюк (1/32, 1/16 фіналу)	10.00—13.10 (05.00—08.10)
Фехтаванне	Дзмітрый Лапкес, Валерый Прыёмка, Аляксандр Буйкевіч (шабля, асабістае першынство, 1/32—1/4 фіналу)	10.00—13.45 (05.00—08.45)
Плаванне	**Жанчыны (100 м на спіне, фінал)**	10.20—10.25 (05.20—05.25)
Плаванне	**Мужчыны (100 м на спіне, фінал)**	10.28—10.32 (05.28—05.32)
Тэніс	(адзіночны разрад 1/16 фіналу, парны разрад 1/16 фіналу)	10.30—14.30 (05.30—09.30)
Плаванне	**Жанчыны (100 м брас, фінал)**	10.45—10.49 (05.45—05.49)
Стральба кулявая	**Мужчыны (малакаліберны пісталет 50 м, фінал)**	09.00—11.00 (07.00—07.20)
Дзюдо	Сяргей Шундзікаў (81 кг, папярэднія раўнды)	12.00—16.30 (07.00—11.30)
Парусны спорт	Таццяна Драздоўская («Лазер-Радыял»), Мікалай Жукавец («RS:X»), Сяргей Дзесюкевіч, Павел Лагуноў («470»)	13. 00—19. 00 (08.00—14.00)
Тэніс	(адзіночны разрад 1/16 фіналу, парны разрад 1/16 фіналу)	17.00—23.00 (12.00—18.00)
Барацьба грэка-рымская	**Мужчыны (60 кг, фіналы)**	17.55—18.25 (12.00—18.00)
Дзюдо	**Мужчыны (81 кг, фіналы)**	18.00—19.30 (13.00—14.30)
Плаванне	Станіслаў Невяроўскі (100 м вольны стыль, заплывы)	18.30—19.10 (13.30—14.10)
Фехтаванне	**Мужчыны (шабля, паўфіналы і фінал)**	19.00—20.30 (14.00—15.30)
Конны спорт	**(трохбор'е, нераадольванне перашкод, фінал)**	19.15—23.30 (14.15—18.30)
Бокс	Хаважы Хацыгаў (54 кг, 1/16 фіналу)	20.30—22.00 (15.30—17.00)
13 жніўня, серада		
Баскетбол	Беларусь — Расія	09.00 (04.00)
Стральба кулявая	Жанчыны (малакаліберны пісталет 25 м, кваліфікацыя)	09.00—14.00 (04.00—09.00)
Барацьба грэка-рымская	Міхаіл Сямёнаў, Аляксандр Кікінеў (66 кг, 74 кг, папярэднія раўнды, паўфіналы	09.30—13.00 (04.30—08.00)
Стральба з лука	Макісм Кунда (1/32, 1/16 фіналу)	10.00—13.10 (05.00—08.10)
Бадмінтон	Жанчыны (адзіночны разрад, 1/4 фіналу)	10.00—22.00 (05.00—17.00)
Плаванне	Мужчыны (100 м вольны стыль, паўфінал)	10.00—10.08 (05.00—05.08)
Дзюдо	Андрэй Казусёнак (90 кг, папярэднія раўнды)	12.00—16.30 (07.00—11.30)

Праграма Гульняў XXIX Алімпіяды ў Пекіне

Віды спорту / Жнівень 2008	6	7	8	9	10	11	12	13	14	15	16	17	18	19	20	21	22	23	24	Фіналы
Цырымонія адкрыцця/закрыцця			S																S	
Лёгкая атлетыка										2	4	6	6	5	3	6	7	7	1	47
Акадэмічнае веславанне										R	7	7								14
Бадмінтон										1	2	2								5
Бейсбол												R				R		1		1
Баскетбол																		1	1	2
Бокс																		5	6	11
Байдарка/каноэ *Па роўнай вадзе*																	6	6		12
Слалам							2		2											4
Веласпорт *Трэк*										1	3	1	2	3						10
Шаша				1	1			2												4
Горны веласіпед																	1	1		2
BMX																2				2
Конны спорт																				
Нераадольванне перашкод													1	R		1	R	R	R	2
Выездка								1	R				1	R						2
Трохбор'е							2													2
Фехтаванне				1	1	1	1	2	1	1	1	1								10
Футбол																1		1		2
Гімнастыка *Спартыўная*							1	1	1	1		4	3	3	G					14
Батут													1	1						2
Мастацкая																		1	1	2
Цяжкая атлетыка				1	2	2	2	2		2	1	1	1	1						15
Гандбол																		1	1	2
Хакей на траве																	1	1		2
Дзюдо				2	2	2	2	2	2	2										14
Барацьба *Грэка-рымская*							2	2	3											7
Вольная											2	2		2	2	3				11
Водныя віды *Плаванне*				4	4	4	4	4	4	4	4				1	1				34
Сінхроннае плаванне															1			1		2
Скачкі ў ваду				1	1	1	1				1		1			1		1		8
Воднае пола																1			1	2
Сучасне пяцібор'е																1	1			2
Сафтбол														R		1				1
Таэквандо															2	2	2	2		8
Тэніс											2	2								4
Настольны тэніс												1	1				1	1		4
Стральба кулявая				2	2	2	2	1	2	1	2	1								15
Стральба з лука					1	1			1	1										4
Трыятлон													1	1						2
Парусны спорт												2	1	2	2	2	2	R	R	R	11
Валейбол *Валейбол*																		1	1	2
Пляжны валейбол																1	1			2
Фіналы	7	14	13	19	17	17	16	30	34	18	20	11	23	20	31	12	302			

— віды спорту, у якіх возьмуць удзел беларускія спартсмены

— кваліфікацыя **— фінал**

R — рэзервовы дзень **G — гала-прадстаўленне**

Парусны спорт	Мужчыны, жанчыны	13.00—19.00 (08.00—14.00)
Веласпорт- шаша	Васіль Кірыенка (гонка з раздзельным стартам)	13.30—17.15 (08.30—12.15)
Стральба кулявая	**Жанчыны, малакаліберны пісталет 25 м, фінал)**	15.00—15.20 (10.00—10.20)
Бокс	Віктар Зуеў (91 кг, 1/8 фіналу)	15.00—17.00 (10.00—12.00)
Веславанне акадэмічнае	Кацярына Карстэн (адзіночка, паўфіналы)	15.30—15.50 (10.30—10.50)
Цяжкая атлетыка	Ганна Бацюшка (69 кг)	15.30—17.10 (10.30—12.10)
Стральба з лука	Мужчыны (1/32, 1/16 фіналу)	15.30—18.41 (10.30—13.41)
Тэніс	Мужчыны, жанчыны — (адзіночны разрад 1/16 фіналу, парны разрад 1/8 фіналу)	16.00—22.00 (11.00—17.00)
Веславанне акадэмічнае	Мужчыны (двойка парная, паўфіналы)	16.30—16.50 (11.30—11.50)
Веславанне акадэмічнае	Мужчыны (чацвёрка распашная, паўфіналы)	16.50—17.10 (11.50—12.10)
Барацьба грэка-рымская	**Мужчыны (66 кг, 74 кг, фіналы)**	17.00—17.55 (12.00—12.55)
Дзюдо	**Мужчыны (90 кг, фіналы)**	18.00—19.30 (13.00—14.30)
Плаванне	Аляксандра Герасіменя (100 м вольны стыль, заплывы)	18.30—19.03 (13.30—14.03)
Цяжкая атлетыка	Сяргей Лагун (77 кг)	19.00—20.40 (14.00—15.40)
Конны спорт	Ірына Ліс (выездка Гран-пры, кваліфікацыя-1, 1-ы дзень)	19.15—24.15 (14.15—19.15)
Плаванне	Іна Капішына (200 м брас, заплывы)	19.40—20—11 (14.40—15.11)
14 жніўня, чацвер		
Барацьба грэка-рымская	Іосіф Чугашвілі (120 кг, папярэднія раўнды, паўфіналы)	09.30—13.00 (04.30—08.00)
Плаванне	Жанчыны (100 м вольны стыль, паўфіналы)	10.07—10.15 (05.07—05.15)
Стральба з лука	Жанчыны (1/8 фіналу)	10.30—12.29 (05.30—07.29)
Плаванне	**Мужчыны (100 м вольны стыль, фінал)**	10.46—10.50 (05.46—05.50
Плаванне	Жанчыны (200 м брас, паўфінал)	10.53—11.03 (05.53—06.03
Гімнастыка спартыўная	**Мужчыны (асабістае магабор'е, фінал)**	11.00—13.36 (06.00—08.36)
Парусны спорт	Жанчыны, мужчыны	13.00—19.00 (08.00—14.00)
Бокс	69 кг, 1/8 фіналу	13.30—14.30 (08.30—09.30)
Бокс	Рамазан Мугамедаў (81 кг, 1/8 фіналу)	14.30—16.30 (09.30—11.30)
Стральба з лука	Жанчыны (1/4 фіналу, паўфінал, фінал)	16.00—18.10 (11.00—13.10)
Тэніс	Мужчыны, жанчыны — адзіночны разрад 1/4 фіналу, парны разрад 1/4 фіналу)	16.00—22.00 (11.00—17.00)
Веславанне акадэмічнае	Мужчыны (чацвёрка парная, паўфіналы)	16.30—16.50 (11.30—11.50)
Веславанне акадэмічнае	Паўфіналы «В»	16.50—18.00 (11.50—13.00)
Плаванне	Андрэй Радзівонаў (50 м вольны стыль, заплывы)	18.30—18.58 (13.30—13.58)
Барацьба грэка-рымская	**Мужчыны (120 кг, фіналы)**	18.50—19.45 (13.50—14.45)
Конны спорт	Ірына Ліс (выездка Гран-пры, кваліфікацыя-1, 2-і дзень)	19.15—23.45 (14.15—18.45)
Плаванне	Яўген Лазука (100 м батэрфляй, заплывы)	19.40—20.14 (14.40—15.14)
Бокс	69 кг, 1/8 фіналу	21.00—22.00 (16.00—17.00)
15 жніўня, пятніца		
Лёгкая атлетыка	Яна Максімава (сямібор'е, 100 м з бар'ерамі)	09.00—09.32 (04.00—04.32)
Стральба кулявая	Сяргей Мартынаў, Пётр Літвінчук (малакаліберная вінтоўка 50 м, стральба лежачы, кваліфікацыя)	09.00—10.15 (04.00—05.15)
Стральба стэндавая	Андрэй Герашчанка (круглы стэнд, кваліфікацыя)	09.00—13.30 (04.00—08.30)
Лёгкая атлетыка	Павел Лыжын, Андрэй Міхневіч, Юрый Бялоў (штурханне ядра, кваліфікацыя)	09.05—10.05 (04.05—05.05)
Бадмінтон	Жанчыны (адзіночны разрад, 1/2 фіналу)	10.00—13.00 (05.00—08.00)
Плаванне	Мужчыны (50 м вольны стыль, паўфіналы)	10.00—10.06 (05.00—05.06)
Плаванне	**Жанчыны (200 м брас, фінал)**	10.09—10.13 (05.09—05.13)
Стральба з лука	Мужчыны (1/8 фіналу)	10.30—12.29 (05.30—07.29)
Лёгкая атлетыка	Жанчыны (сямібор'е, скачкі ў вышыню)	10.30—13.25 (05.30—08.25)
Лёгкая атлетыка	Іван Ціхан, Вадзім Дзевяторўскі, Валерый Свяцоха (кіданне молата, кваліфікацыя)	10.40—11.40 (05.40—06.40)
Плаванне	**Жанчыны (100 м, вольны стыль, фінал)**	11.01—11.04 (06.01—06.04)
Лёгкая атлетыка	Святлана Усовіч (800 м, забегі)	11.10—11.58 (06.10—06.58)
Гімнастыка спартыўная	**Анастасія Марачкоўская (асабістае магабор'е, фінал)**	11.15—13.00 (06.15—08.00)
Плаванне	Мужчыны (100 м батэрфляй, паўфінал)	11.16—11.24 (06.16—06.24)
Стральба кулявая	**Мужчыны (малакаліберная вінтоўка 50 м, стральба лежачы, фінал)**	11.30—11.50 (06.30—06.50)
Дзюдо	Юрый Рыбак (звыш 100 кг, папярэднія раўнды)	12.00—16.30 (07.00—11.30)
Лёгкая атлетыка	Мужчыны (кіданне молата, кваліфікацыя)	12.10—13.10 (07.10—08.10)

Парусны спорт	Мужчыны	13.00—19.00 (08.00—14.00)
Скачкі ў ваду	Дар'я Раменская (3-метровы трамплін, кваліфікацыя)	13.30—16.30 (08.30—11.30)
Цяжкая атлетыка	Ірына Кулеша, Юлія Навакоіч (75 кг)	15.30—17.10 (10.30—12.10)
Стральба з лука	**Мужчыны (чвэрцьфінал, паўфінал, фінал)**	16.00—18.10 (11.00—13.10)
Тэніс	Мужчыны, жанчыны (адзіночны разрад паўфінал, парны разрад паўфінал)	16.00—22.00 (11.00—17.00)
Дзюдо	**Мужчыны (звыш 100 кг, фіналы)**	18.00—19.30 (13.00—14.30)
Плаванне	Аляксандра Герасіменя, Святлана Хахлова (50 м вольны стыль заплывы)	18.30—18.53 (12.30—12.53)
Лёгкая атлетыка	Жанчыны (сямібор'е, штурханне ядра)	19.00—19.56 (14.00—14.56)
Цяжкая атлетыка	Андрэй Рыбакоў, Вадзім Стральцоў (85 кг)	19.00—20.40 14.00—15.40)
Бокс	54 кг, 1/8 фіналу	19.00—21.00 (14.00—16.00)
Лёгкая атлетыка	Ірына Ятчанка, Золіна Зверава (кіданне дыска, кваліфікацыя)	19.55—20.45 (14.55—15.45)
Лёгкая атлетыка	Алеся Турава (3000 м з перашкодамі, забегі)	20.25—21.10 15.25—16.10)
Плаванне	Павел Санковіч. Яўген Лазука, Віктар Вабішчэвіч, Станіслаў Невяроўскі (4х100 м камбінаваная эстафета, заплывы)	20.58—21.16 (15.58—16.16)
Лёгкая атлетыка	**Мужчыны (штурханне ядра, фіналы)**	21.00—22.10 (16.00—17.10)
Лёгкая атлетыка	Жанчыны (сямібор'е, 200 м)	09.00—09.32 (04.00-.04.32)
Лёгкая атлетыка	Жанчыны (кіданне дыска, кваліфікацыя)	21.15—21.43 (16.15—16.43)
Лёгкая атлетыка	Ксенія Прыёмка (трайны скачок, кваліфікацыя)	21.40—23.14 (16.40—18.14)
Баскетбол	Беларусь — Карэя	22.15 (17.15)
16 жніўня, субота		
Лёгкая атлетыка	**Іван Троцкі, Дзяніс Сімановіч, Сяргей Чарноў (хадзьба 20 км, фінал)**	09.00—10.40 (04.00—05.40)
Стральба стэндавая	Мужчыны (круглы стэнд, кваліфікацыя)	09.00—12.00 (04.00—07.00)
Лёгкая атлетыка	Надзея Астапчук, Наталля Міхневіч-Харанека, Юлія Леанцюк (штурханне ядра, кваліфікацыя)	09.10—10.10 (04.10—05.10)
Барацьба вольная	Алена Філіпава (55 кг, папярэднія раўнды, паўфіналы)	09.30—12.00 (04.30—07.00)
Лёгкая атлетыка	Жанчыны (сямібор'е, скачкі ў даўжыню)	09.50—11.32 (04.50—06.32)
Бадмінтон	**Жанчыны (адзіночны разрад, фіналы)**	10.00—13.00 (05.00—08.00)
Плаванне	**Мужчыны (100 м батэрфляй, фінал)**	10.07—10.10 (05.07—05.10)
Плаванне	**Мужчыны (50 м вольны стыль, фінал)**	10.36—10.39 (05.36—05.39)
Лёгкая атлетыка	Дзмітрый Сівакоў (кіданне дыска, кваліфікацыя)	10.40—11.35 (05.40—06.35)
Лёгкая атлетыка	Юлія Несцярэнка (100 м, забегі)	10.50—11.53 (05.50—06.53)
Плаванне	Жанчыны (50 м вольны стыль, паўфіналы	10.51—10.57 (05.51—05.57)
Скачкі на батуце	Таццяна Пятрэня (кваліфікацыя)	11.00—12.14 (06.00—07.14)
Лёгкая атлетыка	Мужчыны (кіданне дыска, кваліфікацыя)	12.05—13.10 (07.05—08.10)
Лёгкая атлетыка	Ілона Усовіч (400 м, забегі)	12.10—13.00 (07.10—08.00)
Скачкі на батуце	Мікалай Казак (кваліфікацыя)	12.15—13.30 (07.15—08.30)
Парусны спорт	Жанчыны, мужчыны	13.00—19.00 (08.00—14.00)
Стральба стэндавая	**Мужчыны (круглы стэнд, фінал)**	15.00—15.45 (10.00—10.45)
Веславанне акадэмічнае	**Мужчыны (чацвёрка парная, фінал «В»)**	15.10 (10.10)
Веславанне акадэмічнае	**Жанчыны (адзіночка, фінал «А»)**	15.30—15.40 (10.30—10.40)
Барацьба вольная	Алена Філіпава (55 кг, суцяшэнне)	16.00—16.30 (11.00—11.30)
Тэніс	**Жанчыны (адзіночны разрад , фіналы)**	16.00—22.30 (11.00—17.30)
Веславанне акадэмічнае	**Жанчыны (двойка распашная, фінал «А»)**	16.10—16.20 (11.10—11.20)
Веславанне акадэмічнае	**Мужчыны (двойка парная, фінал)**	17.10—17.20 (12.10—12.20)
Барацьба вольная	**Жанчыны (55 кг, фіналы)**	17.25—18.20 (12.25—13.20)
Веславанне акадэмічнае	Мужчыны (чацвёрка распашная, суцяшэнне)	17.30—17.40 12.30—12.40)
Веласпорт-трэк	Васіль Кірыенка (гонка па ачках)	17.40 (12.40)
Лёгкая атлетыка	Жанчыны (сямібор'е, кіданне кап'я)	19.00—19.50 20.10—20.50 (14.00—14.50) (15.10—15.50)
Конны спорт	Ірына Ліс (выездка спецыяльны Гран-пры, кваліфікацыя-2)	19.15—24.00 (14.15—19.00)
Лёгкая атлетыка	Жанчыны (800 м, паўфіналы)	19.30—19.57 (14.30—14.57)
Скачкі ў ваду	Жанчыны (3-метровы трамплін, паўфінал)	20.00—21.40 (15.00—16.40)
Лёгкая атлетыка	Жанчыны (100 м, 2-і раўнд)	20.35—21.03 (15.35—16.03)
Лёгкая атлетыка	**Жанчыны (штурханне ядра, фінал)**	21.20—22.30 (16.20—17.30)
Лёгкая атлетыка	Жанчыны (сямібор'е, 800 м)	21.45—22.21 (16.45—17.21)

Цэнтральным аб'ектам летніх Алімпійскіх гульняў-2008 у Пекіне выбраны нацыянальны стадыён «Птушынае гняздо» (там адбудуцца цырымоніі адкрыцця і закрыцця, спаборніцтвы лёгкаатлетаў і галоўныя матчы па футболе). Гэту назву ён атрымаў дзякуючы свайму ўнікальнаму сеткавому дызайну з кальцавымі стальнымі канструкцыямі ў вонкавай частцы (іх вага 42 тысячы тон). «Птушынае гняздо» дыяметрам больш за 300 метраў можа прыняць каля 90 тысяч гледачоў. Па сваёй змяшчальнасці, камфорту і выкарыстанню навейшых тэхналогій нацыянальны стадыён вылучаецца сярод іншых галоўных алімпійскіх арэн.

17 жніўня, нядзеля		
Стральба кулявая	Сяргей Мартынаў, Віталь Бубновіч (малакаліберная вінтоўка 50 м, стральба з трох становішчаў, кваліфікацыя)	09.00—12.20 (04.00—07.20)
Барацьба вольная	Вольга Хілько (63 кг, папярэднія раўнды, паўфіналы)	09.30—12.00 (04.30—07.00)
Плаванне	**Жанчыны (50 м вольны стыль, фінал)**	10.00—10.03 (05.00—05.03)
Плаванне	**Мужчыны (4х100 м камбінаваная эстафета, фінал)**	10.55—11.01 (05.55—06.01)
Фехтаванне	Мужчыны (шабля, каманднае першынство, 1/4 фіналу)	11.00—12.10 (06.00—07.10)
Веласпорт-трэк	Наталля Цылінская (спрынт, кваліфікацыя)	11.05 (06.05)
Парусны спорт	Таццяна Драздоўская («Лазер-Радыял», гонкі 9—10)	13.00—19.00 (08.00—14.00)
Фехтаванне	Мужчыны (шабля, каманднае першынство, 1/2 фіналу)	13.10—14.20 (08.10—09.20)
Стральба кулявая	**Мужчыны (малакаліберная вінтоўка 50 м, стральба з трох становішчаў, фінал)**	13.30—13.50 (08.30—08.50)
Тэніс	**Жанчыны (парны разрад, фінал)**	16.00—22.30 (11.00—17.30)
Барацьба вольная	**Вольга Хілько (63 кг, фіналы)**	16.30—17.00 (11.30—12.00)
Баскетбол	Беларусь—Бразілія	16.45 (11.45)
Веславанне акадэмічнае	**Мужчыны (чацвёрка парная, фінал А)**	16.50 (11.50)
Веласпорт-трэк	Наталля Цылінская (спрынт, 1/8 фіналу)	17.15 (12.15)
Фехтаванне	**Мужчыны (шабля, каманднае першынство, фіналы)**	18.00—20.00 (13.00—15.00)
Гімнастыка спартыўная	**Фіналы: мужчыны і жанчыны (вольныя практыкаванні), мужчыны (практыкаванні на кані), жанчыны (апоры скачок)**	18.00—20—45 (13.00—15.45)
Лёгкая атлетыка	Яўгенія Валадзько, Кацярына Паплаўская (100 м з бар'ерамі, забегі)	19.00—19.40 (13.00—13.40)
Лёгкая атлетыка	**Мужчыны (кіданне молата, фінал)**	19.10—20.40 (14.10—15.40)
Лёгкая атлетыка	Жанчыны (100 м, паўфінал)	19.45—20.01 (14.45—15.01)
Бокс	Мужчыны (69 кг, 1/4 фіналу)	20.00—21.00 (15.00—16.00)
Скачкі ў ваду	**Жанчыны (3-метровы трамплін, фінал)**	20.30—21.40 (15.30—16.40)
Лёгкая атлетыка	Жанчыны (400 м, паўфінал)	21.00—21.25 (16.00—16.25)
Бокс	91 кг, 1/4 фіналу	21.00—22.00 (16.00—17.00)
Лёгкая атлетыка	**Жанчыны (3000 м з перашкодамі, фінал)**	21.30—21.46 (16.30—16.46)
Лёгкая атлетыка	**Жанчыны (трайны скачок, фінал)**	21.35—23.10 (16.35—18.10)
Лёгкая атлетыка	**Жанчыны (100 м, фінал)**	22.25—22.35 (17.25—17.35)
18 жніўня, панядзелак		
Лёгкая атлетыка	Дар'я Пчэльнік, Аксана Мянькова, Вольга Цандэр (кіданне молата, кваліфікацы

Аляксандр Майсееў: «У НАШЫМ РАЁНЕ ПАЎСЮДНА — СЛЯДЫ АБНАЎЛЕННЯ»

— Аляксандр Фёдаравіч, нагод для нашай гутаркі сёння — некалькі. Набліжаецца дзень будаўніка, а сярод пытанняў, якія вы курыруеце згодна са сваёй службовай пасадай, якраз з'яўляецца і будаўніцтва. Па-другое, нам вядома, што раён, у адрозненне ад некаторых іншых на Гомельшчыне, паспяхова справіўся з паўгадавым заданнем і набірае належныя тэмпы, каб гэтак жа завяршыць і гадавую праграму. Дык вось пытанне: як гэта дасягаецца?

— Хачу адразу сказаць, што сёлетняя праграма будаўнічых работ даволі складаная і што кожны год яна павялічваецца. Тым не менш, асноўныя паказчыкі, якія канталююцца, мы выконваем. Асноўны ўпор, як гэтага патрабуюць кіраўнікі краіны, робіцца на ўзвядзенне жылля. На гэты год планам прадугледжана здаць яго ў эксплуатацыю 11 700 квадратных метраў, у тым ліку навасельцы прадпрыемстваў аграпрамысловага комплексу павінны атрымаць у вёсцы семдзесят жылых дамоў. Раён справіўся з заданнем, даведзеным рашэннем аблвыканкама. Увод агульнай плошчы забяспечаны на 65 працэнтаў замест даведзеных 50. Здадзена таксама 42 жылыя дамы для працаўнікоў аграпрамысловага комплексу раёна, што адпавядае 60 працэнтам ад агульнага гадавога задання згодна з указаным вышэй рашэннем аблвыканкама.

Па дзяржаўнай праграме мы павінны сёлета закончыць шэраг работ у двух аграгарадках — Пцічы і Камаровічах, дзе цяпер працуюць падрадныя арганізацыі.

— Гэта ж не першыя аграгарадкі ў раёне?

Канкавіцкая амбулаторыя агульнай практыкі: фельчар Алена БРАІМ.

Не першыя. Да гэтага ў іх ператварыліся вёскі Бабунічы, Ляскавічы, Чалюшчавічы, Конкавічы. Трэба прызнаць, што ў будаўніцтве аграгарадкоў Пціч і Камаровічы ёсць пэўныя цяжкасці, якія неабходна пераадольваць.

— У будаўнічым працэсе па жыллю ў мінулыя гады ў вашым раёне быў задзейнічаны Мазырскі домабудаўнічы камбінат. Сёлета — таксама?

— Не, сёлета яго калектыў у нас не працуе, хоць першапачаткова планавалася, каб з тых сямідзесяці дамоў дванаццаць былі на рахунку камбіната. Але потым адбылося пераразмеркаванне будаўнічых аб'ектаў, што пацягнула за сабой, акрамя іншага, перагляд праектна-каштарысной дакументацыі, тытульных спісаў для фінансавання і іншае. Такім вось чынам і атрымалася, што ўсе цяжкасці будаўніцтва ляглі на мясцовыя арганізацыі: АМК-110 камунальнага вытворча-будаўнічага ўнітарнага прадпрыемства «Палессебуд», Капаткевіцкай ПМК-4 адкрытага акцыянернага таварыства «Гомельсаўгасбуд», ААТ «Петрыкаўрамбуд» Гомельскага «Аблбудкомплексу», мясцовага ДРБУ-112, дзе кіраўнікамі Анатоль Берднік, Уладзімір Пераводнікаў, Аляксандр Зярноў і Аляксандр Каваленка.

На тэрыторыі раёна ў будаўнічай галіне задзейнічаны некаторыя падрадныя арганізацыі і з іншых мясцовасцяў, якія добра сябе зарэкамендавалі. Гэта «Палессебуд», прыватнае прадпрыемства з Мазыра «Лотас», Жытkавіцкі «Рытмсэрвіс». Яны шчыруюць на аб'ектах Нацыянальнага парка «Прыпяцкі».

— У Петрыкаве, як вядома, будуецца міні-цеплаэлектрацэнтраль, і яна павінна быць здадзена сёлета. Як тут ідуць справы?

— Правільна, будуецца. Яе заказчыкам з'яўляецца «Райжылкамгас», які ўзначальвае Уладзімір Шостак. Адзначу, што яна пасля ўводу ў строй павінна працаваць на мясцовых відах паліва і, як гаворыцца, выдаваць на гара цепла- і электраэнергію ў такіх памерах: 5,5 гігакалорый і 1,2 мегавата у гадзіну адпаведна. Арыенціровачны кошт аб'екта — звыш чатырнаццаці мільярдаў рублёў, з якіх 20 працэнтаў выдзяляе райвыканкам, 30 — Рэспубліканскі фонд аховы прыроды, 15 — дэпартамент па энергаэфектыўнасці і 15 — Кіраўніцтва справамі Прэзідэнта краіны. Сёння з упэўненасцю можна сказаць, што гэты важны аб'ект сёлета здадзены ў строй дзеючых не будзе.

У гутарку ўступае Шостак, дырэктар «Райжылкамгаса»:

— Наша арганізацыя з'яўляецца заказчыкам такіх важных аб'ектаў, як ачышчальныя збудаванні, увод якіх запланаваны на наступны год, і міні-ЦЭЦ. Па першай будоўлі праблем няма. Адзінае, што нам патрэбна цяпер зрабіць, гэта або набыць перасоўны растворны вузел, або заключыць дагавор з якойсьці арганізацыяй, якая магла б пастаўляць на аб'ект 250 кубаметраў бетону ў суткі.

Што датычыцца міні-ЦЭЦ, дык тэрмін будаўніцтва яе — 19 месяцаў. Генеральны праекціроўшчык — «Белінвестэнергазберажэнне», а на падрадзе ў гэтай арганізацыі — «Белпрампраект» Міністэрства архітэктуры і будаўніцтва. Што і казаць, аб'ект даволі складаны. Праектна-каштарысная дакументацыя на яго павінна была быць гатова яшчэ летась, але і сёння яна распрацавана не ў поўным аб'ёме.

— На наша першае пытанне, Аляксандр Фёдаравіч, вы адказалі не поўнасцю: што садзейнічае перавыкананню паўгадавога задання?

— Вялікі вопыт работы кіраўнікоў будаўнічых арганізацый, якія з пачуццём высокай адказнасці працуюць і мабілізавалі на яе свае калектывы. Добрая арганізацыя работы, кантроль за захаваннем тэхналагічных працэсаў і іншыя фактары. Гэта зусім не азначае, што намі ўсё ўжо зроблена ва ўказаным накірунку, што няма цяжкасцяў, праблем. Ёсць яны, і звязаны з тым, што нашы будаўнічыя арганізацыі перагружаны, што не хапае вопытных будаўнікоў, бо многія з іх аддаюць перавагу расійскім рэгіёнам, дзе заробкі большыя. Свае недахопы ў будаўнічым канвееры мы ведаем і стараемся іх пераадольваць.

— Адным словам, самасупакоенасці няма?

— Няма. Пытанні будаўніцтва аб'ектаў пастаянна знаходзяцца на кантролі і райвыканкама, і вышэйстаячых арганізацый, якія дапамагаюць нам. Хачу таксама сказаць, што ў раёне не толькі многае будуецца, але і рэканструюецца, абнаўляецца. У гэтым вы ўпэўніцеся, калі праедзеце і па горадзе Петрыкаве, і па вёсках, што я і прапаноўваю вам зрабіць з начальнікам аддзела архітэктуры і будаўніцтва Анатолем Фурса.

ПРАДСТАЎЛЯЕМ СУРАЗМОЎЦУ

Аляксандр Майсееў ураджэнец Петрыкаўшчыны, які свой родны край пакідаў толькі на час вучобы ў Мінскім тэхнікуме будаўнічых матэрыялаў і службы ў арміі. Атрымаўшы спецыяльнасць тэхніка-механіка, не супакоіўся і працягваў браць вышыні навукі, для чаго закончыў яшчэ дзве вышэйшыя навучальныя ўстановы: тэхналагічны інстытут імя Кірава і інстытут правазнаўства. Завочна, вядома, бо працаваў у органах дзяржаўнага кіравання і на партыйнай рабоце. І ўсё — у сваёй старонцы: быў і намеснікам старшыні райсавета дэпутатаў, і загадчыкам арганізацыйнага аддзела райкама партыі, і кіраўніком спраў райвыканкама. Апошнія пяць гадоў з'яўляецца намеснікам старшыні Петрыкаўскага раённага выканаўчага камітэта.

На свае вочы

І вось мы ў Конкавічах, якія сталі аграгарадком летась. На што звяртаем увагу тут? Цэлая вуліца забудавана дамамі-катэджамі, новае аблічча набылі сельскі Дом культуры, урачэбная амбулаторыя, магазіны. Пад'язджаем да таго месца, дзе працуюць будаўнікі на чатырох дамах, якія павінны быць здадзены ў трэцім квартале. На аб'екце сустракаем дырэктара «Петрыкаўрамбуда» Аляксандра Зярнова. Ён расказвае, а Анатоль Фурса дапаўняе яго пра тое, што забудова вуліцы пачалася ў 2005 годзе, і з'явілася з таго часу тут 18 дамоў. Спачатку гэта былі з пенагазасілкатных блокаў, якія завозіліся з ААТ «Гомельбудматэрыялы».

Адлегласць, вядома, вялікая, а блізкэй знайсці іх вытворцу няма як. Але ж Петрыкаўскі раён лясісты. Дык чаму б не паспрабаваць будаваць жыллё для вясковцаў з мясцовага матэрыялу — дрэва — вырашылі ў раёне. Спецыялісты «Мазырсельбудпраекта» ажыццявілі прывязку мясцовасці тыпавых праектаў такога жылля па прэзідэнцкай праграме, зацверджаных міністэрствам.

— Лясныя дзялянкі, — апавядае Аляксандр Валянцінавіч, — знаходзяцца за дзесяць кіламетраў, у раёне мацца керамзітавы завод. Вось і ўсе асноўныя будаўнічыя матэрыялы, якія мы выкарыстоўваем. Выгадна? Вядома. Трэба ўсё лічыць, падсумоўваць, параўноўваць. Акрамя ўсяго іншага, у нашай вытворчасці, будаўніцтве дамоў з драўляных брусоў, адсутнічае так званы мокры працэс, бо ўнутры — сухая тынкоўка. Раней было такое: мяне, як кіраўніка будаўнічай арганізацыі, прымушалі пераходзіць на цагельныя варыянты, я ж настойваў на сваім, і цяпер усе драўляныя дамы ўзводзіць у раёне наш калектыў.

— Напэўна, такое жыллё цёплае?

— Цёплае, але, прызнаюся, раней былі нараканні жыхароў на недахоп цяпла ў падобных збудаваннях. Дык мы ўжо каторы час дадаткова ўцяпляем іх і абшываем з вуліцы сайдзінгам. Паглядзіце, як прыгожа выглядаюць яны цяпер.

Ідзе будаўніцтва гасцінічнага комплексу ў Ляскавічах.

Добраўпарадкаваная тэрыторыя банка ў в. Ляскавічы.

— Сапраўды, эстэтыка, — разважаем мы разам з брыгадзірам Аляксандрам Боўсунам, які аддаў будаўнічай справе больш за трыццаць гадоў і бачыць мэту ў тым, каб добраўпарадкаваць родны край. Яго калектыў з шасці чалавек, у якім спалучаецца вопыт старэйшых з энергіяй маладзейшых, шчыруе ў працы з васьмі гадзін раніцы, і кожны дзень адзначаецца новымі здабыткамі. Што гэтыя чатыры дамы будуць здадзены ў канцы трэцяга квартала, як і намечана, сумненняў у яго няма.

Наступны наш маршрут ляжаў на Ляскавічы, цэнтральную сядзібу Нацыянальнага парку «Прыпяцкі». Ехалі туды праз Петрыкаў, і Анатоль Уладзіміравіч прапанаваў завітаць у адзін з жылых мікрараёнаў, дзе толькі што быў здадзены па выніках першага паўгоддзя двухпад'ездны пяціпавярховік на сорак кватэр. Будавалі яго працаўнікі Капаткевіцкай ПМК-4 за сродкі членаў калектыву індывідуальных забудоўшчыкаў (КІЗ). Дом з цэглы, з трохслойнымі сценамі, уцеплены. У ім было прадугледжана ашклення лоджый, каб кожны гаспадар кватэры не рабіў гэта на свой асабісты лад і тым самым не псаваў знешняе яго аблічча.

Побач стаяў такі ж самы дом, здадзены летась. І мы пацікавіліся, ці ёсць ахвотнікі будаваць жыллё за свой кошт? Аказваецца, ёсць, бо спадзявацца сёння на атрыманне кватэры ў райцэнтры за кошт дзяржавы — справа, хутчэй за ўсё, безнадзейная: савецкія часы даўно прайшлі. Чарга на атрыманне жылля ў горадзе — паўтысячы сем'яў. Узяць крэдыты ў банку не складае ніякіх цяжкасцяў, сказаў нам адзін з жыхароў горада Аляксандр Аўчыннікаў, член КІЗа. Яго сям'я з трох чалавек пражывае ў чужой кватэры і спадзяецца, што атрымае сваю ўжо ў наступным годзе.

Дарэчы, недалёка ад тых двух пяціпавярховікаў, але ўжо ў іншым мікрараёне, у раёне вуліцы імя Луначарскага, пачынаецца будаўніцтва 59-кватэрнага дома КІЗа № 5, куды прывезлі ўжо бытоўкі. Тут з'явіцца такі ж самы дом і яшчэ адзін на 20 кватэр. Праекты на іх ужо распрацаваны.

Па дарозе ў Ляскавічы мы былі сведкамі таго, як добраўпарадкоўваецца горад. Вось вуліца імя Валадарскага, якая злучае два жылыя масівы — цэнтр і былы ваенны гарадок. Тут устанаўліваюцца бардзюрныя камяні, робяцца так званыя «кішэні» для транспарту. А вось ідуць работы па рэстаўрацыі будынкаў сярэдняй агульнаадукацыйнай школы № 1, Петрыкаўскага аддзялення Аграпрамбанка, старажытнага асадзібнага, дзе размяшчаецца рыбінспекцыя. Па дарозе ж у Ляскавічы бачылі рамонтнікаў аўтатрасы.

Сам жа аграгарадок уражвае тым, што тут ужо зроблена і робіцца цяпер працавітымі рукамі будаўнікоў. Напрыклад, узводзіцца пяцізаркавая гасцініца на пяцьдзесят месцаў, неўзабаве будуць закончаны работы на Доме ваеслагічнай адукацыі. Побач з адноўленым сельскім Домам культуры — прыбудаваны новы будынак, у якім размясціліся Петрыкаўскае аддзяленне Аграпрамбанка і комплексна-пыёмны пункт камбіната бытавога абслугоўвання насельніцтва, які быў здадзены ў эксплуатацыю ў чэрвені. Цяпер тут ідзе будаўніцтва пяці дамоў-катэджаў, якія ўзводзяцца па прэзідэнцкай праграме, а на наступны год колькасць іх узрасце да 15—18. Пабывалі мы таксама і на стадыёне, які, хоць і належыць школе, але разлічаны на заняткі фізкультурай і спортам жыхароў аграгарадка і іншых населеных пунктаў раёна. Стадыён з бегавымі дарожкамі, трыбунамі для гледачоў, футбольным полем, пляцоўкамі для гульні ў тэніс, баскетбол. Неўзабаве будзе зроблена воднае аблуладкаванне двух вадаёмаў, а зараз ідзе распрацоўка праекта музея прыроды. Старыя пустыя дамы зносяцца, і на іх месцы ўзнікаюць новыя. Ляскавічы ўпэўненна мяняюць сваё знешняе аблічча, напаўняючы жыццё людзей светлымі фарбамі.

Сустрэліся мы і з начальнікам упраўлення капітальнага будаўніцтва райвыканкама Мікалаем Батанам, і вялі з ім гутарку аб асваенні бюджэтных сродкаў, правядзеннем газу ў прыватны сектар, чаго чакаюць многія жыхары, прыцягненні да будаўніцтва большай колькасці людзей і наогул аб рабоце ўпраўлення, якому нядаўна споўнілася 35 гадоў. Ён падкрэсліў, што працы наперадзе — шмат.

А ў заключнай гутарцы з намі намеснік старшыні Петрыкаўскага райвыканкама Аляксандр Майсееў папрасіў на старонках газеты выказаць шчырую ўдзячнасць будаўнікам, што ператвараюць гэты Палескі край і павіншаваць іх з надыходзячым прафесійным святам, пажадаць добрага здароўя, дастатку ў сем'ях, добрага настрою. Што мы з ахвотай і робім.

Матэрыял падрыхтавалі Алена ДАЎЖАНОК, Уладзімір ПЕРНІКАЎ. Фота Марыі ЖЫЛІНСКАЙ.

НАШЫ РЭКВІЗІТЫ
247940, г. Петрыкаў, вул. Гагарына, 15, райвыканкам.
Тэлефон (8+02350) 5 12 10
Факс (8+02350) 5 17 01
УНН 400065489.

Брыгадзір будаўнікоў Аляксандр БАЎСУН.

Галоўны архітэктар раёна Анатоль ФУРСА і дырэктар ААТ «Петрыкаўрамбуд» Міхаіл ЗЯРНОЎ.

Новы дом па вуліцы Вароўскага.

Будуецца новы стадыён у Петрыкаве.

СКАНВОРД

Склаў Андрэй МІХАЙЛАЎ.



Віншуем дарагога дзядулю **Васіля Сафронавіча ІВАНОВА**, які жыве ў в. Козікі, з **80-годдзем**.

Пад дахам бацькоўскае хаты,
як у чыстым бусліным гняздзе,
адчуваеш і клопат, і ласку,
і быццам не быў ты нідзе.

Ад жыццёвай дарогі стомішся,
а прыедзеш да таты дамоў —
маладосцю, здароўем і радасцю
падсілкуешся тут зноў і зноў...

Дзеці, унукі, праўнукі.

Усходні гараскоп на наступны тыдзень

Авены павінны верыць у асабістыя сілы, а Блізнятам лепш пазбягаць службовых раманаў

ВАЕН. Пажадана не займацца капаннем у сабе, каб у выніку не зведаць пачуцця расчаравання вынікам. Серада — адзін з самых паспяховых дзён тыдня, калі ведаеце, чаго хочаце дабіцца. Для дасягнення максімальнай паспяховасці спатрэбяцца такія якасці, як засяроджанасць і ўпэўненасць у асабістых сілах. У чацвер лепш не пачынаць нічога новага, а ўсе важныя справы і сустрэчы перанесці на пятніцу.

ЦЯЛЕЦ. З'явіцца магчымасць зрабіць многа добрых спраў і дабіцца значных поспехаў на рабоце, але гэта не нагода для зазнайства. Пры жаданні і засяроджанасці на галоўных пытаннях зможаце дасягнуць добрых вынікаў і рэалізаваць практычна ўсё, што намецілі. Самым неэфектыўным днём можа аказацца панядзелак — не варта пачынаць нічога новага і пажадана захоўваць асцярожнасць ва ўсім.

БЛІЗНЯТЫ. Дзелавыя адносіны, якія складваліся нядрэнна, нечакана могуць перайсці ў іншую плоскасць. Асцерагайцеся службовых раманаў: яны могуць загубіць кар'еру. Не выключана, што вам даводзіцца пачынаць наноў. Пажадана перагледзець свой стыль паводзінаў, магчыма — змяніць імідж. Панядзелак — адзін з самых плённых дзён тыдня, калі можна зрабіць значна больш, чым запланавана.

РАК. Фартуна на вашым баку і вы можаце справіцца практычна з любой праблемай. Удача будзе спадарожнічаць у пачынаннях, якія звязаны з творчасцю. Папоўніце кола знаёмых прыемнымі і карыснымі для вас людзьмі. Перш чым прыняць сур'ёзнае рашэнне, пастарайцеся ўсё добра абдумаць. Панядзелак паспяховы для новых спраў і пачынанняў. У сераду праявіце асцярожнасць і ўважлівасць.

ЛЕЎ. Праявяцца вашы рознабаковыя таленты: аднолькава добра будуць удавацца як бытавыя, так і прафесійныя справы. Пастарайцеся не забывацца пра некаторыя правілы і праявіце рашучасць у пераадольванні цяжкасцяў. Парадуйце блізкіх — іх удзячнасць будзе спрыяць вашаму добраму настрою. У пятніцу адкладзіце дробныя справы, якія раздражняюць, і займіцеся вырашэннем больш важных праблем.

ДЗЕВА. Будзьце больш уважлівымі да цікавых супадзенняў і дробных дэталяў, бо менавіта ў іх і будуць утрымлівацца адказы на ўсе вашы пытанні. Панядзелак спрыяльны для атрымання тайных ведаў. Серада — дзень, поўны ілюзій: адкладзіце прыняцце якіх бы там ні было рашэнняў. Другая палова тыдня спрыяльная для пачатку рамонту ці іншых сур'ёзных перамен у вашым доме.

ШАЛІ. На рабоце ўсё складваецца ўдала, у многіх справах вас чакае поспех і адчуванне асабістай незаменнасці. Важна правільна спланаваць справы на тыдзень, каб не перарасходаваць сілы. Адчуўшы прыліў энергіі, не варта хапацца за некалькі спраў адразу — лепш спыніцца на чымсьці адным, найбольш значным для вас.

СКАРПІЁН. Сумленнай працай вы справядліва завалюеце ўвагу навакольных. Аўторак не лепшы дзень для прыняцця адказных рашэнняў, але спрыяльны для творчай працы. У сераду вас могуць падтрымаць аднадумцы і начальства, з'явіцца магчымасць паказаць свае здольнасці. У пятніцу адмоўцеся ад асабістых амбіцый — гэта дазволіць захаваць час, сілы і нервы. Нядзелю лепш правесці дома, займаючыся бытавымі дробязямі.

СТРАЛЕЦ. У пачатку тыдня да вас можа падкрасціся работа: яна захопіць вас у палон, і вы траціце ў вір першачарговых неадкладных спраў. Напружаны рытм тыдня можа паўплываць на працаздольнасць, а калі да абавязацельстваў, якія існуюць, дададуцца новыя, будзе цяжка з гэтым справіцца. У аўторак не ўцягвайцеся ў інтрыгі — гэта не дадасць душэўнай раўнавагі.

КАЗЯРОГ. Прафесійная галіна запатрабуе пільнай увагі і непасрэднага ўдзелу. Для таго, каб утрымліваць кантроль над сітуацыяй, вам спатрэбіцца разважлівасць і ўменне выконваць работу ў вызначаны тэрмін. У панядзелак пастарайцеся ні з кім не сварыцца. Аўторак — спрыяльны дзень для максімальнай актыўнасці і рашучых дзеянняў.

ВАДАЛЕЙ. Давядзецца адстойваць свой аўтарытэт і, магчыма, нават пацвярджаць кампетэнтнасць у пытаннях работы. У панядзелак будуць удалымі паездкі і камандзіроўкі. У аўторак можа парадаваць цікавая інфармацыя. Не адцягвайце ўвагі, рабіце сваю справу і дайце магчымасць іншым займацца сваімі пытаннямі. Цяпер неабходна працаваць на бліжэйшую будучыню, рэалізацыю і зацвярджэнне новых ідэй і планаў.

РЫБЫ. Нечаканыя сустрэчы і дзіўныя выпадкі пройдуць як у калейдаскопе і наўрад ці дадуць вам засумаваць. Лавіце ўдачу: выкарыстайце гэты час не толькі для забаў, але і па справе. Можаце пачуць нямала кампліментаў — многія будуць упэўніваць вас у тым, што вы надзвычайная асоба. Вам па сілах арганізацыя цікавага і незвычайнага мерапрыемства. Не шкадуйце часу на зносіны і перамяшэнні — усё будзе складвацца цудоўна.

Усміхнёмся!

— У цябе арганізм нармальна рэагуе на ўкусы вос?

— Не — пачынае мацюкацца.

☺

Да псіхааналітыка прыходзіць кліент. Размяшчаецца на кушэтцы і... маўчыць. Псіхааналітык цярпліва чакае. У абсалютнай цішыні праходзіць гадзіна. Кліент моўчкі ўстае, пакідае 50 долараў і, развітаўшыся, пакідае доктара. На наступны дзень карціна паўтараецца. І так некалькі разоў. Праз тыдзень сеансаў псіхааналітык не вытрымлівае:

— Можа, раскажаце, што вас турбуе?

— Жонка, доктар. Яна не замаўкае ні на хвіліну. А ў вас тут так добра, ціха...

☺

У жанчын вочы вялікія, каб было зручна сачыць за мужчынамі.

А ў мужчын вочы маленькія, каб іх было цяжэй выдрапаць.

СЁННЯ

Сонца

	Усход	Захад	Даўжыня дня
Мінск —	5.25	21.05	15.40
Віцебск —	5.09	21.00	15.51
Магілёў —	5.15	20.55	15.40
Гомель —	5.18	20.45	15.27
Гродна —	5.42	21.19	15.37
Брэст —	5.49	21.14	15.25

Месяц

Першая квадра.

Месяц у сузор'і Льва.

Імяніны

Пр. *ПРАРОКА ІЛЫ, Абрама, Аляксандра, Апанаса, Георгія, Івана, Кузьмы, Сяргея, Фёдара, Ціхана.*

К. *Карыны, Марыі, Густава, Сцяпана.*

НАДВОР'Е на заўтра



...у суседзяў

ВАРШАВА +26..+28°С	КІЕЎ +27..+29°С	РЫГА +22..+24°С
ВІЛЬНЮС +24..+26°С	МАСКВА +15..+17°С	С.-ПЕЦЯРБУРГ +18..+12°С

2 жніўня

Дзве даты

1840 год — выйшаў указ імператара Мікалая I аб спыненні дзейнасці на тэрыторыі Гродзенскай, Віленскай і Мінскай губерняў Статута Вялікага княства Літоўскага 1588 года, узору беларускай юрыдычнай думкі сярэдніх вякоў.

1945 год — завяршыла работу Патсдамская мірная канферэнцыя кіраўнікоў дзяржаў-саюзніц: І. Сталін, Г. Трумен, У. Чэрчыль (К. Этлі). Прыняла рашэнне аб дэмілітарызацыі і дэнацыфікацыі Германіі, знішчэнні германскіх манаполій, аб рэпарацыях, аб заходняй мяжы Польшчы, пацвердзіла перадачу СССР г. Кёнігсберга і прылеглых да яго раёнаў і інш.

Цытата дня:

«Бог думае пра нас. Але ён не думае за нас».

Жан Както (1889—1963), французскі драматург.

ЗВЯЗДА
БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА
ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь
РЭГІСТРАЦЫЙНЫ НУМАР 1.

Галоўны рэдактар У. НАРКЕВІЧ. РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: І. БАРАНОЎСКІ, С. ГРЫБ, У. ЗДАНОВІЧ (намеснік галоўнага рэдактара), Н. КАРПЕНКА, Л. ЛАХМАНЕНКА, Т. ПАДАЛЯК, С. ПРОТАС (намеснік галоўнага рэдактара), С. РАСОЛЬКА, Л. РЫЖАНКОВА (першы намеснік галоўнага рэдактара), Л. СВІДРЫЦКАЯ, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК, І. ШЧУЧЭНКА.

НАШ АДРАС: 220013 г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

ТЭЛЕФОНЫ: прыёмнай – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, падпіскі і распаўсюджвання — 287 18 51, юрыдычнага — 287 19 68, сакратарыята — 292 05 82, адказных за выпуск дадаткаў: «Чырвоная змена» — 292 44 12; «Мясцовае самакіраванне» — 292 21 03, уласных карэспандэнтаў: у Брэсце: 20 37 98, Віцебску: 43 23 74, Гродне: 43 25 29, Гомелі: 74 13 92, Баранавічах: 7 26 02, Магілёве: 32 74 31; бухгалтэрыі: 292 22 03; прыём рэкламы тэл./факс: 287 17 79, *e-mail: reklama@zvyazda.minsk.by*, рэдактар рэкламнага аддзела — тэл./факс 292 04 52.

http://www.zviazda.by

e-mail: info@zvyazda.minsk.by

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку».

Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 250 разоў на год.

Тыраж 33.948 Індэкс 63850. Зак. № 4164. Нумар падпісаны ў 19.30.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12

П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12